Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

ЛіМ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ISSN 0024-4686

№ 48 (4491) 28 лістапада 2008 г.

У нумары:

«Выбух» над Цытадэллю

Навукова-практычная канферэнцыя ў Брэсце: адкрыцці і перспектывы.

Стар. 4

Добры дзень, Балгарыя! Здравей, България!

Напярэдадні XXVII Сафійскага кніжнага кірмашу — пра наша братэрства.

Стар. 7—10

Ліхтарыкі душы

Работы сапраўднага фотамастака прымушаюць затрымліваць дыханне.

Стар. 11

Ціхія гульні пасля кананады

Паэтычныя пошукі маладых — падстава для абагульненняў і высноў.

Стар. 12

Літаратары ўсміхаюцца

Штомесячная старонка гумару.

Стар. 13

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА І ПАЎГОДДЗЕ 2009 г.

Для індывідуальных падпісчыкаў:
1 месяц — 7390 руб.
Падпісны індэкс — 63856

Ведамасная падпіска:
1 месяц — 9580 руб.
Падпісны індэкс — 638562

Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў: на 1 месяц — 4950 руб. Падпісны індэкс — 63815

Льготная падпіска для ўстаноў культуры:
1 месяц — 7500 руб. Падпісны індэкс — 63880

Каб год для вас быў неблагім — падпішыцеся на «ЛіМ»!

Класіка «Харошак»

Артысты знакамітага харэаграфічнага ансамбля пад кіраўніцтвам Валянціны Гаявой з поспехам выступілі перад беларускай дыяспарай Санкт-Пецярбурга, затым наведаліся да землякоў, што жывуць у Даўгаўпілсе, а пасля канцэрта ў роднай сталіцы адразу накіраваліся ў Смаленск. І ўсё гэта — за некалькі лістападаўскіх дзён.

Сустрэча Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага ансамбля "Харошкі" з мінскай публікай атрымалася ў поўным сэнсе слова святочнай. І свята пачыналася ўжо ў фае філармоніі, дзе, арганічна дапаўняючы адна адну, разгарнулася выстаўка сцэнічнага касцюма і экспазіцыя фота. Унікальная калекцыя аўтарскіх народных строяў, кожны з якіх — твор мастацтва, дэманстравалася на строгіх чорных манекенах, падораных піцерскімі прыхільнікамі "Харошак". А на калонах філарманічнага фае размясцілася выстаўка фотаработ, прысвечаная творчасці ансамбля, — "Чарадзейнае сугучча эпох. Канцэрт ля сцен Мірскага замка". Імя аўтара гэтай арыгінальнай і прывабнай падборкі здымкаў — Ігар Кузняцоў — знаёмае чытачам "ЛіМа". Мастацтвазнаўца, тэатральны крытык, фотамайстар, ён супрацоўнічае з вядучымі СМІ краіны, у тым ліку і з нашым выданнем. Усё, што аднойчы заўважыў ён і апісаў словам рэцэнзента, адчуваецца і ў яго назіральнай, дынамічнай, яскравай фотамове, якая стварае вобраз беларускага танца і выразныя партрэты яго карыфеяў.

На здымках — шляхетныя "Харошкі" ля сцен Мірскага замка... Такімі ж высакароднымі ды гожымі паўсталі яны ў той вечар і на сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Атмасфера выступлення, якое прайшло з нязменным для гэтага калектыву аншлагам, была надзвычай урачыстая, бо прысвячалася яно адразу тром знамянальным датам: 45-годдзю самой залы, будынка філармоніі; 85-годдзю з дня нараджэння яе тагачаснага дырэктара, незабыўнага арганізатара канцэртнай справы, музыканта і педагога Анатоля Каландзёнка; 35-годдзю ансамбля "Харошкі", вядомага сёння на ўсіх кантынентах.

Унікальны тэатр танца Валянціны Гаявой прадставіў у двух аддзяленнях праграмы класіку свайго рэпертуару: харэаграфічны спектакль "Па старонках "Полацкага сшытка" і маляўнічы калейдаскоп сакавітых танцавальна-інструментальна-песенных вобразаў беларускага фальклору.

Старонкі ананімнага нотнага зборніка XVI — XVII стагоддзяў, які атрымаў у нас паэтычную назву "Полацкі сшытак", загучалі на беларускіх нацыянальных інструментах, і непаўторны каларыт цымбал, кменаў, жалеек і дудак па-свойму ўзнавіў аўтэнтычны дух еўрапейскага музычнага інструментарыя часоў рэнесансу і барока. Спакроўленыя з гэтай дзівоснай, ашчадліва аранжыраванай музыкай сцэнічныя сюжэты вызначаюцца выразнай драматургічнай ідэяй, высакароднай пластыкай, нацыянальным каларытам, жывою душой і аўтарскім почыркам. Архаічныя матывы гарманічна спалучаюцца з духам сённяшняга часу. А што ўжо казаць пра выканальніцкае майстэрства музыкантаў і танцораў, пра касцюмы!

Уражваюць і строгі мужчынскі танец у "Сакаліным паляванні"; і "Ластаўка" — кранальная прыпавесць пра дабро і зло; і неадназначная ў сваёй вобразнай поліфанічнасці замалёўка "Пілігрымы" з нібыта невідушчымі хітраватымі жабракамі, вандроўным рыцарам, манахам-валацугам ды дзеўкай-спакусніцай; і дасціпная віртуозная замалёўка "Закаханы вартавы"... А ў другім аддзяленні — россып народных найгрышаў, напеваў, рытмаў, жанравая самабытнасць, дзівосы творчай фантазіі, бляск выканальніцтва: "Кросны" ды "Весялуха", "Столінская пастараль" ды "Таўкачыкі", "Любачка" ды "Люлечка" і спрадвечная "Субота"....

І не трэба тлумачыць, чаму паўсюль гэтак захоплена ўспрымаецца класіка "Харошак", створаная драматургам і рэжысёрам танца, харэографам Валянцінай Гаявой, мастакамі па касцюмах Аляксеем Гаявым ды Юрыем Піскуном, музычным кіраўніком Марынай Марозавай, выдатнымі салістамі, — створаная на аснове спрадвечнага багацця, што засталося ў спадчыну ад нашых таленавітых продкаў.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Фота Кастуся Дробава

Чыста беларускае кіно

Студыя «Летапіс» адзначыла сваё 40-годдзе

Хочаце ўбачыць сапраўднае беларускае кіно — глядзіце фільмы студыі "Летапіс". Гэтая парада, актуальная і 30, і 20, і 10 гадоў таму, слушна гучыць і ў нашы дні. Айчынная кінадакументалістыка фіксуе, па-мастацку адлюстроўвае, асэнсоўвае рэаліі менавіта беларускага жыцця; у ёй часта гучыць беларускае слова; яна адметная асобамі сваіх стваральнікаў. Ва ўлонні "Летапісу" заўсёды нараджаліся адметныя аўтарскія стужкі, якія збіралі лаўры прэстыжных міжнародных кінафорумаў. Вось і падчас юбілейнай вечарыны, што адбылася ў сталічным мультыплексе "Беларусь", віншавалі дакументалістаў — пераможцаў нядаўніх прафесійных агледзін. Генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Уладзімір Замяталін, які выступіў з невялікай прамовай, перадаў галоўны прыз міжнароднага кінафестывалю, што нядаўна прайшоў у Расіі, рэжысёру Міхаілу Жданоўскаму — стваральніку стужкі "Ва ўсе дні". Галоўны прыз, які атрымаў на Другім фестывалі дакументальнага кіно ў Іране фільм "Вальс" Віктара Аслюка, быў уручаны аўтару сцэнарыя Вользе Дашук (гл. фота), бо рэжысёр знаходзіўся ў гэты час на здымках. А некаторыя ўзнагароды яшчэ ў дарозе: напрыклад, прыз, якім на V Міжнародным фестывалі спартыўных фільмаў у Ліпецку адзначана "Кацярына" Уладзіміра Цеслюка.

Больш як тры гадзіны працягваўся ўрачысты вечар летапісцаў. Суполку дакументалістаў, за якую і студыі "Беларусьфільм", і краіне нашай ніколі не было сорамна, віншавалі прадстаўнікі міністэрстваў, ведамстваў, грамадскіх арганізацый. Слова бралі старшыня Беларускага саюза кінематаграфістаў Юрый Цвяткоў, мастацкі кіраўнік "Летапісу" Міхаіл Жданоўскі; галоўны рэдактар дакументальнага кіно Уладзімір Мароз і першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Рыгор Сітніца ўзрушылі залу сваімі шчырымі беларускімі вершамі, а гурт "Гаротніца" пад кіраўніцтвам Андруся Такінданга выклікаў авацыі. Гучалі знаныя сярод прафесійнікаў імёны Галіны Адамовіч, Мікалая Гарулёва, Анатоля Алая, Настассі Суханавай, Станіслава Гайдука, Мікалая Князева, іншых рэжысёраў, аператараў, гукааператараў, мантажніц... Успаміналіся іх таленавітыя папярэднікі — творцы-дакументалісты з індывідуальным поглядам на свет, адлюстраванне якога ў беларускім кіно пачалося яшчэ ў 1926-м, задоўга да з'яўлення "Летапісу"... А завяршылася вечарына дакументальным кінасеансам.

Лана ІВАНОВА
Фота Кастуся Дробава

Пункцірам

У Нью-Йорку ў штаб-кватэры ААН адкрылася фотавыстаўка амерыканскага фотамайстра Джона Кунстадтэра "Беларусь: прамяні святла". У цырымоніі адкрыцця прынялі ўдзел кіраўнікі дыпламатычных місій дзяржаў — членаў ААН, прадстаўнікі кіраўніцтва сакратарыята Арганізацыі, амерыканскай грамадскасці і беларускай дыяспары.

На выстаўцы прадстаўлены работы фотамайстра, якія былі зроблены ім за апошнія гады ў ходзе шматлікіх падарожжаў па Беларусі.

Галоўны аб'ект увагі чорна-белых мастацкіх фотаробот Джона Кунстадтэра, большасць з якіх зроблена ў жанры класічнага фотапартрэта і дарожных фотазамалёвак, — простыя беларусы. Больш як тры дзесяткі разнапланавых па жанры і кампазіцыі фатаграфій аб'яднаны адзіным імкненнем — перадаць святло душы, сціпласць і пачуццё чалавечай годнасці беларускіх дзяцей, людзей сталага веку, сельскіх працаўнікоў — яны і сталі героямі фотаробот амерыканскага майстра.

Работы амерыканскага фатографа добра ведаюць і у Беларусі — экспанаваліся ў выставачных залах Мінска, Гродна і Паставаў.

***

Вядомы расійскі мастак, старшыня праўлення Саюза мастакоў Расіі і прэзідэнт Міжнароднай канфедэрацыі саюзаў мастакоў краін СНД Валянцін Сідараў узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны. Гэтай узнагароды жывапісец удастоены за вялікі асабісты ўклад у развіццё беларуска-расійскіх культурных сувязей. Цырымонія ўзнагароджання прайшла ў Дзяржаўнай Трацякоўскай галерэі, дзе адбылося ўшанаванне Валянціна Сідарава з нагоды яго 80-годдзя і дзе адкрылася персанальная выстаўка мастака, якая ўключае больш як 100 твораў. Валянцін Сідараў вядомы, перш за ўсё, як аўтар яркіх вясковых пейзажаў.

***

Асэнсаванню ролі і месца Праваслаўнай царквы ў жыцці грамадства і развіцці славянскай культуры прысвечаны V Свята-Міхайлаўскія чытанні, што прайшлі 19-21 лістапада ў Мінску. "Чытанні праходзяць у юбілейную для Праваслаўнай царквы дату — 1020-годдзя Хрышчэння Русі. Мы хочам заклікаць да асэнсавання гэтай знакавай для славянскіх народаў падзеі", — адзначыў Архіепіскап Полацкі і Глыбоцкі Феадосій.

Увагу сёлетніх чытанняў прыцягнулі праблемы духоўна-маральнага развіцця асобы і сямейнага выхавання. "Сёння для нас актуальная дэмаграфічная праблема, паколькі прапагандуецца не стваральны, а лёгкі, свабодны лад жыцця", — сказаў архіепіскап.

Свята-Міхайлаўскія чытанні арганізуе Праваслаўнае брацтва ў гонар Святога Архістратыга Міхаіла пры падтрымцы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, міністэрстваў культуры, інфармацыі і адукацыі.

***

У нямецкім горадзе Вісбадэн адбылася Першая міжнародная канферэнцыя "Роля жанчыны ў захаванні духоўных і культурных традыцый Рускага свету", у якой прынялі ўдзел больш як 100 чалавек з 31 краіны — прадстаўніцы рускіх дыяспар краін Еўропы, Азіі, Амерыкі, СНД і Балтыі.

У перыяд падрыхтоўкі да канферэнцыі сярод рускіх жанчын-паэтаў, якія жывуць за мяжой, быў арганізаваны паэтычны конкурс "Свет — твая калыска". Творы ацэньвала журы з вядучых літаратараў Расіі і Германіі. Адзіным пераможцам конкурсу стала паэтэса з Брэста Любоў Красеўская, урачыстае ўзнагароджанне якой адбылося падчас адкрыцця канферэнцыі.

Па выніках конкурсу выдадзены паэтычны зборнік "Свет — твая калыска", у які ўвайшлі лепшыя творы яго ўдзельніц і, вядома ж, вершы яго пераможцы.

Падрыхтавалі Анатоль КУДЛАСЕВІЧ, Антаніна КІТ

Песні «Чырвонага гваздзіка»

Юбілеі

Аматарскія творчыя калектывы, якія дасягаюць 35-гадовага ўзросту, напраўду заслугоўваюць звання народных. Падумалася гэтак падчас нядаўняй адметнай падзеі: мужчынскі хор прафесарска-выкладчыцкага складу Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта "Чырвоны гваздзік" адзначыў сваё 35-годдзе юбілейным канцэртам, які адбыўся ў сценах alma mater калектыву.

Многіх, напэўна, здзівіць той факт, што ў БДЭУ наладжана цікавае культурнае жыццё, і не апошнюю ролю ў ім адыгрываюць тамтэйшыя педагогі. Ужо колькі часу іх яднае не толькі клопат пра падрыхтоўку годных кадраў для айчыннай гаспадаркі, але і шчырая песня, якую праз гады нясе ансамбль "Чырвоны гваздзік". На працягу ўсяго перыяду існавання яго бяззменным кіраўніком з'яўляецца выкладчык французскай мовы прафесар Сяргей Галаўко (дарэчы, сталы падпісчык і аўтар "ЛіМа"). Сёння ў калектыве пераважаюць спевакі паважнага ўзросту і, на жаль, толькі некалькі прадстаўнікоў маладога пакалення дапаўняюць іх шэрагі. З гэтым звязаны і недахоп сучасных песень у рэпертуары энтузіястаў.

На пачатку юбілейнай імпрэзы хор выканаў творы ваеннай тэматыкі, звязаныя з перыядам свайго станаўлення, у ліку якіх — славутая "Лясная песня" ("Ой, бярозы ды сосны..."). Сольнымі выступленнямі вылучыліся ўдзельнікі калектыву прафесар Сцяпан Маскоўскі, Леанід Шыцікаў. Выступленне "Чырвонага гваздзіка" не абышлося і без франкамоўнага твора, а завяршыўся канцэрт выкананнем арыгінальнага "Марша эканамістаў" — гімна роднай ВНУ. Дзякуючы святочнай атмасферы, што панавала на вечарыне, большасць канцэртных нумароў станоўча ўразіла сваёй гарманічнасцю.

Урачыста павіншавалі калектыў з юбілеем прадстаўнікі кіраўніцтва універсітэта, раённай адміністрацыі, Міністэрства культуры Беларусі. Найбольш цікавымі былі віншаванні ад іншых творчых калектываў: харавых, фальклорных, танцавальных. Шчыра ўразіў вакальны ансамбль Беларускай дзяржаўнай філармоніі "Камерата". Майстэрскае шматгалоснае выкананне эксперыментальных кампазіцый, у якіх спалучаюцца этнічныя і джазавыя матывы, нікога не пакінула абыякавым. Запрошаныя артысты ўзмацнілі святочны настрой, а "Чырвоны гваздзік" зарадзіў усіх прысутных сваёй нязгаснай энергіяй.

Алесь СУХАДОЛАЎ

На здымку: вакальны калектыў "Чырвоны гваздзік" і яго кіраўнік Сяргей Галаўко. Фота аўтара

Быў ясны і сонечны дзень залатой восені. У Дом дружбы сабраліся сябры і прыхільнікі творчасці Леаніда Левановіча — беларускаму празаіку споўнілася семдзесят.

«Магілёўская хроніка» Леаніда Левановіча

У розныя гады і ў розных выдавецтвах выйшла чатырнаццаць ягоных кніжак, сярод якіх — шэсць раманаў, аповесці і апавяданні, кнігі нарысаў. Большасць твораў празаіка распавядае менавіта пра Магілёўшчыну, пра раку Бесядзь, пра родную вёску, пра людзей, якія жывуць на роднай зямлі.

Землякі Леаніда Кірэевіча, а менавіта гурт "Сустрэча" пад кіраўніцтвам Аляксандра Бардоўскага, пачалі імпрэзу добрай песняй. Алесь Бадак, які вёў вечарыну, узгадаў, што ў адным з інтэрв'ю юбіляр сказаў: "У жыцці ёсць толькі адзін уваход, а пакінуць яго безліч выйсцяў. Вельмі тонкая нітка чалавечага існавання, таму нельга жыць "на чарнавік", можна і не паспець на "чыстае"...". Што ж, гэта словы вельмі мудрага чалавека і сапраўднага пісьменніка, калі не своеасаблівы дэвіз яго жыцця. Сапраўды, калі вы хочаце пачуць пра дзіцячыя гады Леаніда Кірэевіча — чытайце яго кнігі, асабліва першы раман "Шчыглы". Калі хочаце больш уведаць пра душу гэтага чалавека, пра яго светапогляд, унутраны свет — чытайце любыя творы, таму што кожны яго твор — гэта часцінка яго душы.

Літаратуразнаўца, прафесар Аляксей Рагуля адзначыў, што калі Іван Мележ стварыў "Палескую хроніку", то ў адносінах да творчасці Леаніда Левановіча можна смела гаварыць пра "Магілёўскую хроніку" як феномен беларускай ментальнасці, "гаспадарскага" падыходу да ўсяго: да зямлі, да сябе, да працы, да міру...

Затым школьнікамі чыталіся ўрыўкі з твораў аўтара. Добрыя словы віншавання з юбілеем прагучалі з вуснаў галоўнага рэдактара часопіса "Маладосць" Раісы Баравіковай і паэта Сяргея Панізніка. А намеснік галоўнага рэдактара "ЛіМа" Мікола Станкевіч згадаў, што Леанід Левановіч у свой час перайшоў з рускамоўнай газеты на працу ў "ЛіМ" — і пачаў пісаць па-беларуску. Такім чынам, шлях у беларускую літаратуру слынны празаік пачаў менавіта з лімаўскай сям'і.

Леанід Кірэевіч выказаў падзяку кіраўніцтву Дома дружбы, які з'яўляецца, па яго словах, астраўком лучнасці ў нашым часе. "Рымскі імператар Марк Аўрэлій у сваёй кнізе "Самнасам з сабою" пісаў, што ад бацькі ён узяў настойлівасць, ад маці — шчодрасць і добразычлівасць. Я таксама мог бы пералічваць, што я ад каго ўзяў, але вучыцца трэба заўсёды, — сказаў юбіляр. — Сёння, напрыклад, я першы дзень быў на камп'ютэрных курсах. Ды і лепшая мая кніга яшчэ наперадзе".

Анатоль КУДЛАСЕВІЧ

На здымку: Л. Левановіч з паэтам-земляком А. Бардоўскім.

З нагоды

Збліжэнне творчых берагоў

Дыпломамі лаўрэатаў міжнароднай літаратурнай прэміі імя Рыгора Скаварады "Сад боскіх песень" (яе заснавальнік — Валынскае таварыства "Свіцязь") за 2008 год адзначаны пісьменніцы Тамара Кручэнка (горад Гомель) і Лілія Бандарэвіч-Чарненка (горад Прылукі, Чарнігаўская вобласць) — аўткі сумеснай паэтычнай кнігі "Ад берагоў Дзясны да Сожа".

Днямі ў гарадскім Доме культуры ў Прылуках адбылася адметная літаратурная вечарына "На скрыжаваннях славянскага братэрства". Па запрашэнні кіраўніцтва раёна для ўдзелу ў свяце прыбылі саветнік пасольства Рэспублікі Беларусь ва Украіне Уладзімір Аўтух, старшыня Гомельскага абласнога аддзялення грамадскага аб'яднання "Саюз пісьменнікаў Беларусі" Уладзімір Гаўрыловіч, прэзідэнт грамадскай арганізацыі "Чарнігаўскі інтэлектуальны цэнтр", пісьменнік Сяргей Дзюба, кандыдат філалагічных навук, пісьменніца Таццяна Дзюба. Гучалі цудоўныя вершы і песні на беларускай і ўкраінскай мовах, паэтычныя дыялогі Лілі Бандарэвіч-Чарненкі і Тамары Кручэнкі, якія чыталі вершы са сваёй кнігі, адказвалі на шматлікія пытанні прылучан.

Адметна тое, што абедзве паэтэсы плённа займаюцца і журналістыкай. Тамара Кручэнка працуе ў "Гомельскай праўдзе", а Лілія Бандарэвіч-Чарненка — у газеце "Прылуччына". Прачулыя словы ў адрас віноўніц урачыстасці сказалі намеснік старшыні раённай адміністрацыі Лілія Нікітчанка, начальнік упраўлення культуры Святлана Бірузова, скульптар Сямён Кантур, бібліятэкары, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі Прылук, студэнты.

Т. ВАЛОДЗІНА

Дэбаты як працяг дыялога

Форумы

Дзякуючы сумесным намаганням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнага інстытута адукацыі і Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь у сярэдзіне лістапада ў Мінску прайшоў Міжнародны форум русістаў "Сучасная моўная і літаратурная адукацыя ў СНД: дыялог паміж тэорыяй і практыкай". На пленарным пасяджэнні, пасля прывітальных слоў саветніка Пасольства Расійскай Федэрацыі ў Беларусі А. Ламакіна і намесніка міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Т. Кавалёвай, з дакладамі выступіў цэлы шэраг айчынных і замежных навукоўцаў; асаблівую цікавасць выклікалі развагі дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі А. Лукашанца, меркаванні дэкана філалагічнага факультэта І. Роўды, прафесара Г. Меркіна (Смаленск) ды іншых.

Праблемнае поле форуму аказалася надзвычай шырокім і ахоплівала разнастайныя пытанні, звязаныя з найноўшымі падыходамі, тэндэнцыямі развіцця і перспектывамі сучаснай моўнай і літаратурнай адукацыі ў школе і ВНУ, прыярытэтнымі кірункамі моўных і літаратурных даследаванняў у Беларусі, рытарычнай культурай асобы, асаблівасцямі выкладання рускай мовы як замежнай і г.д. Раз-пораз абмеркаванне гэтых і многіх іншых пытанняў набывала востра палемічны характар, таму дыскусія не абмяжоўвалася рэгламентаванымі выступленнямі з дакладамі і паведамленнямі падчас працы ў межах шасці секцый форуму. Цягам трох дзён у ягонай працы бралі ўдзел больш як 100 навукоўцаў, метадыстаў, педагогаў-практыкаў з Беларусі, Расіі і Украіны, аднак самымі дарагімі гасцямі, як зазначыла галоўны інспектар Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Р. Сідарэнка, сталі 49 школьнікаў, што з'ехаліся з усіх рэгіёнаў нашай краіны на рытарычны конкурс. У падобным выглядзе ён праводзіўся ў нашай краіне ўпершыню: на розных этапах конкурсу ўдзельнікі дэманстравалі майстэрства складання прамовы на вызначаную тэму, выяўлялі ўласную дасціпнасць і здольнасці ў туры, што меў назву "Рыторыка хуткага рэагавання". Заключным этапам конкурсу рытараў сталі "Дэбаты", якія прымусілі хваляваць, бадай, не столькі саміх вучняў, колькі прысутных у зале дарослых. Прадстаўнічае журы вызначыла ў якасці пераможцаў, што набралі максімальную колькасць балаў, Елізавету Гарохаву (Гродна), Віталя Мальцава (Мінск), Паўла Манойлава (Гродна) і Таццяну Пракурат (Брэст). Аднак нельга не адзначыць, што калі б меркаванне залы мела вагу асобнага голасу, дык у лік пераможцаў дакладна трапіў бы і Ілья Прыгодскі з Гродна — адзіны, хто выступаў з прамовамі і вёў дэбаты па-беларуску (паводле адзнак журы яму дасталася 6 месца).

Пры падвядзенні вынікаў Міжнароднага форуму русістаў яго арганізатары — як з беларускага, так і з расійскага боку — неаднаразова падкрэслівалі мэтазгоднасць штогадовага правядзення падобнага навукова-практычнага мерапрыемства, адзначалі неабходнасць далучаць да ўдзелу ў ім як мага большага кола даследчыкаў, настаўнікаў (не толькі рускай, але і беларускай мовы і літаратуры), вучняў.

І. Ш.

Навідавоку

Гарачыя сэрцы

Журналісты краіны адзначылі 50-годдзе свайго творчага саюза. Урачысты сход з гэтай нагоды адбыўся ў канферэнц-зале сталічнага Дома прэсы. У тую святочную лістападаўскую раніцу тут сустрэліся лепшыя прадстаўнікі друкаваных перыядычных выданняў і электронных СМІ з усіх рэгіёнаў Беларусі, ветэраны айчыннай журналістыкі. Павіншаваць іх з агульным прафесійным святам прыйшлі шаноўныя госці, кіраўнікі міністэрстваў, ведамстваў, грамадскіх аб'яднанняў, іншыя афіцыйныя асобы.

Пачэсную місію выканаў міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Русакевіч: ён агучыў віншаванне, накіраванае Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам калектыву грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз журналістаў". У віншаванні, у прыватнасці, гаворыцца: "За сваю паўвекавую гісторыю ваша аб'яднанне заслужыла аўтарытэт і павагу дзякуючы таму, што паслядоўна адстойвала прынцыпы духоўнасці, праўдзівасці, патрыятызму і прафесійнага майстэрства. Не сакрэт, што журналістыка можа выступаць як стваральным, так і дэструктыўным фактарам у працэсе фарміравання грамадскай думкі... Таму гэтак важна канструктыўная пазіцыя Саюза журналістаў, яго актыўная роля ў жыцці краіны". Кіраўнік дзяржавы пажадаў журналісцкаму саюзу папаўняцца "сапраўды залатымі пёрамі — таленавітымі, духоўна багатымі і высокаадукаванымі людзьмі, патрыётамі Айчыны".

Залатое пяро... Задумаўшыся над сэнсам гэтага, увогуле ўстойліва-звыклага ў журналісцкім асяроддзі, спалучэння слоў, разумееш: залатое пяро — гэта не толькі прыродны талент і набытае з гадамі ўменне па-майстэрску напісаць тэкст. Гэта яшчэ і вечна маладая душа, і неўтаймоўны творчы дух, і неспакойнае, гарачае сэрца, адкрытае насустрач жыццю, чалавечым праблемам і радасцям, усяму навакольнаму свету з яго неўміручай прыгажосцю і адвечнымі трывогамі. Гэта служэнне лепшым традыцыям і чуйнасць да перспектыўных павеваў часу... Так або інакш, многія глыбінныя вартасці вызначаюць творчасць лепшых журналістаў краіны, чые імёны ведаюць чытачы, аматары радыё, тэлегледачы і чые набыткі належным чынам ацэньваюцца ў грамадстве.

Многія і многія з такіх імён, знаных у журналістыцы, у сферы кіраўніцтва СМІ ды ў галіне прафесійнай адукацыі, гучалі на юбілейным сходзе: Марыя Карпенка, Уладзімір Вялічка, Мікалай Кернога, Васіль Шырко, Міхаіл Шыманскі, Уладзімір Андрыевіч, Зіновій Прыгодзіч, Анатоль Мяснікоў, Аляксандр Градзюшка, Павел Якубовіч, Уладзімір Наркевіч, Тамара Бунто, Мікалай Шлома, Тамара Холад, Рыгор Кісель, Юрый Казіятка... Многія майстры пяра, фотакамеры, радыё- і тэлеэфіру атрымалі з нагоды юбілею самыя розныя ўзнагароды, знакі высокага прызнання ў прафесіі.

"У нашай краіне сёння ёсць прыгожыя конкурсы, якія трансліруюцца па тэлебачанні, ёсць высокія афіцыйныя прэміі. Але для журналістаў самай высокай і самай каштоўнай была і застаецца наша галоўная прафесійная ўзнагарода — "Залатое пяро" як сведчанне прызнання калег", — падкрэсліў старшыня Беларускага саюза журналістаў, галоўны рэдактар газеты "Рэспубліка" Анатоль Лемяшонак, абвяшчаючы імёны новых лаўрэатаў Рэспубліканскага конкурсу БСЖ "Залатое пяро". Як вядома, група пераможцаў гэтага прафесійнага спаборніцтва атрымала ўзнагароды ўвесну, напярэдадні Дня друку. І вось цяпер было ўручана яшчэ шэсць дыпломаў. Прычым, "Залатым пяром" ганараваная і калектыўная работа — зборнік навуковых артыкулаў, падрыхтаваны Інстытутам журналістыкі БДУ (дырэктар Сяргей Дубовік).

Першы намеснік старшыні БСЖ Рыгор Сакалоўскі ўручыў узнагароды саюза вялікай групе калег. Першай сярод іх была названа Марыя Карпенка — асоба легендарная, спрычыненая да арганізацыі журналісцкага саюза ў Беларусі, на сённяшні дзень ужо адзіны з 23-х дэлегатаў першага з'езда Саюза журналістаў СССР, заслужаны работнік культуры БССР, доўгія гады нязменны галоўны рэдактар часопіса "Работніца і сялянка". Марыя Іосіфаўна атрымала ганаровае званне заслужанага журналіста Рэспублікі Беларусь і выступіла з прачулым словам-успамінам пра далёкія гады станаўлення саюза і свой прафесійны шлях...

Пра запатрабаванасць журналісцкага слова ва ўсіх сферах жыцця, пра сур'ёзнае стаўленне да СМІ ў самых розных міністэрствах і ведамствах сведчыла доўгая цырымонія ўручэння юбілейных узнагарод: грамат, дыпломаў, нагрудных знакаў, памятных падарункаў... Многія рупліўцы журналістыкі адзначаны міністэрствамі абароны, інфармацыі, унутраных спраў, эканомікі, адукацыі. Ганаровая грамата Міністэрства адукацыі Беларусі была ўручана і дырэктару РВУ "Літаратура і Мастацтва" Алесю Карлюкевічу.

На сходзе выступіў старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай Чаргінец, які ўручыў грамоты саюза вядомым журналістам-літаратарам Алене Брава, Ніне Рыбік, а таксама першаму намесніку міністра інфармацыі Ліліі Ананіч. Старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына асабіста ад сябе падаравала Саюзу журналістаў кранальны сувенір са сваёй малой радзімы — статуэтку бабра, сімвал удачы, поспеху і дабрабыту.

Былі ўзнагароды ад БРСМ, Добраахвотнага таварыства садзейнічання арміі і флоту. Былі музычныя падарункі ад заслужанага артыста краіны Леаніда Нікольскага, разам з якім спявалі нават ганаровыя госці ў прэзідыуме сходу.

Юбілей Беларускага саюза журналістаў стаўся нагодай для заахвочвання лепшых супрацоўнікаў СМІ, для садзейнічання аўтарытэту БСЖ, для ўмацавання карпаратыўнай еднасці, якую сілкуюць не матэрыяльныя выгоды, а пачуццё "прысутнасці ў прафесіі", спрычыненасці да важнай агульнай справы.

Лана ІВАНОВА

На здымках: журналіст-легенда Марыя Карпенка; падчас ганаравання новых лаўрэатаў прэміі "Залатое пяро".

Фота Віктара Кавалёва

Сувязі

Упершыню Дні культуры Беларусі прайшлі ў Славацкай Рэспубліцы. Прадставілі нашу краіну Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава, салісты Юлія Стэфановіч (скрыпка) і Дзяніс Шапавалаў (віяланчэль).

Выступленне беларускіх музыкантаў адбылося 22 лістапада, у зале Славацкай філармоніі. Адметнасцю канцэртнай праграмы была харэаграфічная сюіта нашага класіка XX стагоддзя Яўгена Глебава: дырыжор сам скампанаваў яе, выбраўшы яскравыя фрагменты з трох балетаў кампазітара — "Ціль Уленшпігель", "Курган" і "Маленькі прынц".

Цікавае спалучэнне падзей: акурат гэтымі днямі сталіца Славакіі наладзіла прэстыжны міжнародны фестываль "Браціслаўская музычная восень", дзе прадстаўлены Лонданскі сімфанічны аркестр, Вялікі сімфанічны аркестр імя П. Чайкоўскага (Расія), калектывы з Венскай філармоніі, з Аўстраліі, ЗША... Удзельнічалі ў фэсце і нашы музыканты пад кіраўніцтвам маэстра А. Анісімава.

Культурнаму супрацоўніцтву паміж Беларуссю ды Славакіяй спрыяе міжведамаснае пагадненне, падпісанае міністэрствамі культуры абедзвюх краін.

С. ВЕТКА

* * *

10 лістапада ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылося падпісанне дамовы з Нацыянальным музеем Рэспублікі Татарстан.

На ўрачыстае мерапрыемства прыехалі дырэктар Нацыянальнага музея Рэспублікі Татарстан Гульчычак Назіпава і дырэктар Музея-кватэры Янкі Купалы ў в. Пячышчы Рыма Абызава. Як вядома, падчас Вялікай Айчыннай вайны пісьменнік знаходзіўся ў эвакуацыі ў вёсцы Пячышчы (Татарстан), дзе жыў у дырэктара мукамольнага камбіната І. Наякшына. Сёння там дзейнічае музей-кватэра Песняра, захоўваюцца яго асабістыя рэчы. Падпісанае міжмузейнае пагадненне скіравана да ўмацавання культурных стасункаў паміж Беларуссю і Расіяй. Важную ролю міжмузейных беларуска-расійскіх зносін падкрэсліла другі сакратар пасольства краіны-суседкі ў Беларусі М. Ханнікава. Яна ж зачытала прысутным і прачулае прывітальнае слова Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Расійскай Федэрацыі ў Беларусі А. Сурыкава.

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Мацевасян распавяла прысутным пра гісторыю сяброўства паміж двума купалаўскімі музеямі. Яшчэ ў 1950-м годзе ўдава Янкі Купалы У. Луцэвіч прыязджала ў Пячышчы, шмат у чым паспрыяўшы развіццю татарстанскага музея.

Галоўны спецыяліст па народнай культуры і творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь С. Гаўрылава адзначыла важнасць сяброўства дзвюх краін у галіне культуры і больш падрабязна распавяла пра эвакуацыйны перыяд жыцця Янкі Купалы.

Мерапрыемства было аздоблена паказам слайдаў з выявамі экспазіцыі татарстанскага музея Янкі Купалы. Перад гасцямі сталіцы выступілі піяністка Мая Іргарына і вакальны асамбль Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

Аб'ява

Закрытае акцыянернае таварыства "Гандлёва-выдавецкі дом «Амфара»" (Санкт-Пецярбург) паведамляе, што ў сувязі з парушэннямі ім спадчынных правоў пры выданні рамана Уладзіміра Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" прынята рашэнне аб спыненні распаўсюджвання кнігі і аб адмове ад яе наступнага перавыдання.

Ідзе падпіска на I паўгоддзе 2009 года

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Індывідуальная (індэкс — 63856)
на 1 месяц — 7390
на 3 месяцы — 22170
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 63815)
на 1 месяц — 4950
на 6 месяцаў — 29700
Ведамасная (індэкс — 638562)
на 1 месяц — 9580
на 3 месяцы 2870
Льготная ведамасная (індэкс — 63880)
на 1 месяц — 7500
на 6 месяцаў — 45000

«МАЛАДОСЦЬ»

Індывідуальная (індэкс — 74957)
на 1 месяц — 7390
на 3 месяцы — 22170
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00592)
на 1 месяц — 5280
на 6 месяцаў — 31680
Ведамасная (індэкс — 749572)
на 1 месяц — 9930
на 3 месяцы 29790
Льготная ведамасная (індэкс — 00731)
на 1 месяц — 7900
на 6 месяцаў — 47400

«ПОЛЫМЯ»

Індывідуальная (індэкс — 74985)
на 1 месяц — 7620
на 3 месяцы — 22860
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00471)
на 1 месяц — 5280
на 6 месяцаў — 31680
Ведамасная (індэкс — 749852)
на 1 месяц — 10160
на 3 месяцы — 30480
Льготная ведамасная (індэкс — 00727)
на 1 месяц — 8300
на 6 месяцаў — 49800

«ВСЕМИРНАЯ ЛИТЕРАТУРА»

Індывідуальная (індэкс — 74863)
на 2 месяцы — 9700
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00594)
на 2 месяцы — 6380
на 6 месяцаў — 19140
Ведамасная (індэкс — 748632)
на 2 месяцы — 11250
Льготная ведамасная (індэкс — 00729)
на 2 месяцы — 8400
на 6 месяцаў — 25200

«НЁМАН»

Індывідуальная (індэкс — 74968)
на 1 месяц — 8080
на 3 месяцы — 24240
Індывідуальная льготная падпіска для настаўнікаў (індэкс — 00235)
на 1 месяц — 5720
на 6 месяцаў — 34320
Ведамасная (індэкс — 749682)
на 1 месяц — 11260
на 3 месяцы 33780
Льготная ведамасная (індэкс — 00728)
на 1 месяц — 8300
на 6 месяцаў — 49800

Сёння вельмі прэстыжна ведаць не толькі творчасць класікаў, але і сучасных беларускіх пісьменнікаў, адкрываць для сябе новыя імёны.

Проста факт

Сабраліся сябры

Адбылося першае ў гэтым навучальным годзе пасяджэнне школьных літаратурна-творчых гурткоў, што аб'ядноўваюцца ў Мінскую раённую суполку "Купалінка", якая сёлета адзначыла пятнаццацігадовы юбілей. Гасцей прымаў Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы — сапраўдная калыска беларускай літаратуры. На пачатку сустрэчы супрацоўнікі музея правялі для школьнікаў экскурсію па зале, дзе размешчана юбілейная выстава, прысвечаная 100-годдзю зборніка Янкі Купалы "Жалейка" і 95-годдзю зборніка "Шляхам жыцця".

Каля сотні маладых творцаў сабраліся разам, каб падзяліцца сваімі набыткамі, паслухаць сяброў, атрымаць ацэнку сваіх вершаў ад знакамітых паэтаў, знаўцаў паэтычнага слова. Як заўсёды, удзел у творчай гасцёўні прымалі дзіцячы паэт, кіраўнік суполкі "Купалінка" Мікола Чарняўскі, паэтка і сакратар літаб'яднання Эльвіра Ярчак і загадчык навукова-асветніцкага аддзела Людміла Давідоўская.

Настаўнік і дарадца юных паэтаў Мікола Чарняўскі адзначыў, што літаратурная суполка "Купалінка" — гэта выдатная школа, а яе выхаванцы — творчыя, таленавітыя, шчырыя.

Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ

На вышыні святла

Так называлася сустрэча, якую нядаўна правялі ў літаратурнай гасцёўні супрацоўнікі Магілёўскай цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэкі імя А. С. Пушкіна. Яна прысвячалася 60-годдзю з дня нараджэння паэтэсы Яўгеніі Янішчыц, і вяла яе Тамара Аўсяннікава, сяброўка паэтэсы. Яны пяць гадоў разам вучыліся на філалагічным факультэце БДУ ў Мінску. Жылі ў інтэрнаце ў адным пакоі.

Яўгенія Янішчыц — адна з самых таленавітых паэтэс Беларусі. Яе паэзія і сёння на вышыні, яна запатрабавана чытачамі і служыць людзям.

Віктар АРЦЕМ'ЕЎ

Берасцейская ініцыятыва



Навукова-практычная канферэнцыя "Берасцейскія кнігазборы: стан і перспектывы даследаванняў" выйшла за рамкі рэгіянальнага форуму яшчэ на этапе яго падрыхтоўкі і паказала не толькі беларусам, а і іншаму свету, якую багатую спадчыну мы маем, і як проста бывае з'яднаць памкненні людзей, апантаных прагай да ведаў. Асабліва калі справа датычыць пошуку, захавання і вяртання на Радзіму страчаных каштоўнасцей, пісьмовай спадчыны. Рэзананс, які выклікала сама ідэя склікання канферэнцыі, пераўзышоў усемагчымыя прагнозы.

Канферэнцыя ладкавалася Брэсцкай абласной бібліятэкай і ўвачавідкі паказала, як кніжная скарбніца можа стаць магутным арганізацыйна-асветніцкім цэнтрам. Узровень выступленняў яе ўдзельнікаў і заяўленыя тэмы адлюстравалі бязмежныя абшары шчодра раскінутай па свеце кніжнай спадчыны Берасцейшчыны. Менавіта бібліятэка — кніжная скарбніца паўднёва-заходняга краю, зрабіла спробу прасачыць лёсы кніжных калекцый Берасцейшчыны. Ідэю правядзення канферэнцыі, убачыўшы яе рэальны сэнс і значнасць, падтрымалі ўпраўленне культуры і кіраўніцтва Брэсцкага аблвыканкама. І адкрываў форум, на які з'ехаліся навукоўцы пяці краін, намеснік старшыні аблвыканкама Леанід Цупрык. Прысутнічаў Генеральны консул Генеральнага консульства Польшчы ў Брэсце сп. Яраслаў Ксёнжэк. А краязнаўцы ды гісторыкі, чыноўны люд з Беларусі, Літвы, Расіі, Украіны ды Польшчы вялі рэй пра нашы берасцейскія каштоўнасці, якія сталі гонарам кніжных скарбніц у розных краінах, пра тое, як дзяржавы, на тэрыторыі якіх апынуліся беларускія рарытэты, так ці інакш садзейнічалі захаванню беларускіх кніжных скарбаў .

"*Цяпер дакладна вядома,* — тлумачыць намеснік дырэктара па навуковай працы Брэсцкай абласной бібліятэкі Ала Мяснянкіна. — *у Лондане ў Беларускай бібліятэцы і музеі імя Францыска Скарыны знаходзіцца архіў Пінскага праваслаўнага духоўнага праўлення. У Кракаве і Катавіцэ даследавана гісторыя кнігазбораў знаных прадстаўнікоў шляхты, каталіцкіх мужчынскіх і жаночых манастыроў на тэрыторыі Берасцейшчыны. У Швейцарыі выдадзена манаграфія пра манастырскую бібліятэку ў Бярозе-Картузскай. Пры знішчэнні манастыра на пачатку XIX стагоддзя ў ім было знойдзена 1303 друкаваныя кнігі і больш як 100 рукапісаў. У Вільнюсе ў Дзяржаўным гістарычным архіве захаваўся каталог гэтай бібліятэкі*"...

Беларускія кнігазборы і Літуаніка

Загадчык аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі Акадэміі навук Літвы Дайва Нарбуцінене прывезла на канферэнцыю унікальныя абвесткі пра выданні Берасцейскай Радзівілаўскай друкарні — першай на тэрыторыі Беларусі. "*Пра друкарню мы ведаем да крыўднага мала, тэма амаль не даследавана,* — скрушна заўважыла Д. Нарбуцінене. — *Мала ведаем пра саму друкарню, пра тое, як яна працавала, пра майстроў, што стаялі ля станкоў. Падаецца справядлівым называць яе Радзівілаўскай, шчыльна знітаванай з імем Мікалая Радзівіла Чорнага, якая, пэўна, дала пачатак Віленскай друкарні Радзівілаў.*"

У друкарні выдадзена 39 найменняў, з гэтых кніг XVI стагоддзя ў Вільнюсе захавалася па найменнях толькі тры, а саміх экземпляраў — 8. Найперш — Брэсцкая Біблія, асобнікі якой маюцца ў многіх бібліятэках з перыяду асветніцкай дзейнасці берасцейскіх друкароў. У бібліятэцы Літоўскай — некалькі яе экземпляраў. Адзін з асобнікаў мае аснову старажытнага скуранога пераплёту. Яшчэ два выданні — гэта каментарыі, падрыхтаваныя Дзітрыхам Вайтам з выказваннямі Марціна Лютэра, і даследаванні пратэстанцкай царквы.

Дайва Нарбуцінене патлумачыла: кнігі гэтыя — уласнасць бібліятэкі з 1941 года, г. зн. з часу атрымання ў спадчыну фондаў бібліятэкі Сінода вялікіх рэфарматараў Вільнюса. Усе берасцейскія выданні знаходзіліся ў сінадальнай бібліятэцы Літвы. "*А мы маем картатэку, і рыхтуючы каталог Літуанікі (Літуаніка — гэта тое, што датычыць Літвы і Вялікага княства Літоўскага), размясцілі іх менавіта ў гэтым фондзе. Спадзяюся, вы не пакрыўдзіцеся,* — прабачаецца Дайва. — *Усё-такі гэта, была наша агульная дзяржава*".

Літоўскі даследчык Альма Бразюнене падрыхтавала да канферэнцыі паведамленне пра збор кніг у Вільнюскай бібліятэцы з ружанскай бібліятэкі гетмана Вялікага княства Літоўскага Льва Сапегі.

Акрамя берасцейскіх выданняў, у бібліятэцы АН Літвы ёсць яшчэ беларускія выданні XVIII стагоддзя. Нямала выданняў і на кірыліцы. Ёсць пінскія выданні на польскай мове. Хто іх чытае? На прэс-канферэнцыі перад краязнаўчым форумам Леанід Несцярчук зазначыў: уражвае не толькі вялікая колькасць нашых рарытэтаў за мяжой, а і незапатрабаванасць іх. Дайва Нарбуцінене ў адказ зазначыла: "*Мы выстаўляем кнігі ў экспазіцыях, да прыкладу, на выстаўцы, прысвечанай юбілею сінадальнай бібліятэкі. Бібліятэка — гэта равесніца Берасцейскай друкарні: друкарня заснавана ў 1553 годзе, а бібліятэка евангелікаў-рэфарматараў — у 1557-м. Выданні берасцейскай друкарні лагічна павінны былі патрапіць у сінадальную бібліятэку...*".

Скарбы Піцера

На так званыя рухомыя помнікі культуры, да якіх належаць і кнігі, у адрозненне ад помнікаў нерухомых (палацаў, храмаў, іншых архітэктурных пабудоў), Беларусь не надта багатая. "*Таму вядзецца размова пра перамяшчэнне тых нашых скарбаў, якія ёсць у іншых краінах, з тым, каб увесці іх у паўнавартасны зварот*", — логіку пленарных выступленняў падкрэсліў кнігазнаўца, даследчык гісторыі Вялікага княства Літоўскага Мікалай Нікалаеў — загадчык аддзела рэдкай кнігі Расійскай нацыянальнай бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу. Ён — адзін з актыўнейшых ініцыятараў Берасцейскай канферэнцыі. У фондзе Расійскай (Піцерскай) нацыяналкі — кнігазбор Сапегаў з мястэчка Кодзень (цяпер тэрыторыя Польшчы, Люблінскае ваяводства). Там жа, у піцерскіх фондах захоўваецца кніжны збор К**а**раля Нямцэвіча, пляменніка знанага берасцейца, ад'ютанта і сябра Тадэвуша Касцюшкі Юльяна Урсын Нямцэвіча.

На так званыя рухомыя помнікі культуры, да якіх належаць і кнігі, у адрозненне ад помнікаў нерухомых (палацаў, храмаў, іншых архітэктурных пабудоў), Беларусь не надта багатая. "Таму вядзецца размова пра перамяшчэнне тых нашых скарбаў, якія ёсць у іншых краінах, з тым, каб увесці іх у паўнавартасны зварот", — логіку пленарных выступленняў падкрэсліў кнігазнаўца, даследчык гісторыі Вялікага княства Літоўскага Мікалай Нікалаеў — загадчык аддзела рэдкай кнігі Расійскай нацыянальнай бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына ў Санкт-Пецярбургу.

"*Але не трэба забывацца, што жывём мы ў XXI стагоддзі, і варта занатоўваць тое, што пішуць пра берасцейскі рэгіён сёння. Менавіта пішуць, а не змяшчаюць у модным цяпер для карыстальнікаў Інтэрнеце — там усяго толькі 20 працэнтаў ад сусветна назапашаных ведаў. Астатнія 80 працэнтаў трэба шукаць у бібліятэках*", — рэзюміруе М. Нікалаеў і нагадвае, што не лішне было б правесці і рэканструкцыю бібліятэкі Кірылы Тураўскага.

Упершыню берасцейцамі вялася гаворка пра беларускую кнігу ў фондах Украіны. Пра яе распавяла Ірына Рымаровіч — супрацоўнік аддзела старадрукаў Нацыянальнай бібліятэкі Украіны, а таксама калегі з Луцка і Роўна.

Надзіва: упершыню была зроблена спроба вызначыць, што і дзе з брэсцкіх кніг засталося ў самой Беларусі, што дагэтуль было загадкай. Таму паведамленне дырэктара Нацыянальнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Алы Галубовіч слухалася на адным дыханні. У гасцях у берасцейцаў былі таксама вядучы палеограф Нацыянальнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Беларусі Людміла Іванова, дырэктар Нацыянальнай кніжнай палаты Алена Іванова, загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Гродзенскай абласной бібліятэкі Любоў Турмасава ды многія іншыя.

Маладосць і сталасць

Усе кніжныя выданні, зразумела, перажываюць натуральны працэс фізічнага старэння. Таму загадчык навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Галіна Кірэева акрэсліла пытанні, звязаныя з пераходам на электронныя носьбіты. У краіне цяпер дзейнічае праграма "Памяць Беларусі", якая сталася арганічнаю часткаю праграмы "Памяць свету". І з пачатку новага тысячагоддзя беларусамі распрацоўваюцца меры па захаванні помнікаў кніжнай культуры. Яшчэ адзін праект, які паспрыяе захаванню спадчыны, — "Скарбы славянскай культуры". У рамках яго будуць стварацца электронныя копіі рэдкіх кніг. Часткова гэта дапаможа ў вырашэнні складанай на сённяшні дзень праблемы вяртання вывезеных з Беларусі старажытных друкаваных помнікаў. З дапамогаю электронных копій карыстальнік цяпер ужо можа атрымаць — хаця б першапачатковую — інфармацыю пра выданне.

На канферэнцыі былі госці з Польшчы — Станіслаў Сес-Кшышкоўскі, прафесар, старшы спецыяліст Цэнтра даследаванняў Польскай бібліяграфіі Эстрэйхераў Ягелонскага універсітэта, і Вацлаў Валецкі, прафесар Ягелонскага універсітэта. Дарэчы, амаль усе прамоўцы гаварылі на сваёй роднай мове: палякі — па-польску, украінцы — па-ўкраінску, беларусы — па-беларуску. Усе ўсіх разумелі!

«Выбух» над Цытадэллю

Пяціхвіліннае выступленне мясцовага краязнаўцы, прафесара БрДУ Анатоля Гладышчука стала сапраўдным інфармацыйным шокам, які "выбухнуў" над Брэсцкай крэпасцю. Рыхтуючыся да канферэнцыі, ён адшукаў карты горада розных гадоў і стагоддзяў, прывёў іх да аднаго маштабу, сумясціў, накладаючы адна на адну, і шляхам вывучэння пісьмовых крыніц зрабіў высновy, што брэсцкая друкарня знаходзілася... якраз на тэрыторыі сучаснай крэпасці-героя! Адразу ўзнікла наступная ідэя — на гэтым месцы ўстанавіць па першым часе мемарыяльную дошку...

Пастскрыптум

Рыгор БЫСЮК, начальнік упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі: "*Калі бібліятэкары падалі ідэю канферэнцыі нам, я зацікавіўся. Як чалавек і як чыноўнік. Вырашылі, што форум такі трэба праводзіць. Нас падтрымала кіраўніцтва аблвыканкама. Гэта вельмі істотна, бо найчасцей на першым плане бываюць пытанні эканамічныя, ды тут сярод іншых вялікіх праблем заўважылі і гэту. Падтрымалі нас, знайшлі сродкі*".

— Як будзеце ставіцца да новага адкрыцця Анатоля Гладышчука?

— *Я ведаю, што і прафесар Інстытута гісторыі НАН Беларусі Пётр Лысенка, як і Анатоль Гладышчук, таксама супастаўляў розныя планы крэпасці, нават прыцягнуў здымкі з космасу, і зрабіў высновy, што недзе тут, побач з казармамі, месцілася яшчэ і гарадская ратуша. Ён таксама прапанаваў да 1000-годдзя Бярэсця адрэстаўраваць і аднавіць ратушу. Задумацца над гэтым можна. Відаць, ёсць тэма для наступных дыскусій...*

Ірына ТУЛУПАВА
Брэст — Мінск

На здымках: на пленарным пасяджэнні; экземпляр Брэсцкай Біблії; імправізаваная кніжная выстава; у музеі Камянецкай вежы.

Тут – найлепшы адпачынак

Апошнім часам у Беларусі імкліва развіваецца турыстычная галіна. Ад стварэння спецыялізаваных часопісаў да льготнага крэдытавання суб'ектаў аграгурызму "Белаграпрамбанкам". А "Беларусбанк" выступіў з ініцыятывай бясплатна паставіць у кожнай сельскай сядзібе тэрмінал аддаленага доступу, каб замежнікі ці беларусы маглі разлічвацца па банкаўскіх картках.

— У лістападзе 2002 года было створана грамадскае аб'яднанне "Агра- і экатурызм", — распавядае Валерыя Кліцунова, старшыня праўлення БГА "Адпачынак на вёсцы". — І гэтая дата лічыцца днём нараджэння сельскага турызму Беларусі. Бо да гэтага часу ніхто ў нас нават такое словазлучэнне не выкарыстоўваў. Безумоўна, сельскі турызм у розных яго праявах быў і да гэтага. Тут можна паглыбіцца да часоў Радзівілаў ці Наркевіча-Ёдкі. У 2003 годзе мы стварылі нацыянальную арганізацыю "Адпачынак на вёсцы". І сёння яна аб'ядноўвае 130 сядзіб і каля 500 чалавек. У асноўным гэта жыхары сельскай мясцовасці: фермеры, настаўнікі... Гэта людзі, адданыя роднай зямлі, і якія лічаць, што ў беларускай вёсцы ёсць што паказаць турыстам.

— Валерыя Анатольеўна, калі вы пачыналі займацца аграгурызмам, што было самым складаным?

— Да 2002 года не мелася і прадмета размовы — не было саміх сядзіб. Існавалі адзінкавыя прыклады, раскіданыя па ўсёй краіне. Таму трэба было праводзіць працу па іх аб'яднанні і стварэнні новых. Але акрамя гэтага мы сутыкнуліся з шэрагам іншых праблем — цалкам адсутнічала нарматыўна-прававая база. Гэты від турызму, альбо прадпрымальніцкай дзейнасці, не падыходзіў ні пад адзін з дзеючых прававых кодэксаў. Таму адна з задач, якія мы ставілі перад сабой на самым пачатку — садзейнічанне развіццю адпаведнага нацыянальнага заканадаўства. І за гэтыя шэсць гадоў з'явіліся ўказы Прэзідэнта і дапаўненні да іх, якія тычацца аграгурызму. Атрымалі льготы не толькі сельскія жыхары, якія займаюцца аграгурызмам, але і жыхары гарадскіх пасёлкаў і невялікіх гарадоў. У нас з'явіліся унікальныя на прасторы СНД заканадаўчыя дакументы, якія цалкам абараняюць правы суб'ектаў аграгурызму.

Яшчэ адна вялікая праблема: у сельскіх жыхароў няма патрэбнага стартавага капіталу. Таму неабходная праграма фінансавай падтрымкі. Дарэчы, у мінулым годзе "Белаграпрамбанк" выступіў з праграмай ільготнага крэдытавання суб'ектаў аграгурызму.

— Чым адметныя беларускія сядзібы, якія паслугі там аказваюцца?

— У нас ёсць чатыры катэгорыі сядзіб у залежнасці ад узроўню камфорту. Адны спецыялізуюцца на сямейным адпачынку з дзецьмі. Іншыя — на актыўным адпачынку — да прыкладу, водныя, веласіпедныя маршруты. Некаторыя спецыялізуюцца на правядзенні ўрачыстасцей. У іншых месцах акцэнт робіцца на кулінарыі — там могуць правесці і майстар-класы для жадаючых. Акрамя гэтага ёсць фермеры, якія гатовы пазнаёміць з сельскай гаспадаркай. У сядзібах прапаноўваюць збор грыбоў і ягад, майстар-класы па рамёслах.

Нядаўна нашу краіну наведваў генеральны сакратар Сусветнай турыстычнай арганізацыі Францэска Франджыалі. Ён адзначыў, што абавязкова трэба думаць пра комплексны характар адпачынку. Маецца на ўвазе не толькі "bed&breakfast", але і комплекс іншых паслуг. Таксама ён параіў не развіваць сельскі турызм усюды. Патрэбны зоны спецыялізацыі.

— Напачатку аграгурызм быў скіраваны на замежных турыстаў?

— Не. Ён заўсёды быў скіраваны ў першую чаргу на сваіх турыстаў. 80 працэнтаў ад колькасці "спажыўцоў" гэтага віду турызму складаюць беларусы. Але апошнім часам у нашу краіну актыўна паехалі расіяне. Едуць да нас і палякі, літоўцы, латышы, немцы... Але часцей адбываецца так, што яны прыязджаюць у Беларусь па пэўных справах. А каб неяк пазнаёміць замежных гасцей з нашай культурай, іх прывозяць у сельскія сядзібы. Мэтанакіравана адпачыць на беларускай прыродзе едуць адзінкі. Што стрымлівае замежнікаў? У Беларусі мала хто на вёсцы валодае замежнымі мовамі. Таксама вакол сядзіб адсутнічае развітая інфраструктура.

— Сядзібы ў большасці ўтрымліваюцца асобнымі сем'ямі. Наколькі рэальна мець "домік на вёсцы" без дапамогі турыстычных фірм?

— Дзе высокі сервіс у сядзібах — там поўна турыстаў. Гэта дае адказ на вашае пытанне. Цяпер і турфірмы могуць непасрэдна працаваць з сядзібамі. Якая асаблівасць працы з турагенцтвамі? Яны "рухаюць" толькі добрыя сядзібы. Але такіх у нас можа толькі 10 працэнтаў ад агульнай колькасці. І турфірмы рызыкаваць не будуць з іншымі сядзібамі, у працы якіх не ўпэўнены. А задача нашай арганізацыі — садзейнічаць развіццю і якасці паслуг. У Еўропе сельскія сядзібы на 50—60 працэнтаў самі сябе забяспечваюць кліентамі шляхам самарэкламы праз Інтэрнет, 25—30 працэнтаў прыпадае на турагенцтвы, а астатняе — гэта пастаянныя кліенты.

— А вы самі адпачываеце ў беларускіх сядзібах?

— Некалькі разоў, можна сказаць, адпачывала. Зразумела, што па сваіх службовых абавязках амаль ва ўсіх сядзібах пабывала. Калі еду ў сядзібу — значыцца еду з нейкай мэтай: вязу vip-персон, журналістаў ці патэнцыйных інвестараў. А заадно і адпачываю там з гасцямі.

— Ці шмат у Беларусі знаходзіцца людзей, якія гатовы інвесціраваць сродкі ў аграгурызм?

— Са з'яўленнем праграм крэдытавання некаторыя самі пачалі развівацца. Ёсць у нас вялікі праект па стварэнні фермерскай гаспадаркі, якая будзе весціся выключна па старабеларускіх традыцыях. І гэта патрабуе вялікіх выдаткаў. Вось на такія праекты трэба шукаць інвестараў. З інвестарамі праблема, можа, вырашылася б адразу, калі б замежнікам можна было ў нашай краіне набываць зямлю...

— "Адпачынку на вёсцы" належаць чатыры інтэрнет-сайты, якія займаюцца асвятленнем тэмы аграгурызму. Ці не надышоў час стварыць спецыялізаваны часопіс?

— Гэта — мая мара! Я даўно шукаю шляхі, як гэта можна рэалізаваць. Бо адразу зрабіць такі часопіс прыбытковым не атрымаецца. Нейкі час спатрэбіцца на яго "раскрутку". А значыць, патрэбны спонсар. Штогадова мы выдаём буклет "Сельский туризм в Беларуси". А часопіс варта было б выпускаць штоквартальна.

Павел РАДЫНА
Фота аўтара

Апякун некранутай прыроды

Летам свет пабачыў першы нумар часопіса "Дикая природа". Сама назва гаворыць пра скіраванасць новага выдання. Наша размова — з рэдактарам "Дикой природы" Сяргеем ПЛЫТКЕВІЧАМ.

— Чаму вырашылі стварыць часопіс аб прыродзе?

— Падобнага нашаму часопіса ў Беларусі не існуе...

— А дакладней?

— Назва "Дикая природа" — гэта наша асноватворнае, тое, на чым будзе трымацца часопіс. Мы гаворым пра тое, што ў Беларусі захаваліся па-сапраўднаму "дзікія" месцы. І ўжо ў № 1 заявілі аб стварэнні фотаальбома з такімі мясцінамі. А пакуль у кожным нумары будзем знаёміць чытачоў з імі. Мы пачалі з вусця ракі Лань. І цяжка паспрачацца, што гэта адно з унікальных месцаў некранутай прыроды не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе. Таму што такая канцэнтрацыя птушак на невялікім участку зямлі сустракаецца вельмі рэдка. Ёсць і іншыя прынцыповыя адрозненні нашага часопіса ад ужо існуючых. Па-першае, мы робім маляўнічы, ілюстраваны часопіс. Калі будзем друкаваць матэрыял, да прыкладу, пра балота Ельня альбо заказнік Казьяны, то і ілюстрацыі будуць прадстаўлены арыгінальныя. У тым ліку здымкі з верталёта, параплана ці паветранага шара. Таксама будуць кадры тых рэдкіх птушак і звяроў, што іх насяляюць.

Па-другое, прафесіяналізм публікацый. Ёсць журналістыка і прафесійная журналістыка. На працягу 15 гадоў мы выдаём газету "Туризм и отдых". Калі ты паглыбляешся ў адну тэму, то бачыш хібы іншых журналістаў, якія пішуць пра ўсё. У нас шмат людзей, якія жадаюць, каб дзікая прырода захоўвалася. Да прыкладу, "Ахова птушак Бацькаўшчыны" — гэта арганізацыя, якая абараняе птушак і дзікую прыроду. А з другога боку, нашымі партнёрамі з'яўляюцца арганізацыі, якія займаюцца паляваннем, але на першае месца ў сваёй дзейнасці ставяць таксама захаванне дзікай прыроды. Такім чынам мы падаём два погляды на адну і тую ж праблему. І ў кожным нумары будзем уздымаць пэўную праблему, абмяркоўваць якую будуць прафесіяналы.

— Вы сказалі пра высокі ўзровень фотаматэрыялаў...

— Вакол часопіса ўжо аб'ядналіся людзі, для якіх фотапаляванне з'яўляецца сэнсам жыцця. Калі ў нас будзе мядзведзь, то сфатаграфаваны абавязкова ў дзікай прыродзе, а не ў звярынцы, ці яго чучала. Безумоўна, пры анімалістычным фота воўк, да прыкладу, можа быць прыручаны, але гэты воўк не сядзіць у вальеры. Мы гаворым не пра паляўнічых і паляванне, не пра рыбакоў і рыбалоўства, а пра прыроду, якая цікавіць усіх.

— Патлумачце, калі ласка, чытачам розніцу паміж "фотапаляваннем" і "фотаанімалістыкай".

— Фотапаляванне — гэта здымкі звяроў у натуральных умовах. Для фотапаляўнічага галоўнае здабыць здымак. А для фотааніматыста галоўнае — не проста сфатаграфаваць, а стварыць вобраз.

— А што ў нашай краіне больш распаўсюджана?

— Зразумела, што ніводны звер, ніводная птушка не жадаюць фатаграфавацца. Гэта аксіёма. І каб зрабіць такое фота, патрэбны добры фотаапарат з доўгафокусным аб'ектывам. Трэба валодаць нейкімі навыкамі: ведаць месца пасялення пэўных відаў, іх звычкі, як да іх падабрацца, альбо дзе размясціцца ў "засадзе". З аднаго боку — тэхніка, з другога — прафесіяналізм паляўнічага.

Што тычыцца колькасці. З радасцю можна канстатаваць, што з кожным годам і фотапаляўнічых, і фотаанімалістаў становіцца больш. З'явілася новая тэхніка. І каштуе яна параўнальна танна. Гэта ўжо не занятак абраных. Калі раней трэба было працаваць у рэдакцыі, каб атрымаць імпартную камеру і мець магчымасць здымаць, дык сёння тэарэтычна амаль кожны можа дазволіць сабе гэткі занятак. Да прыкладу, адзін з членаў фотаклуба Віктар Казлоўскі прадаў трактар і купіў фотаапарат...

— Каб пісаць прафесійныя матэрыялы, трэба, відаць, мець не толькі журналісцкую адукацыю?

— У журналіста ёсць пэўны ўзровень прафесіяналізму. Каб нам паглыбіцца ў тэму турызму пры стварэнні газеты "Туризм и отдых", спатрэбілася тры-чатыры гады. Акрамя факультэта журналістыкі БДУ я скончыў лясны тэхнікум у Полацку. А яшчэ працяглы час займаюся фотапаляваннем, турызмам. Хоць № 1 часопіса — гэта наш дэбют, але мы не пачаткоўцы, апошнія два-тры гады рыхтаваліся да гэтага. І ў нас працуюць прафесіяналы ў кожным кірунку. Калі мы не разбіраемся ў рыбалцы, то знайшлі людзей, якія гэтую тэму прафесійна асвятляюць. Я сам добра ведаю фотапаляванне, таму магу гарантаваць, што дадзены кірунак будзе прадстаўлены годна.

— Яшчэ да выхаду часопіса ў свет вы правялі першы чэмпіянат Беларусі па фотапаляванні.

— Так, ён прайшоў сёлета ў маі. Атрымалася даволі цікавае мерапрыемства. Зімой рыхтуемся правесці адкрыты чэмпіянат па зімовым фотапаляванні. Мы гэта ўсё робім у рэчышчы той працы, якую праводзіць выдавецтва "Рыфтур". Выдаём фотаальбомы, краязнаўчую літаратуру пра Беларусь — прадстаўляем нашу краіну. І дзікая прырода — адна з казырных карт у гэтым кірунку. Таму на зімовы чэмпіянат плануем запрасіць і фотапаляўнічых з замежжа. Часопіс "Дикая природа" мы не разглядаем толькі як камерцыйны праект.

— Дзікая прырода — гэта месцы, да якіх цяжка дабрацца. Ці рэальна туды арганізоўваць турыстычныя маршруты?

— Рэальна. Сёння існуе ўжо некалькі турыстычных кампаній, якія спецыялізуюцца на экалагічна-забаўляльным турызме. І экалагічны турызм будзе развівацца ўсё больш імкліва. Але павінна быць і нейкая мяжа. Да прыкладу, у вусці ракі Лань пражывае вялікая калонія чапляў. І калі туды пусціць шмат турыстаў, то гэта толькі нашкодзіць птушкам. Таму турыстычныя прадпрыемствы на тэрыторыі заказнікаў павінны працаваць сумесна з адміністрацыяй гэтых заказнікаў.

— Як часта плануеце выпускаць часопіс?

— Пакуль раз на два месяцы. А далей паглядзім на рэнтабельнасць. Калі часопіс будзе запатрабаваны, то пяройдзем на штомесячны выхад. Першая рэакцыя на часопіс — станоўчая на ўсіх узроўнях: ад шараговых чытачоў да міністэрстваў і ведамстваў.

— А не збіраецеся рабіць англамоўную версію часопіса і распаўсюджваць яе за межамі Беларусі, каб тым самым зацікавіць замежных турыстаў?

— Мы выдаём літаратуру пра Беларусь. У нас ёсць асобны праект "Запрашаем у Беларусь". Для нас не складзе вялікай цяжкасці, калі будзе сабраны адпаведны матэрыял, выдаць асобны альбом пра "дзікія" месцы нашай краіны. Проста выдаваць часопіс на англійскай мове няма сэнсу, як я мяркую. Давядзецца звужаць тэму, але мэтанакіравана — напрыклад, стварыць выданне для замежных паляўнічых. Да таго ж, трэба каб замежнік не проста прыехаў на паляванне, а пазнаёміўся ў гэтым выданні і з культурай нашай краіны.

Гутарыў Сяргей МАКАРЭВІЧ

На здымку: Сяргей Плыткевіч.

«Маладыя гады, маладыя жаданні...»

Нікога, відаць, з аматараў паэтычнага слова асабліва не здзівіла тое, што восьмы нумар часопіса "Полымя" за гэты год адкрываецца падборкай вершаў Віктара Гардзея з назвай "Божай ласкай ураджаю быць!..", з удакладненнем "Вершы розных гадоў". Што ж, калі аўтар мае за плячыма "шэсць спакаваных зім", то, пэўна, у яго за гады творчасці назбіралася нямала вершаваных радкоў, якія ён па нейкіх прычынах не мог апублікаваць раней. І вось ён, як кажуць, зазірнуў у свае сховы, перагарнуў старонкі з вершанымі радкамі, па-новаму пабачыў іх і вырашыў, што з імі варта пазнаёміць і чытачоў.

Так было з вершамі Віктара Гардзея ці не так, цяжка сказаць. І тым ні менш, калі хтонебудзь з паэтаў друкуе вершы розных гадоў, то пад імі можна сустрэць каля дзесятка розных дат. Паэтычная нізка В. Гардзея ўражвае тым, што пераважная большасць твораў паэта была напісана ў далёкія шасцідзясятыя гады мінулага стагоддзя. Зрабіўшы звычайныя арыфметычныя падлікі, заўважаеш, што паэт знаёміць нас з радкамі, якія ён стварыў, калі яму было 15 —17 гадоў. Дзе яны праляжалі гэтулькі часу, для нас загадка. Зрэшты, у падборцы маецца твор пад назвай "Згубленыя вершы". У ім пра тое, як суседка знайшла на пашы лісткі з вершамі паэта і "чытала ўголас нярэдка", дзе, вядома, было сказана і пра яе: "Вось бы песняй харошаю стаць, што і цяжка, і вельмі спакусна. Як пачнеш тую песню спяваць, дык адчую агонь тваіх вуснаў." Чым скончыліся адносіны паміж будучым паэтам і дзяўчынай-суседкай, у вершы не сказана. А вось лёс добрага дзесятка вершаў В. Гардзея, відаць, быў нечым падобны да лёсу таго сшытка, што знайшла суседка.

Знаёмячыся з вершамі Віктара Гардзея паўвекавой даўніны і тымі, што напісаны зусім нядаўна, мы маем магчымасць падзівіцца са свежасці і крынічнай чысціні яшчэ незамутнёнай ніякімі хімікатамі і дамешкамі нашага жыцця і побыту душы падлетка-школьніка, з яго яшчэ наіўнага дзіцячага ўспрымання навакольнага свету, падзей і з'яў, сярод якіх ён жыў.

Паэт піша, як думае, не клапоцячыся пра вобразы. Яны прыходзяць самі сабой: "Полем кукурузу, кормячы салетрай. Праца не ў абузу — свежае паветра." Графічна выразна паўстае перад намі малюнак са школьнікамі, якія рвуць пустазелле: "Я ў адным паклоне з нашым класам восьмым". І зноў непрыкрытая праўда таго часу: "Пыл палёг на гоні — гэта зноў калгасы табунамі коні гоняць на кілбасы."

Выдатна напісаны і верш "Па сена", у якім таксама — і даверлівы і шчыры тон, натуральнае гучанне аповеда, які вядзецца ад імя юнака. Нават не верыцца, што верш паэт напісаў у васемнаццаць гадоў. А між тым у ім няма нічога складанага і незвычайнага. Апрача таго, што гаворка вядзецца з гумарам і, здаецца, яе вядзе вопытны і прызнаны вясковы байдун, які нямала чаго пабачыў і зведаў на сваім вяку. "З вёскі прасёлкам, а потым лясамі след праціраюць па зімніку сані. Гурбы — з разгону, амаль ці не штурмам, дзед — як паўпанак, а я ў яго — фурман... Едзем па сена — цяжкая работа. Чмелішча — дзіўная назва ў балота". Карціну паездкі па сена на аддаленыя пожні В. Гардзей малюе сціслымі і трапным штрыхамі і мазкамі. Для шматколернай разнастайнасці ўжываецца простая мова: "Во наша сена! Крыху шчэ пасунька! Гнеды спацелы — накрыць трэба гунькай." У вершы нямала цікавых і трапна падгледжаных падрабязнасцей, якімі аўтару ўдаецца больш поўна і шматфарбна перадаць малюнак звычайнага клопату і занятку вясковых людзей, які перарастае проста-такі ў эпічную панараму, а героі робяцца ледзь не Гуліверамі, не губляючы пры гэтым душэўнай цеплыні і шчырасці.

Што да мовы вершаў, то яна па-народнаму каларытная, з дамешкам мясцовых дыялектных словаў, якія не выглядаюць выпадковымі ці лішнімі, а наадварот, робяць вершы больш жывымі, маляўнічымі і вабнымі.

Як ужо было сказана вышэй, у падборцы змешчана і некалькі адносна новых вершаў. Вядома, створаны яны сталай рукой майстра, карціны таксама пададзены ярка і кідка, як гэта можа рабіць сапраўдны паэт: "Прыроду на зыходзе лета подла як хто вядзе да прорвы ракавой: у гэту ноч Люцыпарава кодла ля апраметнай ладзіць шабаш свой". У адной страфе з верша "Рабінавая ноч" сказана амаль пра тое самае, што і ў вершы "Імшэчак". Але, не ў крыўду трэба зазначыць для В. Гардзея, у радках паўвекавой даўнасці "тое самае" абмалявана, здаецца, больш выпукла і маляўніча, сказана пра яго больш эмацыянальна і прачула. У іх самацветамі зззяюць дыялектныя словы "нестач", "едзьма", "чарнагалоў", прыносячы чытачам эстэтычную асалоду. У прыведзенай страфе з верша, створанага сёлета, паэт выкарыстоўвае кніжныя словы і словазлучэнні "шабаш", "прорвы ракавой", "Люцыпарава кодла", якія, вядома, не зніжаюць вартасць верша, але і не ўпрыгожваюць яго фактуру. Зрэшты, каструбавата і няўклюдна гучаць першыя два радкі "Прыроду на зыходзе лета подла як хто вядзе да прорвы ракавой", што не характэрна для паэзіі В. Гардзея. Ствараецца ўражанне, што тут закралася друкарская "ачапятка". Астатнія строфы верша напісаны з высокім паэтычным майстэрствам.

Як бы там ні было, чытачы бязмежна рады, што Віктару Гардзею пашчасціла адшукаць згубленыя даўнішнія вершы, якія з'яўляюцца яшчэ адным яркім штрышком у таленавітай творчасці паэта і дазваляюць больш выразна адлюстраваць яго творчую постаць і асобу.

Васіль МАКАРЭВІЧ

ВІНШУЕМ

З **80**-годдзем **Арашонкаву** Ганну Уладзіміраўну, беларускага мовазнаўца.

З **80**-годдзем **Арлову** Галіну Аляксандраўну, беларускую актрысу.

З **75**-годдзем **Ляшук** Веру Якаўлеўну, беларускага літаратуразнаўца.

З **75**-годдзем **Соцікава** Яўгена Анатольевіча, беларускага празаіка, нарысіста.

З **70**-годдзем **Сачанку** Івана Іванавіча, беларускага гісторыка, публіцыста.

З **70**-годдзем **Цітова** Віктара Сцяфанавіча, беларускага этнографа, гісторыка.

З **50**-годдзем **Вераб'ёва** Паўла Віктаравіча, беларускага паэта.

З **50**-годдзем **Пранчака** Леаніда Іванавіча, беларускага пісьменніка.

Юбілейны каляндар

220 гадоў **Буйніцкаму** Казіміру Андрэеевічу, беларускаму пісьменніку, публіцысту.

185 гадоў **Шпілеўскаму** Паўлу Міхайлавічу, беларускаму і рускаму этнографу, навукоўцу, літаратару.

150 гадоў **Стукалічу** Уладзіміру Казіміравічу, беларускаму гісторыку, літаратуразнаўцу.

125 гадоў **Ластоўскаму** Вацлаву Юсцінавічу, беларускаму грамадска-палітычнаму дзеячу, навукоўцу, пісьменніку.

125 гадоў **Лёсіку** Язэпу Юр'евічу, беларускаму грамадска-палітычнаму дзеячу, мовазнаўцу.

115 гадоў **Езавітаву** Канстанціну Барысавічу, беларускаму паэту і грамадска-палітычнаму дзеячу.

115 гадоў **Чарняўскай** (Гарэцкай) Леаніле Усцінаўне, беларускай пісьменніцы.

105 гадоў **Бэндэ** Лукашу Апанасавічу, беларускаму крытыку, літаратуразнаўцу.

105 гадоў **Пестраку** Піліпу Сямёнавічу, беларускаму пісьменніку.

100 гадоў **Засіму** Міколу (Мікалаю Арцёмавічу), беларускаму паэту, крытыку.

100 гадоў **Пфляўмбаўм** Яўгеніі Эдгардаўне, беларускай паэтэсе.

95 гадоў **Гарбуку** Вісарыёну Сцяпанавічу, беларускаму празаіку.

90 гадоў **Шахаўцу** Уладзіміру Міхайлавічу, беларускаму пісьменніку.

85-гадоў **Дракахрусту** Аляксандру Абрамавічу, беларускаму паэту, перакладчыку.

80-гадоў **Ляпёшкіну** Уладзіміру Ігнатавічу, беларускаму паэту.

75 гадоў **Адамчыку** Вячаславу Уладзіміравічу, беларускаму пісьменніку.

60 гадоў **Янішчыц** Яўгеніі Іосіфаўне, беларускай паэтэсе.

Філолагам на зайздрасць

У верасні гэтага года ў сталічным Палацы мастацтва адбылася прэзентацыя рамана Валерыя Казакова "Цень гобліна". У прэзентацыі бралі ўдзел вядомыя беларускія пісьменнікі.

Поўны трыумф аўтара. Хвалілі раман выключна ўсе, не хапала толькі палкавых музыкаў з гучным барабанам. Нарэшце, маўляў, прыйшоў у беларускую літаратуру адметны творца, "наш хлопец" з вёскі Гарбоўшчына, што на Магілёўшчыне. Атабарыўшыся ў Расіі, бліскуча вывучыў і "апісацеліў" норавы расійскай кіруючай хеўры, якая "папхала дабрабыт" рускага народа "па сваіх кішэнях"...

Аднак першыя прачытаныя старонкі рамана В. Казакова "Цень гобліна" выклікалі (і не толькі ў мяне) горкае расчараванне.

Спадары алілуйшчыкі, сорамна нахвальваць аўтара прымітыўнага рамана, выдадзенага дужа кепскай, ганебнай, здзеклівай беларускай мовай.

Пра што раман В. Казакова? "Наш хлопец" "абаяльна" апавядае пра Расію-матуху, здратаваную царом-п'янчылай, абрабаваную гоблінам і яго алігархічнай хеўрай. Горка плача аўтар. Адна п'яная пасядзелка ў глухой Белавежы "абярнулася крахам вялізнай дзяржавы". Асірацела Расія без дружбаноў-братоў беларусаў, украінцаў, туркменаў з узбекамі, латышоў з эстонцамі. У камандзе "праціўніка" — "камітэце стабільнасці" — ашываецца "наш хлопец" Малюта Скураш. А калі ж "адкрываецца" фортка ад панылага службоўства, кідаецца на любошчы з каляжанкай Інгай Мрозь. Стыль, арфаграфію і "пявучасць мовы" "бліскучага" апавядальніка пра норавы расійскай алігархіі падаю з арыгінала, літара да літары, коска да коскі:

"Страшных памераў ложак захоўваў астаткі іхняга цяпла, падушкі і коўдры разляцеліся ў розныя бакі як пасля выбуху і застыглі ў сваёй асуджанай непатрэбнасці, у паветры плавалі, зліўшыся разам, іхнія пахі. Галасы, якія пераклікаліся ад знямогі, чуліся з суседняга пакоя і стыльна абстаўленая спальня з рэўнасцю да іх прыслухоўвалася".

Ау, Мапасан! Прачніся і павіншуй Казакова.

"Пытанне гэтае вісела ў паветры і бестурботна ківала ножкамі", "Галава была забіта думкамі, як вядро смеццем"... Такіх "красівасцей" у В. Казакова на кожнай старонцы — вочы разбягаюцца.

Мяне ахапіў жах, калі я агортаў-такі чытанку, дацягнуўшы да 300-й старонкі. Такой літаратурнай мярцвячыны, прымітыўнай філасофіі, здзекаў з мовы я яшчэ не сустракаў.

А вось "літаратурна-аздоблены" партрэт галоўнага раскрадальніка Расіі — Гобліна:

"Таўставатыя, пачуццёвыя вусны і невялікія, глыбокапасаджаныя, з характэрным нацыянальным выкочваннем (!) вочы, што зіхацелі ліхаманкавым бляскам апантанага чалавека".

А гэты пасаж — філолагам на зайздрасць:

*"...О, якія салодкія нядоўгія кляванні носам у лёгкім марыве чуткага сну, якія незвычайныя і дзёрзкія для казённых інтэр'ераў і строгіх кіруючых партрэтаў (во стыль! — **аўт.**) інтымныя гукі вантробнага сапення маладзенькай каляжанкі, а чаго каштуюць палахлівыя, прыглушаныя акалічнасцямі (!) стогны ўсё ўмелай і адданай сакратаркі".*

Што ж хацеў сказаць аўтар у сваім рамане беларускамоўнаму чытачу? Расіяй ніколі не кіравалі рускія? А толькі гобліны і "кумпанія"? Расія па віне сакратара абкама з прапітымі мазгамі апынулася на каленях? Прыйшоў да ўлады чалавек з органаў, палкоўнік Пужын, падняў Расію з каленяў і паставіў у "баявы стаяк"?

В. Казакоў прымітыўна, са страшэннымі стылёвымі агрэхамі, шматлікімі граматычнымі памылкамі, непісьменна распавёў нам пра тое, што даўно добра вядома. Ці варта было марнаваць сродкі на выданне гэтага рамана пра расійскіх алігархаў на беларускай мове?

Вячаслаў ДУБІНКА

«Творы» ў сусветным павуцінні

Сусветнае павуцінне Інтэрнет дазваляе сабраць у адным месцы шмат інфармацыі, а неабмежаванасць інфармацыйнай прасторы дае магчымасць вялікай колькасці людзей пазнаёміцца з ёй, пракаменціраваць, дапоўніць, выказаць свае думкі і погляды. З'явілася ў Інтэрнэце месца і для твораў мастацтва г. Баранавічы.

Зусім нядаўна намаганнямі сяброў грамадскай арганізацыі "Творчае згуртаванне "Святліца" быў створаны сайт з ключавым словам і назвай "Творы". Гэта спроба аб'яднаць звесткі пра творцаў, іх дзейнасць і зрабіць іх творчасць вядомай шырокаму колу людзей, а таксама спрасціць пошук інфармацыі пра літаратараў, мастакоў і музыкаў горада.

Сайт уключае ў сябе некалькі раздзелаў: ***беларуская літаратура***, дзе можна пазнаёміцца з творчымі біяграфіямі паэтаў і пісьменнікаў, прачытаць іх вершы, апавяданні, нарысы. Іван Лагвіновіч, Аляксей Белы, Анатоль Трафімчык, Ян Збажына, Алена Белая, Ілона Сцяцко — вось далёка не поўны спіс літаратараў, прадстаўленых на сайце. Многія з іх ужо маюць свае зборнікі, а некаторых чытач ведае па публікацыях у перыядычным друку.

Ёсць раздзелы ***выяўленчае мастацтва; дэкаратыўна-прыкладное мастацтва; фотамастацтва; беларуская песенная творчасць; класічная музыка.***

Арыентаваны сайт не толькі на вопытных майстроў, але і на тых, хто толькі пачынае свой шлях у мастацтве. Для іх працуюць раздзелы: ***Сшытак юнага літаратара; галерэя юнага мастака; аматарская фотавыстава; тэорыя вершаскладання.*** Паэты-пачаткоўцы могуць пазнаёміцца з парадамі Алеся Бакача, паэта, рэдактара і ўкладальніка многіх зборнікаў паэзіі, старшыні грамадскага аб'яднання "Творчае згуртаванне "Святліца".

Марына ВЕСЯЛУХА

Добры дзень, Балгарыя! Здравей, България!

3 – 7 снежня 2008 года – XXVII Сафійскі міжнародны кніжны кірмаш

Дзяржава духу

Рэспубліка Балгарыя – славянская краіна ў Паўднёва-Усходняй Еўропе – мае надзвычай багатую гісторыю і магутны нацыянальны дэвіз: "У адзінстве сіла". Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Балгарыя ў Рэспубліцы Беларусь, доктар філасофскіх і паліталагічных навук прафесар Петка ГАНЧАЎ – сённяшні госць штотыднёвіка "ЛіМ".

— Спадар пасол, падставай для нашай сустрэчы паслужыла яркая падзея ў жыцці Балгарыі — XXVII Сафійскі міжнародны кніжны кірмаш, у якім бяруць удзел і беларускія кнігавыдаўцы. Якое значэнне надаецца падобным форумам у вашай краіне?

— Як вам вядома, Балгарыя першая прыняла пісьменства Кірылы і Мяфодзія, якія разам з вучнямі распачалі залаты век балгарскай культуры ў IX, X стагоддзях. Наша краіна заўсёды вылучалася тым, што ў яе была багатая духоўная культура. Нават у часы асмана-турэцкага рабства, якое доўжылася пяць стагоддзяў, Балгарыя захавалася толькі таму, што ў яе быў вельмі высокі духоўны патэнцыял. Калі пазней даследавалі ролю Балгарыі ў станаўленні славянскай цывілізацыі, вядомы рускі савецкі даследчык Дзмітрый Ліхачоў заўважыў: Балгарыю выратавала тое, што яна заставалася дзяржавай духу.

— Як вы, доктар філасофскіх навук, вызначаеце гэта паняцце — дзяржава духу?

— Скажу, што на нашай Зямлі ёсць цывілізацыі, у якіх на першым плане матэрыяльныя каштоўнасці. А Балгарыя змагла развіць сваю духоўнасць. Яна ўнаследавала тую спадчыну, якую пакінулі два этнасы: старажытныя славяне і старажытныя балгары. І ўтварылася тое адзінства, якое несла з сабою духоўнасць славян і талент балгар, якія да ўсяго мелі волю да захавання дзяржаўнасці — ва ўсе часы. І змаглі ўстаяць, нягледзячы ні на што. У першы год маёй прысутнасці ў Беларусі як пасла падчас Дзён культуры Балгарыі мы паказвалі ў Белдзяржуніверсітэце фільм "Час насілля" — паводле кнігі вялікага сучаснага пісьменніка Антона Дончава "Час памежны". Студэнты і выкладчыкі дзівіліся: як мы маглі выстаяць у гэтых жорсткіх выпрабаваннях, якім падвяргаліся 500 год...

— Паводле сацыялагічнага апытання, праведзенага ў Еўрасаюзе, менавіта Балгарыя прызнана краінай з найбольш устойлівымі традыцыямі. У захаванні іх найбольш праявілася роля дзяржаўных структур альбо культуру зберагалі асобы, якія не давалі на яе забыцца?

— Я таму і згадаў перыяд асмана-турэцкага ярма, што тады не было дзяржавы, не існавала пласту арыстакратыі — яна была знішчаная, не было так званай палітычнай эліты. Былі звычайныя людзі, якія жылі ў вёсках, маленькіх населеных пунктах, гарадках. І яны інтуітыўна вярталіся да тых асноў, якія былі створаны іхнімі прашчурамі. Можа, вы звярнулі ўвагу на так званыя *мартэнічкі*, якія ў сакавіку ў Балгарыі прымацоўваюць на лацканы пінжакоў, альбо "прашываюць" край пінжакоў белымі і чырвонымі ніткамі. Аказваецца, гэтая традыцыя існавала некалькі стагоддзяў да новага часу! А гэтыя колеры, чырвоны і белы — сімвал жыцця і здароўя.

— Яны блізкія і нам, беларусам. Ведаю, што вы напісалі артыкул "Ідэнтычнасць з Беларуссю", дзе падкрэсліваеце, што і "беларуская духоўная культура багатая на выразныя сродкі і формы". Але што трэба рабіць, каб духоўнасць пашыралася — будаваць храмы, культавыя пабудовы, развіваць кніжную справу, сферу камунікацыі?

— Вядома, трэба больш духоўных кніг. Мне падаецца, трэба больш увагі звярнуць на той фундамент, які ёсць у падмурку беларускай культуры. Каб народ адчуваў, што ён таксама нешта зрабіў у гісторыі і культуры нароўні з іншымі еўрапейскімі славянскімі народамі. Паўтара года таму я падняў ідэю стварэння агульнаславянскай энцыклапедыі, звярнуўся ў акадэміі навук усіх славянскіх краін. У Беларусі прынялі ідэю з захапленнем. Падтрымалі Балгарыя, Расія, Украіна, усе балканскія краіны. На жаль, заходнія нашы браты-славяне, чэхі і палякі, пасля разваг мусілі адмовіцца, спаслаўшыся на адсутнасць грошай. Галоўная ідэя праекта — паказаць усяму свету, якую духоўнасць маюць нашы славянскія народы.

У эпоху глабалізацыі, у якую мы зараз жывём, і ствараецца прымітыўная глабальная культура, якая прадуцыруецца ў глабальных інфармацыйных каналах: па тэлебачанні і ў Інтэрнеце. А народы, якія павінны захаваць сваю ідэнтычнасць, пастаўленыя ва ўмовы жудаснага прэсінгу. Але ў тым і ёсць роля супрацоўніцтва, зносінаў — каб даць магчымасць народам выстаяць у гэтай глабальнай прасторы супраць усялякіх выпрабаванняў і выклікаў.

— У свой час у Балгарыі дзейнічала моцная перакладчыцкая школа, у вас быў створаны Саюз перакладчыкаў, мо адзіны з усіх славянскіх краін...

— Ён захаваўся і дзейнічае. Згадайма: Найдан Вылчаў — адзін з бліскучых перакладчыкаў з беларускай мовы на балгарскую. Ён пераклаў шмат беларускіх пісьменнікаў. Паказваў мне свае паэтычныя сшыткі — яго ў Беларусі ведаюць і помняць.

— Мікалай Пецеў, старшыня Саюза пісьменнікаў Балгарыі, які пабываў у нашай краіне і пабачыў, як жыве Беларусь, быў уражаны і здзіўлены, як мала ведаюць у Балгарыі пра нашу дзяржаву. Вельмі шкада, што так здарылася.

— Ведаеце, нават калі я тут толькі пачынаў сваю дзейнасць, нашыя ўзаемаадносіны былі на досыць нізкім узроўні. І ў эканамічных кірунках, і ў культурных, і ў навуковых. Неабходна было знаходзіць магчымасці супрацоўніцтва.

І вось толькі на працягу апошніх гадоў працэс устанаўлення добрасуседскіх адносінаў пачаў разгортвацца. Сёлета Беларусь наведалі дзве дэлегацыі на ўзроўні намеснікаў міністраў замежных спраў, эканомікі. Адбыліся абмеркаванні нашых дыпламатычных адносінаў. Летась мы падпісалі фундаментальную дамову аб правах грамадзян і юрыдычных асоб, на якой грунтуецца ўся асноўная база законаў і нарматыўных актаў. Шмат ёсць падпісаных пагадненняў, і шмат яшчэ падрыхтавана. Адбылося таксама пасяджэнне міжурадавай камісіі, у Беларусь прыязджала каля трыццаці балгарскіх бізнесменаў.

Неабходна ўзнавіць прамую авіялінію Мінск — Сафія, каб людзі маглі больш спакойна, не праз Прагу, Вену, Маскву, наведваць адно аднога. Пакуль нашы ўсе прыватныя кампаніі ўстрымліваюцца. Гавораць, пакуль мала балгар едзе ў Беларусь. Я адказваю: патрэба фарміруецца, калі ёсць магчымасці. Калі патрэба ёсць, але няма магчымасці, яна згасае!

Нашы эканомікі, культуры — не канкурэнты, яны ўзаемадапаўняльныя. Я ўсцешаны, што наладжана супрацоўніцтва з Белдзяржуніверсітэтам, педуніверсітэтам імя М.Танка, што маецца супрацоўніцтва з універсітэтам імя Сахарава. Нядаўна пачаліся кантакты нашых музычных акадэмій. Падпісана дамова аб супрацоўніцтве паміж акадэміямі навук. Віцебскі універсітэт імя П.Машэрава супрацоўнічае з адным з нашых універсітэтаў.

У гэтым сэнсе і прысутнасць беларускай кнігі на кніжным кірмашы ў Сафіі — гэта важны элемент азнаямлення балгар з сучаснай беларускай духоўнай культурай. Як і ў наступным годзе, спадзяюся, Балгарыя будзе прысутнічаць на Мінскім міжнародным кніжным кірмашы. Я паспрыяю гэтаму.

Гутарыла
Ірына ТУЛУПАВА



На мове культуры

Дзякуючы намаганням Беларускага Пасольства ў Балгарыі, на працягу апошняга дзесяцігоддзя назіраюцца значныя дасягненні ў развіцці культурных стасункаў паміж дзвюма славянскімі краінамі.

У 1998 годзе ў Беларусі быў выдадзены спецыяльны нумар часопіса "Полымя", які пазнаёміў беларускіх чытачоў з творчасцю 20 балгарскіх паэтаў і празаікаў. А ў канцы 2000 года з ініцыятывы Пасольства пабачыў свет зборнік перакладаў Найдана Вылчава "Мой беларускі сшытак". Дарэчы, за вялікі ўнёсак у развіццё культурнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі балгарскія паэты Стэфан Паптонеў (1998 год) і Найдан Вылчаў (2000 год) былі ўзнагароджаныя медалямі Францыска Скарыны.

У маі 2002 года адбыліся Дні культуры Беларусі ў Балгарыі, галоўнай падзеяй якіх стаў спектакль "Лебядзінае возера" Нацыянальнага акадэмічнага тэатра балета Беларусі. У межах Дзён культуры было наладжана таксама абмеркаванне перакладаў беларускай літаратуры на балгарскую мову. Акрамя гэтага, на базе Расійскага культурна-інфармацыйнага цэнтра ў Балгарыі прайшоў тыдзень беларускага кіно.

У 2005-м да 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне быў выдадзены пераклад на балгарскую мову аповесці Івана Шамякіна "Гандлярка і паэт". У красавіку гэтага ж года Пасольства прэзентавала кнігу "Боль", прымеркаваную да 19-й гадавіны Чарнобыльскай трагедыі, а ў верасні ў Федэрацыі дружбы з народамі Расіі і СНД была прадстаўлена "Анталогія беларускай прозы", у якую ўвайшлі перакладзеныя на балгарскую мову творы беларускіх пісьменнікаў.

Мастацкія калектывы Беларусі прымаюць актыўны ўдзел у фестывалях, якія праводзяцца ў гарадах Балгарыі, дэманструючы сваё высокае майстэрства замежнаму гледачу. Варта прыгадаць, што амаль кожны год беларускія творчыя калектывы ўдзельнічаюць у Міжнародным фальклорным фестывалі ў гарадах Бургас і Варна. А прадстаўнікі творчай эліты Балгарыі штогод прымаюць удзел у Міжнародным фестывалі мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску". Да таго ж, вядомыя балгарскія спевакі з'яўляюцца членамі фестывальнага журы.

У Балгарыі праходзіла прэзентацыя кінастужкі вядомага беларускага рэжысёра Міхаіла Пташука "У жніўні 44-га". Фільм атрымаў высокую адзнаку на Міжнародным кінафестывалі "Кінаманія 2001" ў Сафіі. Прэзентацыі фільма з поспехам прайшлі ў буйных гарадах Балгарыі — Плевене, Плоўдзіве, Варне.

Прадстаўнікі Балгарскага нацыянальнага цэнтра фільмаў рэгулярна ўдзельнічаюць у Мінскім міжнародным кінафестывалі "Лістапад" і дзіцячым кінафестывалі "Лістападзік".

Падрыхтавала
Жанна Капуста

Кніжная краіна Беларусь

Сафійскі кніжны кірмаш, які разгортваецца ў сталіцы Балгарыі, мае дзве галоўныя асаблівасці: ён адбываецца два разы на год – перад Калядамі і Вялікаднем, і раз на два гады атрымлівае статус міжнароднага. Гэтым падкрэсліваецца высокая духоўная місія кнігі і яе стваральнікаў. Форум прадстаўляе ўвазе наведвальнікаў кніжныя навінкі з усяго свету і лепшае з надрукаванага ў сваёй краіне.

Паводле статыстыкі міжнароднага кірмашу 2005 года, у ім прынялі ўдзел больш як 120 выдавецтваў з усёй Балгарыі і з-за мяжы. Мінулы кірмаш праходзіў у Нацыянальным Палацы культуры — буйнейшым кангрэс-цэнтры ў Паўднёва-Усходняй Еўропе.

Асаблівы статус беларускаму ўдзелу ў Сафійскім міжнародным кніжным кірмашы надае тое, што гэта — першая спроба айчынных вытворцаў выйсці ў межах прадстаўнічага форуму да балгарскага чытача. Беларусь упершыню прымае ўдзел у Сафійскім міжнародным кніжным кірмашы асобным нацыянальным стэндам. Пра гэта паведаміла "ЛіМу" начальнік упраўлення выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю Міністэрства інфармацыі Беларусі Алена ПАЎЛАВА.

Наша экспазіцыя разгорнецца на выставачнай плошчы 15 кв. м. Такая тэрыторыя маленькай кніжнай краіны Беларусі ў Рэспубліцы Балгарыя. У ёй будуць "прапісаныя" найперш нашы лепшыя выданні — кнігі-пераможцы Нацыянальнага конкурсу "Мастацтва кнігі-2008" і беларускія кнігі-фаварыты падобнага конкурсу, які праводзіцца ў межах СНД. Гэта найперш мастацкая літаратура, вучэбная, энцыклапедычная, альбомы пра Беларусь — больш як 100 розных найменняў. Балгарскаму чытачу будуць прадстаўленыя лепшыя падручнікі 2008 года — "Буквар" А. Клышкі і "Букварь" настаўніцы Н. Сторажавай, навуковыя выданні В. Бялявінай, Л. Ракавай "Мужчынскі касцюм на Беларусі" і "Жаночы касцюм на Беларусі", "Сялянская энцыклапедыя ў творах М. Тарасюка", выдадзеная ў РВУ "Літаратура і Мастацтва", і іншыя выданні. Акрамя кніг будзе прадстаўлена яшчэ картаграфічная прадукцыя і перыёдыка, газеты ды часопісы. Усё гэта павінна прадэманстраваць нашы паліграфічныя, кнігавыдавецкія, творчыя магчымасці.

Па дамове з дырэктарам Сафійскага кніжнага кірмашу Уладзіславам Сімяонавым, нашай дэлегацыі прадастаўляецца для стэндаў 7,5 кв. м бясплатна, гэткую ж плошчу на парытэтнай аснове прадаставіць балгарам дырэкцыя Міжнароднага мінскага кірмашу, які адбудзецца ў лютым наступнага года ў Нацыянальным выставачным цэнтры "БелЭкспа".

У складзе беларускай дэлегацыі — прадстаўнікі ўсіх галін, спрычыненых да выхаду кнігі ў свет: выдаўцы, паліграфісты, прадстаўнікі кнігагандлю і "Белсаюздруку". Згадаем, што за 9 месяцаў гэтага года ў Беларусі выдадзена 10 602 найменні кніг агульным накладам 43, 6 млн. экз.

Ганаровым госцем Сафійскага кніжнага форуму сёлета будзе Расія.

Ярына РЫТАМІНСКАЯ

Атанас ДАЛЧАЎ (12.06.1904 – 17.01.1978), класік балгарскай літаратуры, традыцыйна лічыцца праціўнікам сімвалізму. Ён пісаў: "Сімвалічная паэзія не мела перад сабой ні рэчаіснасці, якую б яна адлюстроўвала, ні выхаваўчай ці якой-небудзь іншай задачы. Яна не хацела быць "прыслужніцай" ні тэалогіі, ні маралі, ні філасофіі, ні гісторыі. І таму, вольная ад усялякіх клопатаў і працы, магла, як багатыя дамы, займацца толькі ўласнай знешнасцю і туалетамі". У 1923 годзе паэт удзельнічае ў калектыўным маніфестацыйным зборніку "Мост" (яго першая публікацыя), які абвяшчае новую эстэтыку – эстэтыку прадметнай паэзіі. Новая паэзія ўключае і некаторыя ўласцівыя сімвалізму матывы: праблемы смерці, чалавечай самоты, суадносін паміж духоўным і матэрыяльным. Але ў новай паэзіі няма таемна-містычнага стаўлення да гэтых праблем. Атанас Далчаў аўтар нешматлікіх, але важных для балгарскай літаратуры паэтычных зборнікаў "Прозорец" ("Акно", 1926 г.), "Стихотворения" ("Вершы", 1928 г.), "Париж" ("Парыж", 1930 г.), "Ангелът на Шартър" ("Анёл Шартра", 1943 г.). Пасля гэтых зборнікаў, у камуністычныя часы, паэт захоўвае творчае маўчанне і займаецца толькі перакладамі. Нарэшце, у 1974 годзе, выходзіць апошняя яго кніга "Стихотворения. Фрагменти" ("Вершы. Фрагменты"). Атанас Далчаў узнагароджаны Гердэравай прэміяй Венскага універсітэта. Яго творы перакладзены на 15 замежных моў.

Прапануем чытачам "ЛіМа" найбольш любімыя балгарскай чытацкай аўдыторыяй і крытыкай вершы Атанаса Далчава ў перакладах Васіля Сахарчука (1953—2003), якія неўзабаве маюць выйсці асобнай кніжкай у РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Марына АБРАГІМОВІЧ

Шлях

Шлях зімовы, удалеч без спеху
мкнеш бязмежжам пустэльных далін.
Верным знакам — сляды каляін,
што нядаўна калёсы праехалі.

Гэтай лютай завейнай зімою
хто праехаў? Навошта? Куды?
Хто злавесныя кінуў сляды
сярод белых палёў за сабою?

Пад выццё і пад плач навакольля
пад бяздоннаю цемрай нябёс
след застаўся ад горных калёс,
тут журботна рыпелі іх колы.

Коні-здыхлі цягнулі паволі
воз з пажоўклым, як воск, мерцвяком,
горным колам, бы чорным вянком,
крумкаталі вароны над полем.

Дрэвы, быццам пасля пахавання,
па зімовым шляху ідзяцё
і жалобу сваю несяцё
па галінах, вятрыскам зламаных.

1925

Лёс

І ты быў хлапчуком жоўтавалосым,
і кучараў такіх не меў ніхто;
разбуйшыся, падоўгу ўголас, босы,
ты размаўляў з дзіцячым паліто.

Сачыў за віляхвосткамі ў палёце
і папяровых ластавак пускаў,
праз аскалепак, седзячы на плоце,
ты на людзей чырвоных пазіраў.

Куды знік час, калі ты рос памалу,
мацнеў, дужэў падлеткавай душой,
што з ветрыкам гарэзлівым гуляла
і дрэвам, і траве была сястрой?

Гады ідуць, іначай час не можа,
у адзіноту з ім ужо замкнуўся ты.
Сябры старыя глянулі варожа,
і свет паволі робіцца пусты.

1927

Камень

Дрэвы, людзі старацца з гадамі;
дні знікаюць у імгле начной;
ты ж нязменным застаешся, камень,
час не мае ўлады над табой.

У цябе няма ні жыл, ні нерваў,
плоці нашай ты не меў спакон.
Ні сумненне, ні злаба, ні чэрві
не трывожаць твой халодны сон.

Да сканчэння веку не спазнаеш
смагі, што прыносіць столькі бед:
не грашыш ніколі, не раджаеш,
сам, нікім не роджаны на свет.

Ты — святы. Ці не таму калісьці,
у тумане вогненных вякоў,
людзі ў камень у людскім абліччы
сталі ўвасабляць сваіх багоў?

Камень, я з іскрынкі залатое
ісціну здабыў праз тоўшч імху:
толькі мёртвае навек святое,
а жывому нельга без граху.

1927

Конь

Дзіця было яшчэ зусім малое,
ды гэты міг чакала з трапятаннем,
выглядваючы з верхняга акна.
А бацька насцеж расчыніў вароты,
і ў двор двухпавярховага будынка
ўварвалася галопам пара коней.
Насіліся яны з паднятымі хвастамі,
галовы ўзняўшы, доўга звонка ржалі,
пакуль іх не пагналі да хлява.
Панесліся нястрымна, бы віхура,
панеслася да іх душа дзіцяці.
Яно ў абдымках ласкавай матулі,
гатовае вось-вось упасці долу,
трымцела, быццам ліст,
і, цягнучы далонь,
упершыню сказала слова: конь.

Губляе чалавек свае ілюзіі
з гадамі — кожны —
рана альбо позна.
Дзіця свае згубіла вельмі рана.
Калі яму пайшоў чацвёрты годзік,
у горадзе на прагулянцы з бацькам
хлапчук сустрэўся з мараю.
Бы колісь, яна, як цуд,
прывабнаю была.
Каня вёў за аброць ліхі наезнік —
заўважыўшы захопленасць малога,
нагнуўся, хлапчука падняў пад пахі
і пасадзіў яго ў рыпучае сядло.
О, як было на ім сядзець высока!
Бы на гары. І як было трывожна:
пад ім штось варушылася бясконца
і хвалявала; а як конь нагнуўся,
каб скубануць зялёнае травы
пад гонкаю сасною ля сцяжынкі,
малы па ім спалоханым паглядам
слізнуў па схіле мускулістай шыі,
над бездонню навіс.
Заплакаў з перапуду.
І скінуў конь яго.
Але не долу ўпала,
а ў татавы абдымкі хлапчаня.

І больш не ўспамінала пра каня.

1965

Пераклад з балгарскай мовы
Васіля САХАРЧУКА

Кнігі

К. Гылыбаву

Штодня схіляюся над кнігай,
над ёю не сплю начэй;
самотны, свету не спасціг я
і не спазнаў людзей.

Садзяцца птушкі, адлятаюць,
канец, пачатак дня:
старонкі-дні свае гартаю,
стамлёны ля акна.

Я пра жыццё чытаў чужое,
халодны да свайго,
яно ж мінула стараною,
бы й не было яго.

Каханне, кліч твой нада мною
не чуў я ў светлы міг,
свет і жыццё сваё зямное
я страціў дзеля кніг.

1926

Малітва

Не згадаў я, думаючы думу,
што так хутка век мой прабяжыць,
дык не дапусці, мой Божа, глуму,
каб сканаў я, не пачаўшы жыць.

Адвядзі складанасць-неспадзеўку,
навучы мяне зноў прастаце,
каб ад сэрца я аддаць схацеў
жабраку апошнюю капейку.

Каб адчуў я свой шчаслівы лёс,
бы дзіця цнатлівае, якое
першыя сняжынкі ціха ловіць
вуснамі гарачымі з нябёс.

Каб з людзьмі звычайнымі, як дзеці,
размаўляць без сораму я мог...
навучы мяне, вялікі Бог,
бы ўсе людзі, жыць на белым свеце.

1927

Водгалас беларускага слова

Апошнім часам вельмі актыўна развіваюцца беларуска-балгарскія культурныя сувязі, аднак галоўны акцэнт па-ранейшаму робіцца на супрацоўніцтве ў літаратурнай сферы. Пачынаючы з 1995 года Пасольствам Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Балгарыя за кошт спонсарскіх сродкаў быў выдадзены шэраг кніг беларускіх аўтараў у перакладзе на балгарскую мову.

Гэта кнігі В. Быкава, А. Разанава, Я. Янішчыц, паэма Міколы Гусоўскага "Песня пра зубра", двухмоўная анталогія беларускай паэзіі ад XII стагоддзя да нашых дзён і іншыя. У канцы 2000 года з ініцыятывы Пасольства быў выдадзены зборнік перакладаў Н. Вылчава "Беларуската моя тетрадка", у якую ўвайшлі пераклады твораў 60 беларускіх паэтаў. У 2002 годзе пабачыла свет прымеркаваная да 120-годдзя з дня нараджэння беларускіх класікаў кніга выбраных вершаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, а таксама Максіма Багдановіча на балгарскай мове "Могъщият триптих".

У 2004 года выйшла анталогія маладой беларускай літаратуры "Среща с пролетта", а ў 2005 г. — да 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне — быў ажыццёўлены спецыяльны выпуск часопіса "Европа 2001", прысвечаны Беларусі.

Нас звязвае даўняя дружба з балгарскім народам. У маладым журналісцкім узросце мне давялося сустрэць вясковага дзеда — былога расійскага салдата, які прымаў удзел у паходзе, вайне па вызваленні балгарскай зямлі ад шматвекавога турэцка-асманскага прыгнёту.

Ад сэрца да сэрца

А калі канкрэтна, афіцыйна — Магілёў і Габрава сталі пабрацімамі з 1966 года: тады было ў нас створана абласное аддзяленне Таварыства савецка-балгарскай дружбы, а ў Габраве — акруговы камітэт руху балгара-савецкай дружбы. Да нас сталі часцей наведвацца балгарскія госці, а магіляўчане, адпаведна, да іх. З працоўных калектываў — дзеля абмену вопытам — навукоўцы, пісьменнікі, мастакі... З магілёўскіх пісьменнікаў першым там пабываў Пётр Шасцерыкоў, а затым Аляксей Пысін.

У верасні 1980 года, па запрашэнні габраўскіх калег, пашчасціла наведацца ў Габрава і мне з Аркадзем Кандрусевічам.

Але вось мы ступілі на балгарскую зямлю і неяк неўпрыкметку адчулі сябе лёгка, вольна, сярод блізкіх і родных нам людзей — ну зусім як дома!

Вячэралі ў габраўскім рэстаране "Магілёў". Тут ветлівая афіцыянтка прапаноўвала свае нацыянальныя стравы і нашы беларускія. І размаўлялі з балгарскімі сябрамі папросту, без перакладчыка: нашы ж славянскія мовы такія блізкія.

Назаўтра нас запрасілі ў школу, якая носіць імя Тані Карпінскай — магілёўскай школьніцы-падпольшчыцы, закатаванай фашыстамі. Дзеці паказвалі афармлены імі альбом пра юную гераіню, прасілі яшчэ і яшчэ расказаць пра яе.

Разам з габраўскім літаратарам-гумарыстам Пятром Проданавым мы наведалі Дом сатыры і гумару, прасторныя залы ўсіх чатырох паверхаў якога запоўнены самымі разнастайнымі экспанатамі і, што асабліва нас уразіла і парадавала, сярод іх — экспанаты фотамайстроў Магілёва.

Нас запрашалі ў працоўныя калектывы, у сем'і, знаёмілі са сваім жыццём, працай. І не толькі ў цэнтры акругі — Габраве, але і ў іншых гарадах, сёлах — Сеўліве, Траўні, Драгамірцы... Пабылі і на Шыпцы, дзе нашы суайчыннікі разам з балгарамі стаялі насмерць супраць туркаў-заваёўнікаў...

Я прывёз з таго падарожжа не толькі хвалюючыя ўражанні, але і рукапісы габраўцаў-журналістаў, працаўнікоў розных сфер. Дапоўніўшы іх рукапісамі магіляўчан, зрабілі цікавую, ілюстраваную кнігу "От сердца к сердцу". Кніга расказвае пра дружбу магіляўчан і габраўцаў, пра іх працоўныя справы, планы.

Само сабой, на гасціннасць габраўцаў мы адказвалі тым жа. Сустракалі Стэфана Паптонева, Тані Пашаву, Георгія Пепчава, Колю Добравову, Петра Проданава, Эміля Розена, Кольо Атанасава ды іншых габраўскіх літаратараў, журналістаў. Частавалі іх у рэстаране "Габрава", гулялі з імі па праспекце Георгія Дзімітрава, па вуліцы Габраўскай, запрашалі на чытацкія канферэнцыі па творах габраўскіх пісьменнікаў. Прыемна, што наш зямляк, магіляўчанін паэт Ігар Шклярэўскі за заслугі ў развіцці дружбы нашай і балгарскай літаратур быў удастоены залатога медаля Ніколы Вапцарава.

Іван АНОШКІН

г. Магілёў

Аб'яднаныя літаратурай

Беларуска-балгарскія літаратурныя сувязі маюць даўнюю гісторыю. Аднак найбольш актыўна яны развіваліся ў XX стагоддзі. Калі ў першай палове гэта былі рэдкія пераклады, кароткія заметкі ў друку і згадкі ў энцыклапедыях, то пачынаючы з 1960-х гадоў сувязі паміж беларускімі і балгарскімі пісьменнікамі сталі трывалымі і сістэматычнымі, прычым асноўная ўвага была нададзена перакладам. Беларуская зямля не раз прымала гасцей з Балгарыі, выпраўляліся на сустрэчы з балгарскай творчай інтэлігенцыяй і нашы пісьменнікі. Некалькі разоў ладзіліся Дні беларускай культуры ў Балгарыі і Дні балгарскай культуры ў Беларусі. Думаецца, працяг гэтай добрай традыцыі ў XXI стагоддзі паспрыяе не толькі з'яўленню новых перакладаў, але і ўзаемнаму развіццю дзвюх славянскіх літаратур.

На здымках: Н. Вылчаў і І. Чыгрынаў, 1964 год; балгарскія пісьменнікі ў Віцебску, 1976 год; Г. Вылчаў, У. Караткевіч, Я. Семяжон, 1970 год; балгарскі паэт Н. Інджоў у Вязынцы, 1965 год.

Здымкі з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва

«Свет непаўторны і хвалюючы»

Гаворачы пра дружбу пісьменніка і часопіса, наўрад ці трэба называць даты. Важней — імёны і назвы твораў. Пяць год таму рэдакцыя часопіса "Всемирная литература" надрукавала апавяданне балгарскага пісьменніка Івана Голева "Іван". Гэта публікацыя адкрыла шлях і для асабістай дружбы, і для новых імёнаў. Апавяданне было прысвечана не зусім зразумелым узаемаадносінам хлопчыка і мужчыны, на сумленні якога, як высвятляецца ў фінале, ляжала выпадковая смерць такога ж хлапчука; складаная псіхалагічная драма вызначыла і змест, і інтанацыі гэтай тонкай празрыста напісанай рэчы. Твор стаўся зразумелым і блізкім і беларускаму чытачу.

Пазней, у 2006 годзе "Всемирная литература" надрукавала (па рэкамендацыі Івана Голева — старшыні Саюза балгарскіх пісьменнікаў) надзвычай цікавую аповесць Здраўкі Яўцімавай "Я выратую цябе" — пра жыццё жанчын у балгарскіх вёсках (пераклад В. Куляшовай і В. Берберава). Не стала незаўважным для чытачоў і апавяданне Уладзіміра Зарава "Прызначэнне чалавека".

На падыходзе новыя публікацыі твораў балгарскіх пісьменнікаў. У бліжэйшых нумарах часопіса плануецца змясціць значную падборку апавяданняў маладых балгарскіх пісьменніц, якая дасць нядрэнную панараму маладой балгарскай літаратуры. Апавяданні Крысцін Дзімітравай, Марыён Колевай, Пенкі Бангавай, Олі Стаянавай ды іншых аўтараў выбралі для часопіса гэткія ж маладыя беларускія перакладчыцы (Тацяна Колабава-Маева, Вольга Пятрэвіч). Гэта публікацыя, спадзяёмся, выявіць цікавае спалучэнне балгара-беларускіх літаратурных і культурных інтарэсаў. Апавяданні сюжэтна простыя, але ж нядрэнна псіхалагічна прапісаныя — яны, безумоўна, упрыгожаць старонкі нашага часопіса.

Вядома, ёсць у часопісе "Всемирная литература" і сучасная паэзія — надрукаваны вершы Станіслава Пенева і Уладзіміра Стаянава ў перакладзе Любові Турбіной (№4, 2008). "Жизни устремление святое — в вечной жажде света и дождя", — гаворыць С. Пенеў; "И несутся в ночи мира недопетые песни..." — гэта радкі У. Стаянава.

Літаратуразнаўца з Плоўдзіва Роза Станкевіч у 2007 годзе прапанавала часопісу грунтоўны артыкул "Свет непаўторны і хвалюючы" — пра паэзію Янкі Купалы і Якуба Коласа ў перакладах на балгарскую мову. "Мастацкі пераклад — важнейшы фактар узаемнага ўзбагачэння нашых культур", — слушна заўважае даследчыца і ўспамінае словы Янко Дзімава пра паэзію Купалы: "...калі перакладаеш якога-небудзь паэта, асабліва вялікага, то ўваходзіш у ягоны непаўторны свет, бачыш тканіну ягоных слоў, заўважаеш характэрныя рысы творчасці і ствараеш у сваёй душы новы, больш аб'ектыўны і дакладны яго партрэт". Згадвае Роза Станкевіч імёны паэтаў, якія займаліся перакладамі беларускай паэзіі: Андрэй Германаў, Найдан Вылчаў, Іван Давыдкаў, Любен Прангаў ды іншыя.

Сувязі з Балгарыяй у часопіса не перапыняюцца. Днямі рэдакцыя атрымала ад сваіх балгарскіх сяброў аповесць аднаго з выдатных пісьменнікаў Балгарыі Янко Станоева "Падарунак нябёсаў", з якой цяпер мы знаёмімся самым уважлівым чынам. Будуць, вядома, і іншыя, не менш цікавыя і патрэбныя нашым чытачам, публікацыі.

Алег ЖДАН,
рэдактар аддзела прозы часопіса "Всемирная литература"

Праз Балканы

У балгарскім горадзе Плевен знаходзіцца музей "Вызваленне Балгарыі", які захоўвае памяць пра нашых землякоў, што змагаліся за свабоду Балгарыі ў руска-турэцкай вайне 1877 — 1878 гг. У яго парку — бронзавыя фігуры генералаў, якія асабліва праславіліся тады. У шэрагу іх — генерал-фельдмаршал Іосіф Гурка, якога балгары лічаць сваім нацыянальным героем.

Іосіф Уладзіміравіч належаў да старажытнага беларускага шляхетнага роду, у якім было, дарэчы, шэсць генералаў. Нарадзіўся 28 ліпеня 1828 года ў вёсцы Бурнеўка, што паміж Скуратамі і Сурнаўкай цяперашняга Круглянскага раёна. Непадалёку ад гэтай вёскі, у лукавіне ракі Друць, знаходзіўся родавы маёнтак Гуркаў. У руска-турэцкую вайну камандаваў так званым Перадавым атрадам, які ў ліпені 1877-га пераадолеў Балканы і вызваліў значную частку Паўднёвай Балгарыі. Затым у верасні — кастрычніку, будучы ўжо камандзірам Заходняга атрада, завяршыў акружэнне занятага туркамі Плевена. Але найбольш выдатныя палкаводчыя якасці І. Гуркі, ягонае баявое майстэрства праявіліся ў самым канцы 1877-га — пачатку 1878 года.

У гэты час Балканы лічыліся непрыступнымі. У магчымасць наступлення рускіх зімой праз Балканы не верылася нікому. Але, насуперак усяму, Заходні атрад І. Гуркі паспяхова прайшоў праз Балканскія перавалы. Адбылося гэта ў самы пярэдадзень Новага, 1878 года. Напярадзе знаходзілася Сафія. Непрыяцель спалохаўся і пакінуў яе без бою. А 4 студзеня 1878 года Сафію занялі рускія войскі. Турэцкая армія аказалася няздатнай аказваць істотнае супраціўленне. Таму Дунайская армія працягвала паспяхова наступаць. 15 — 17 студзеня 1878 года войскі І. Гуркі разграмілі праціўніка пад Філіполем. 20 студзеня амаль без стральбы ўвайшлі ў Андрыянопаль. Да Канстанцінопаля перадавыя часці І. Гуркі не дайшлі, бо ў гэтым адпала неабходнасць. 31 студзеня 1878 года паміж Расіяй і Турцыяй было заключана перамір'е. Мірны ж дагавор падпісалі 3 сакавіка 1878 года. Тым самым балканскія народы вызваліліся ад 500-гадовага турэцкага рабства.

Пасля вайны І. Гурка быў памочнікам галоўнакамандуючага войскамі гвардыі і Пецярбургскай ваеннай акругі. Па сумяшчэнні займаў часова і пасаду Пецярбургскага генерал-губернатара. У адстаўку пайшоў ва ўзросце 66 гадоў, атрымаўшы званне генерал-фельдмаршала. Апошнія свае гады правёў у маёнтку Сахарава ў Цвярской губерні (цяпер аднайменная вобласць у Расіі), дзе і пайшоў у вечнасць 28 студзеня 1901 года.

У 1998 годзе вядомы беларускі кінарэжысёр Анатоль Алай зняў дакументальны фільм "Фельдмаршал Гурка". Яшчэ раней фільм "Дарога на Сафію" быў выпушчаны ў Балгарыі. У 2003 годзе ў выдавецтве "Мастацкая літаратура" выйшла кніга аўтара гэтых радкоў "Як Гурка ворагаў граміў", адрасаваная дзецям. Наш зямляк, нацыянальны герой Балгарыі, заслугоўвае ўдзячнай памяці нашчадкаў, і верыцца, што цягам часу для асэнсавання яго-нага жыцця будзе зроблена яшчэ больш.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Пагартаць залатыя старонкі

28 лістапада, гэта значыць сённяшнім вечарам, беларускія музыканты будуць выступаць поруч са знакамітым балгарскім госцем — дырыжорам Барыславам ІВАНОВЫМ. Шаноўны маэстра, а таксама салісты-спевакі, хор, аркестр нашага Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра і, вядома, публіка — усе збяруцца ў зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі, каб разам пагартаць "Залатыя старонкі сусветнай оперы". Такая назва канцэртнай праграмы, змест якой складаецца з сапраўдных залацінак сусветнай опернай спадчыны.

Упершыню сустракаюцца ў супольнай творчасці дырыжор Сафійскай оперы Барыслаў Іваноў і Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы Беларусі. Паспрыяла візіту госця ініцыятыва мастацкага кіраўніка Беларускай оперы, рэжысёра музычнага тэатра, вучонага-філосафа і мастацтвазнаўцы Маргарыты Ізворска-Елізар'евай. Дарэчы, яна балгарка, скончыла кансерваторыю ў Сафіі, затым у Санкт-Пецярбургу (на той час Ленінград), разам з мужам, знаным балетмайстрам Валянцінам Елізар'евым прыехала ў Мінск і вось ужо больш як трыццаць гадоў займаецца рэжысёрскай практыкай (оперныя спектаклі ставіла і ў Сафіі), выкладае ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, выдала некалькі навуковых кніг. Маргарыта Ніколаўна расказала, што маэстра Барыслава Іванова яна добра ведае, а ён у сваю чаргу меў магчымасць пазнаёміцца з выканальніцкай творчасцю некаторых артыстаў Беларускай оперы падчас іх замежных выступленняў. Адной узаемнай творчай цікавасці для навядзення кантактаў і далейшага супрацоўніцтва недастаткова. Давялося чакаць магчымасці для запрашэння балгарскага маэстра ў Мінск. Сёлета яна з'явілася, і, узгадніўшы рэпертуар з дырыжорам, беларускія выканаўцы пачалі рыхтаваць вялікую праграму.

— *Маэстра выказаў пажаданне азнаёміцца з творчым патэнцыялам нашай опернай трупы, паглядзець, на якім узроўні беларускія артысты валодаюць пэўнымі стылямі, як выконваюць сусветныя оперныя шлягеры. Таму ў канцэрце прадстаўлены толькі тыя артысты, у чыім рэпертуары ёсць партыі, замоўленыя дырыжорам, — удакладняе Маргарыта Ізворска-Елізар'ева.*

Прагучаць у сённяшнім канцэрце, напрыклад, фрагменты з опер "Набука", "Рыгалета", "Баль-маскарад", "Дон Карлас", "Трубадур" Джузепе Вердзі; "Тоска", "Багема", "Турандот" Джакама Пучыні; "Паяцы" Руджэра Леанкавала, "Кармэн" Жоржа Бізэ... І салісты, і музыканты аркестра, і артысты хору з цікавасцю чакалі візіту Барыслава Іванова. Нават сама яго біяграфія выклікае павагу і захапленне. Наш госць скончыў Балгарскую дзяржаўную кансерваторыю па спецыяльнасцях "харавое дырыжыраванне" і "аркестравае дырыжыраванне". Стажыраваўся ў берлінскай *Komische Oper* пад кіраўніцтвам Курта Мазура, у Берлінскім філарманічным аркестры пад кіраўніцтвам Герберта фон Караяна. Працаваў як дырыжор у оперных тэатрах Варны і Плоўдзіва (Балгарыя), музычным дырэктарам опернага тэатра ў Анкары (Турцыя), галоўным дырыжорам тэатра ў Каселі (Германія). З 2004 года — дырэктар Сафійскай Нацыянальнай оперы.

Наш госць вядомы як кіраўнік оперных фэстаў у розных рэгіёнах Еўропы: узначальваў міжнародны фестываль "Варненскае лета", паспрыяў правядзенню "Вечароў Вердзі" ў Плоўдзіве — асновы цяперашняга унікальнага свята вердзіеўскай музыкі на сцэне старажытнага тэатра, заснаваў оперны фестываль на востраве Радос у Грэцыі, сёлета стаў ініцыятарам правядзення такога фэсту на Кіпры.

Барыслаў Іваноў мае рэпутацыю аднаго з лепшых выканаўцаў музыкі кантатна-аратарыяльнага жанру. У яго канцэртным рэпертуары больш як сотня твораў. І ўжо 40 гадоў маэстра з'яўляецца генеральным музычным дырэктарам Сімфанічнага аркестра ў Берліне, правёў больш як 700 канцэртаў у тамтэйшай філармоніі. І яшчэ: наш госць — з тых нешматлікіх дырыжораў, якія ўдзельнічалі з балгарскімі опернымі калектывамі ў музычных фестывалях многіх краін Еўропы ды Азіі. Ён быў першым балгарскім дырыжорам, які стаяў за пультам Венскага філарманічнага аркестра і Венскай оперы.

Уражваюць узнагароды маэстра: ордэн Кірылы і Мяфодзія II ступені, Залаты медаль урада Італьянскай Рэспублікі, ганаровая адзнака ўрада Германіі — "Крыж за ўнёсак у культуру Германіі" I ступені...

Да ўсяго, Барыслаў Іваноў з'яўляецца галоўным кіраўніком антрэпрэнёрскага агенцтва "Інтэркансэрт".

— *Нашы сённяшнія творчыя кантакты грунтуюцца не на камерцыйных інтарэсах, а на сяброўскіх сувязях, сімпатыях, — падкрэслівае Маргарыта Ізворска-Елізар'ева. — У гэтым плане візіт Барыслава Іванова паказальны. Ён з цікавасцю прыняў нашу прапанову сумеснага канцэрта. І вынік гэтага першага сумеснага творчага вопыту пакажа, наколькі мы зможам развіваць нашы міжнародныя кантакты: не толькі з Балгарскай операй, але і шырэй, маючы на ўвазе трывалыя творчыя сувязі маэстра Іванова з многімі культурнымі асяродкамі свету.*

Мы з асаблівай цікавасцю чакаем сённяшні канцэрт і спадзяёмся на развіццё стасункаў, на сяброўскае пагадненне, якое можа быць перспектыўным і спрыяльным для беларускага опернага мастацтва.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

Моцныя традыцыі

Выкладанне балгарыстыкі на кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства філалагічнага факультэта БДУ мае даўнія традыцыі. Сярод пачынальнікаў — Генадзь Афанасьевіч Цыхун, балтаславіст, этымолаг, спецыяліст па паўднёва-славянскіх мовах, намеснік старшыні Беларускага і віцэ-прэзідэнт Міжнароднага камітэтаў славістаў, ганаровы доктар Сафійскага універсітэта, супрацоўнічае з кафедрай і сёння. Ля вытокаў балгарыстыкі стаяў таксама Барыс Юстынавіч Норман, цяпер прафесар, заслужаны дзеяч адукацыі Рэспублікі Беларусь, член Міжнароднай асацыяцыі гуманітарыяў, бліскучы лектар і папулярызатар літаратуры, аўтар 17 падручнікаў і манаграфій, загадчык кафедры тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства ў 1999 — 2007 гг. На жаль, ужо няма ў жывых яшчэ аднаго фанатычна захопленага лінгвістыкай (і балгарыстыкай у тым ліку) чалавека — прафесара Уладзіміра Аляксандравіча Карпава, які доўгія гады працаваў на кафедры.

"Набор на балгарскае аддзяленне ідзе раз на чатыры — пяць гадоў. Цяпер гэтыя студэнты на другім курсе — усяго 17 чалавек. Яны займаюцца ў дзвюх групах — з вывучэннем рускай і беларускай моў", — распавядае выконваючая абавязкі загадчыка кафедры Людміла Казлоўская. У дадатак, для ўсіх студэнтаў БДУ, незалежна ад таго, на якім факультэце яны вучацца, ёсць яшчэ спецыяльны курс, які праводзіцца па вечарах. У гэтай групе цяпер 12 чалавек.

Студэнты балгарскага аддзялення вывучаюць шмат прадметаў: балгарскую мову ў розных аспектах, літаратуру, гісторыю краіны, тэорыю і практыку перакладу, стараславянскую мову ды інш. Падчас навучання студэнтам даводзіцца раз-другі пабываць у Балгарыі на практыцы або ў летніх школах.

На кафедры працуюць тры выкладчыкі балгарыстыкі: дацэнт, кандыдат філалагічных навук Красімір Іваноў, які прыехаў у Беларусь 20 гадоў таму, малады кандыдат навук Вольга Коўш, якая зусім нядаўна абараніла дысертацыю, а таксама лектар з Балгарыі Грыгор Грыгараў. "Мы час ад часу запрашаем на год па праграме супрацоўніцтва балгарскага выкладчыка, каб студэнты чулі арыгінальную фанетыку, кантактавалі з носьбітам мовы", — зазначае Л. Казлоўская.

Грыгор Грыгараў прыехаў у Беларусь з балгарскага гарадка з салодкай назвай Пернік. ("Гэта ў трыццаці кіламетрах ад Сафіі. Там, дарэчы, нарадзіўся прэзідэнт Балгарыі", — тлумачыць ён). Грыгор працуе выкладчыкам балгарскай мовы на філфаку БДУ зусім нядаўна — менш як два месяцы. Але зазначае, што беларускія студэнты паспелі стварыць добрае ўражанне: яны зацікаўленыя, пісьменныя, і ў іх дастатковыя здольнасці і матывацыя для таго, каб вывучыць балгарскую мову на высокім узроўні.

— А якая асноўная матывацыя ў студэнтаў, што абіраюць для вывучэння балгарыстыку?

— Ва ўсіх розная: хтосьці проста хоча ўзбагаціць свой культурны ўзровень веданнем дадатковай славянскай мовы, хтосьці збіраецца стаць выкладчыкам ці рабіць пераклады, а хтосьці, можа, лічыць, што веданне мовы дапаможа зарабляць грошы ў турыстычным бізнесе.

— А ў Балгарыі вывучаецца беларусістыка?

— Увогуле ў Балгарыі мала спецыялістаў па беларускай праблематыцы. На жаль, ні ў адным універсітэце Балгарыі няма кафедры беларусістыкі альбо аддзялення беларускай філалогіі. Хаця польская, украінская ды іншыя славянскія культуры вывучаюцца дастаткова шырока.

Саша ДОРСКАЯ

Сталічны Дом дружбы зладкаваў вечарыну беларуска-балгарскага сяброўства, прысвечаную стасункам Вялікатырнаўскага універсітэта і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Сустрэчы студэнцкія

У чым адметнасць гэтай нядаўняй падзеі, патлумачыла выкладчык БДПУ імя М. Танка, супрацоўнік Пасольства Балгарыі ў Беларусі Вольга Кулеш. Нагадаўшы, што ў нашым педагагічным універсітэце ёсць студэнты, якія вывучаюць балгарскую мову, і што ў мінулыя гады некаторым з іх пашанцавала пабываць на стажыроўцы ў Балгарыі, спадарыня Вольга падкрэсліла: "Сёлета ўпершыню ў практыцы стасункаў дзвюх ВНУ надарылася магчымасць прыняць у Мінску вялікую групу студэнтаў Вялікатырнаўскага універсітэта — 12 чалавек, якія спецыялізуюцца ў вывучэнні рускай мовы. Іх візіт працягваўся два тыдні. Сама стажыроўка ва універсітэце дапаўнялася змястоўнай культурна-азнаямленчай праграмай. Нашы госці наведвалі выстаўкі, музеі, Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Пабывалі ў Міры, у Нясвіжы... А старшыня Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі Ніна Іванова прапанавала наладзіць сяброўскую вечарыну".

У Дом дружбы, дзе даволі часта ладзяцца беларуска-балгарскія літаратурныя сустрэчы з іх ужо сталымі добрымі традыцыямі, гэтым разам прыйшла пераважна моладзь. Прысутнічалі студэнты і выкладчыкі з БДУ, Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта, прадстаўнікі БДПУ імя Максіма Танка і, вядома ж, Вялікатырнаўскага універсітэта са сваім выкладчыкам Дзіляной Хрыставай. Падчас гэтай сустрэчы гаварылася пра літаратурныя і культурныя сувязі паміж нашымі краінамі, новыя кірункі ў двухбаковых кантактах. Гучалі ўзоры паэзіі — беларускай, рускай, балгарскай: нашы студэнты чыталі іх па-балгарску, госці — па-руску. Ладзіліся выступленні музычных гуртоў з Мінскага дзяржаўнага палаца моладзі. Канечне ж, многім і многім хацелася, каб наступным разам (а ў такіх сустрэч ёсць перспектыва!) у інтэрнацыянальным студэнцкім асяродку загучала і слова беларускае.

Вольга Кулеш расказала, што яе студэнты стараюцца засвойваць балгарскую мову ў кантэксце шматстайнага жыцця. Яны ведаюць песні, танцы Балгарыі, цікавяцца тамтэйшай нацыянальнай кухняй, глядзяць фільмы. І спрычыняюцца да міжнародных кантактаў. Вось і нядаўна, падчас Трэцяй сесіі беларуска-балгарскай Камісіі па навукова-тэхнічных, эканамічных і культурных пытаннях, студэнты БДПУ дапамагалі бізнесменам — у якасці перакладчыкаў.

Лана ІВАНОВА

На здымку: Рыльскі манастыр у Балгарыі.

У гонар братэрства

Ёсць у Мінску месца, дзе жыве памяць пра нашых землякоў, якія змагаліся за свабоду Балгарыі ў руска-турэцкай вайне 1877—1878 гг. Гэта царква Святога Аляксандра Неўскага на Вайсковых могілках у цэнтры сталіцы.

Будаўніцтва царквы Святога Аляксандра Неўскага пачалося ў 1896 годзе, асвечаны храм быў ужо праз два гады — 2 лютага 1898 года.

Узвядзенне царквы мела на мэце ўвекавечванне памяці салдатаў-беларусаў, якія загінулі падчас руска-турэцкай вайны. У балгарскай зямлі тады засталося ляжаць шмат сыноў Беларусі. Нашы суайчыннікі адзначыліся пры ўзяцці Шыпкі і ў баях пад Плевенам. Мінскі пяхотны полк першым фарсіраваў Дунай. Беларусы ўваходзілі ў склад такіх ваенных адзінак, як Магілёўскі пяхотны полк, Беларускі ўланскі і гусарскі палкі, 119-ы Каломненскі пяхотны полк і 30-я Каломненская артылерыйская брыгада.

Царква-помнік пабудавана ў традыцыях рускага царкоўнага барока XVII—XVIII стст. Унутры на калонах знаходзяцца мемарыяльныя плиты, на якіх залатымі літарамі высечаны імёны 118 воінаў з Каломненскіх пяхотнага палка і артылерыйскай брыгады, якія па-геройску загінулі пад Плевенам. У храме і сёння захоўваюцца паходная царква і палкавыя харугвы 119-га Каломненскага пяхотнага палка.

Лёс царквы няпросты. У 1938 годзе храм было вырашана закрыць. Падчас бамбардзіроўкі Мінска 24 чэрвеня 1941 года адна з бомб патрапіла на дах храма, але, на шчасце, не ўзарвалася. З пачаткам вайны веруючыя адчынілі храм і пачалі з 5 ліпеня праводзіць пастаянныя набажэнствы. У канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1944 года, калі адбывалася вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у храме знайшлі прытулак мінчане, якіх акупанты хацелі вывезці ў Германію. У пачатку 1960-х савецкія ўлады прапанавалі ператварыць царкву ў майстэрню па вытворчасці трунаў. Маўляў, да вайны ў будынку царквы размяшчалася менавіта такая кантора. (Гэты аргумент, праўда, быў звычайнай фальсіфікацыяй.) На абарону святыні стаў настаяцель царквы протаіерэй Віктар Бекарэвіч. Святыню ўдалося адстаяць.

Сёння, чатыры разы на год, у царкве на Усяленскія бацькоўскія суботы, а таксама 3 сакавіка — у дзень атрымання Балгарыяй незалежнасці, адбываюцца памінальныя набажэнствы. Падчас такіх набажэнстваў згадваюцца пайменна ўсе загінуўшыя ў Балгарыі воіны-беларусы.



Сёлета царкве Святога Аляксандра Неўскага споўнілася 110 гадоў са дня асвячэння. З гэтай нагоды ў храме адбылася ўрачыстая літургія. Службу правялі святары на чале з мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі.

Дзмітрый БЕРАЖНЫ

Фота Кастуся Дробава

Ліхтарыкі душы

Яго фотаздымкі прымушаюць затрымаць на хвіліну дыханне — і задумацца, вершы, якія ён піша, пранікаюць у самыя патаемныя куткі душы, асвятляючы яе мільёнамі ліхтарыкаў.

Здзіўленне і замілаванне — тыя пачуцці, з якімі я пераступала парог кватэры Ліхтаровічаў: акрамя Георгія Леанардавіча, мяне сустракалі Інакенцій і Лёсік — гэта каты, і, я зразумела, проста члены сям'і. Як і гаспадары, яны адрозніваліся сваёй выхаванасцю і гасціннасцю: калі гаспадыня ўручыла мне самыя прыгожыя ў доме тапкі, а гаспадар прапанаваў пагутарыць у яго кабінеце, пухнатыя сябры выдаліся правесці да канапы і пабыць сведкамі нашай размовы, ціхенька ўладкаваўшыся хто на падаконніку, хто — ля маёй рукі. У такой цёплай кампаніі распачалася наша гутарка.

— Скажыце, калі ласка, ваш праект "Windows. Вокны" — набытак апошняга года?

— Так, ідэя ўзнікла нават крыху раней. Гэта бясконцая тэма, разнапланавая, з некалькімі падраздзеламі. Асобны — вітрыны, у якіх ёсць нейкае сваё жыццё: манекены, якія з зайздрасцю глядзяць на людзей, ці наадварот — людзі глядзяць, як прыгожа апрануты манекены. Рознае шкло па-рознаму адлюстроўвае, і нечаканыя колеры ўзнікаюць, і ў гэтым таксама бясконцасць. Вокны — як характар, бо яны бываюць і сціплыя, і напышлівыя, і нахабныя, як і людзі ў жыцці; бываюць і проста прыгожыя, і якія выклікаюць асацыяцыі з нейкімі мастацкімі стужкамі, напрыклад, з сігналам "яўка правалена" ў "Семнаццаці імгненнях вясны", калі вазон быў выстаўлены на акне, і г. д.

— Ці назіраеце вы за зменамі ў абліччы нашай сталіцы і якой бачыце яе сёння?

Георгій Ліхтаровіч, вядомы беларускі фотамастак, паэт, дызайнер, сёлета прэзентаваў свой новы праект "Windows. Вокны". Толькі 50 работ з тысячы трапілі ў экспазіцыю, якая размяшчалася ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі і прымяркоўвалася да святкавання мінчанамі Дня горада. Але гэтыя фотаздымкі выклікалі, безумоўна, незабыўныя ўражанні ў многіх і многіх наведнікаў выстаўкі.

— Наш горад мяняецца кожны дзень, кожную хвіліну. Візуальна адразу не заўважаеш, адчуваеш падсвядома. Вось калі параўнаць архітэктурныя помнікі з іх станам у 1970-я гады, калі я здымаў для кнігі, дык гэта іншы Мінск. На жаль, у гістарычнай частцы горада шмат чаго знікла ці проста ператворана ў нейкую падробку. Я ў гэтым плане зайздрошчу палякам, якім у пасляваеннай Варшаве не было дзе жыць, але яны найперш адрэстаўравалі Старое Места. Мы таксама шмат страцілі пасля вайны, але ж ніякі гандлёвы дом не заменіць гістарычную Нямігу...

Пад офісы штукуюць
Верхні горад,
А я мяркую так
на гэты конт:
Саюз пачварны —
серп, даляр і молат.
Наладзіць бы ў мазгах
еўрарамонт!

(Гэта цытата з кнігі Георгія Леанардавіча "Ліхтарыкі". — **Т. К.**).

— Фотаздымкі адлюстроўваюць ваш настрой?

— Па-рознаму здараецца. Бывае, ідзеш здымаць адно, а сустракаеш зусім іншае, з іншым настроем, якога ты не чакаў, і гэта будыніна, што адбіваецца ў акне, як у люстры, робіць для цябе адкрыццё.

Работы Г. Ліхтаровіча — гэта шматпавярховы дом, дзе ў кожным акне гарыць святло, гэта вокны кшталту крывых люстраў, гэта незвычайныя адбіткі, якія ўгледзеў мастак і не заўважаем мы, мінаючы, спяшаючыся, хто куды. На пытанне, ці будуць у яго творчасці прадстаўлены "вокны" Віцебска ці Магілёва, майстар фота адказвае проста: тады там трэба жыць, а працы для яго яшчэ ў сталіцы хапае.

Георгій Леанардавіч адносна нядаўна пачаў асвойваць камп'ютэр, уласнага сайта ў Інтэрнэце пакуль што не мае, таму пабачыць яго здымкі можна на выставах, у выдадзеных ім кнігах, альбо звярнуўшыся асабіста да фотамастака: ён з прыемнасцю пакажа свае работы і раскажа пра іх.

— Георгій Леанардавіч, вас добра ведаюць як майстра фота, але вы ў душы яшчэ і паэт.

— Пісалася нешта ў 18 гадоў... А калі рыхтаваў да выдання кнігу "Добры дзень, Беларусь" (фота аўтара з яго вершамі. — **Т. К.**), зразумеў, што не хапае там вершаў. Хацеў звярнуцца да Р. Барадуліна, але нешта напісаў сам... А пасля ў мяне пачаўся "вершаваны запой" — так набралася твораў на кніжку "Агульны сшытак" (2002 г.), а потым "Ліхтарыкі" (2005 г). Пасля прынялі ў Саюз пісьменнікаў...

За сваё жыццё Г. Ліхтаровіч афарміў шмат фотаальбомаў: "Мінск", "Гродна", "Траецкае прадмесце", "Слуцкія паясы", "Цытадэль славы" і г.д. Усе тыя кнігі для яго — родныя дзеці, з кожнай звязаны кавалак жыцця. "Фатаграфія — адзіная жанчына, якой я не здраджу ніколі", — жартуе Георгій Леанардавіч.

— Фотамастак, паэт, дызайнер. Спіс можна працягнуць?

— Крыху малюю. Сам працэс мяне больш цікавіць, чым вынік. Гэта дапамагае ў фатаграфіі. (Сціпла адказвае мой суразмоўца, спасылаючыся на тое, што любіць "папэцкацца" ў фарбах. — **Т. К.**).

— Творчыя планы на будучыню?

— Напэўна, проста жыць... Жыццё — такая шматгранная рэч, што падштурхоўвае ў розных кірунках. Атрымалася так, што напісаліся гэтыя кніжкі, — дык дзякуй Богу. Атрымалася так, што з'явіліся "Вокны", — дзякуй Богу. Мяркую, што яшчэ чымсьці буду здзіўляць і людзей, і сам сябе.

♦

Я падзякавала Георгію Леанардавічу за цікавую размову. Гаспадар правёў мяне да дзвярэй, але ўжо адзін: нашы далікатныя слухачы Інакенцій ды Лёсік — заснулі.

Таццяна КЛІМКОВІЧ

Арт-пацеркі

У галерэйна-выставачным комплексе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі праходзіць III Міжнародны фестываль пейзажу, прысвечаны незабыўнаму майстру гэтага жанру — народнаму мастаку краіны Віталю Цвірку. Многія творцы выяўляюць і лірычныя пачуцці, і глыбакадумныя абагульненні ме-

навіта праз пейзаж — сапраўды універсальны жанр. А ў гледачоў ён лічыцца адным з найбольш папулярных. Разам з нашымі суайчыннікамі ў выстаўцы, якая экспануецца да снежня, узялі ўдзел жывапісцы, графікі, фотамастакі, майстры дэкаратыўна-прыкладной творчасці з Арменіі, Літвы, Нарвегіі, Расіі, Сербіі, Украіны.

Падчас свайго сёлетняга візіту ў Мінск Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій II узнагародзіў дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзіміра Пракапцова ордэнам Прападобнага Сергія Раданежскага III ступені.

X Міжнародны фестываль гітарыстаў "Грыфаманія-2008" адбыўся ў Мінску 22 —23 лістапада. Асноўная ідэя фэсту — падтрымка гітарнага руху, пошук і "раскрутка" таленавітых музыкантаў. І ўсё гэта — у духу жывой некамерцыйнай музыкі: удзельнікі "Грыфаманіі" не падладжваюцца пад модны фармат, а граюць ад душы. Сёлета на фестывальнай сцэне (Палац культуры МТЗ) рыхтаваліся выступіць 14 гітарыстаў, пераважна прадстаўнікоў Беларусі. Са знакамітых гасцей — Аляксандр Любчанка (Днепрапятроўск) ды Віталь Макукін (Сімферопаль). Поруч з традыцыйным рокам, блюзам, джазам, фламенка, фолк-найгрышамі ў праграмах гучала і акадэмічная музыка для гітары ў выкананні лаўрэата міжнародных конкурсаў, выхаванкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Юліі Лонскай.

Сёлетняй восенню ў Сараташе (Расія) прайшлі II Сусветныя Дэльфійскія гульні пад патранатам ЮНЕСКА і генеральнага сакратара Савета Еўропы Тэры Дэвіса. У традыцыйнай для конкурснай праграмы намінацыі — "выяўленчае мастацтва" пераможцам і ўладальнікам залатога медаля стаў прадстаўнік Беларусі Дзяніс Чубукоў. Работы маладога выкладчыка спецыяльных

дысцыплін Рэспубліканскай гімназіі-каледжа мастацтваў імя І. Ахрэмчыка звяртаюць на сябе ўвагу і наведнікаў айчынных вернісажаў. Згадайма яго каларытны акрылавы жывапіс у нацыянальным дэкаратыўным стылі на леташняй Рэспубліканскай мастацкай выстаўцы работ стыпендыятаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі (дыптых "Баба Ганна" ды "Індык Фёдар", "Бабуля, красуля і камары", серыя "Вечар у Ратамцы"), яго аўтапартрэт у вобразе "птушкачалавека" на сёлетняй маладзёжнай выстаўцы ў сталічным Палацы мастацтва.

С. ВЕТКА

***На здымках:** У. Масленікаў, "Азёрны край"; Д. Чубукоў, "Індык Фёдар".*

Фота аўтара

Нас выбіраюць...

Беларускі дырыжор Мікалай Макарэвіч атрымаў неспадзяваную магчымасць прайсці майстар-клас у сусветна вядомага маэстра, народнага артыста СССР, прафесара Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных Уладзіміра Федасеева.

Чалавек творчы вучыцца ўсё жыццё. Нават у сталым узросце, нават набыўшы прызнанне, славу і ўласных вучняў. Вось і кожны сур'ёзны музыкант мае ўнутраную патрэбу ўзбагачаць свой досвед, удасканальвацца ў прафесіі. Тым больш, калі абраў для сябе "прафесію другой паловы жыцця" — дырыжыраванне, а творчая кар'ера толькі пачынае складвацца. Таму і не дзіўна, што дырыжора Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра Мікалая Макарэвіча, маладога маэстра, у якога ёсць таксама вопыт супрацоўніцтва з аркестрамі Белтэлерадыё, Брэсцкага абласнога тэатра драмы і музыкі, філармоніі ў Беластоку (Польшча), мастацкага кіраўніцтва сімфанічным калектывам Мінскага дзяржаўнага музычнага вучылішча імя М. Глінкі ды выкладання ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, прывабіла магчымасць паглыбіць свае прафесійныя веды.

А было так. Старэйшы калега Мікалая, вядомы айчынны дырыжор Аляксандр Сасноўскі, наведаўшыся вясною ў Санкт-Пецярбургскую кансерваторыю, прывёз адтуль свайму колішняму вучню абвестку з умовамі правядзення першага Міжнароднага майстар-класа Уладзіміра Федасеева па аркестравым дырыжыраванні: "Паспрабуй...". Мікалай адправіў належныя дакументы і быў шчыра здзіўлены, атрымаўшы летам па электроннай пошце прапанову пацвердзіць свой удзел у майстар-класе. Пачуваў сябе ўлюбёнцам лёсу, радаваўся: наперадзе — тры дні ў Маскве, у атмасферы легендарнага федасееўскага аркестра, урокі майстра! Калі ж увосені прыехаў туды, аказалася, што для першых заняткаў, якія ладзіліся пад раяль, Мікалая не выбралі: беларускаму дырыжору была дадзена магчымасць пасіўнага ўдзелу. Гэта значыць, яму дазвалялася прысутнічаць у рэпетыцыйнай зале і толькі назіраць за 5 — 10-хвіліннымі індывідуальнымі ўрокамі, якія У. Федасееў праводзіў з пяццю маладымі калегамі-расіянамі.

Аднак падзеі развіваліся з казачнай неверагоднасцю. Хтосьці з абраных курсантаў не прыйшоў на заняткі, і ў пунктуальнага кіраўніка майстар-класа з'явіўся "лішні" час. Прафесар выклікаў да дырыжорскага пульта Мікалая Макарэвіча, і ўрок працягваўся... 50 хвілін! Наступным днём прадстаўніка Беларусі ўключылі ў пяцёрку штчасліўчыкаў, якіх маэстра дапусціў да рэпетыцый са сваім аркестрам — Вялікім сімфанічным аркестрам імя П. Чайкоўскага. Мікалай Макарэвіч атрымаў магчымасць папрацаваць з высакакласнымі музыкантамі 40 хвілін. Рэпеціравалі 1-ю частку Шостай сімфоніі Пятра Чайкоўскага, 1-ю і 2-ю часткі Чацвёртай сімфоніі Людвіга ван Бетховена — гэтыя творы Уладзімір Федасееў рыхтаваў да канцэрта ў Доме-музеі П. Чайкоўскага ў Кліну.

"Удзельнікамі майстар-класа былі дырыжоры з усёй Расіі — Ніжняга Ноўгарада, Казані, Тамбова, Чэлябінска, Растова, Санкт-Пецярбурга, Масквы, а яшчэ з Венесуэлы... Сёння з трывогай гаворыцца пра адсутнасць пераемнасці традыцый і досведу вялікіх майстроў у розных сферах мастацтва. Дык вось, у гэтым сэнсе ўразіла шчырасць Уладзіміра Іванавіча: гэта, мабыць, першы чалавек сярод мэтраў дырыжорскага мастацтва, які не пабаяўся дапусціць старонніх людзей, у тым ліку энергічных таленавітых суайчыннікаў, патэнцыйных канкурэнтаў, да сваёй творчай кухні, не пабаяўся раскрываць прафесійныя сакрэты перад маладымі калегамі, — расказвае Мікалай Макарэвіч. — У калектыве Федасеева каля 70 музыкантаў, з іх каля 20 ганараваных званнем "народны артыст Расіі". І ўтвараюць яны дзівосны, адзіны і чуйны, ансамбль, у стасунках з якім, што немалаважна, адчуваеш простую чалавечую цеплыню. А калі сам стаіш за пультам аднаго з лепшых аркестраў свету, забываешся на ўсялякія праблемы тэхналогіі, узнікае невыглумачальная лёгкасць, упэўненасць у сабе. Прызнацца, асабліва прыемна тое, што Беларусь не засталася ўрэшце незаўважанай, што мне без аніякіх пратэкцый і хадайніцтваў пашчасціла апынуцца ў гэтым асяродку высокага прафесіяналізму і творчасці. Ёсць яшчэ адзін момант: на Захадзе майстар-класы такога ўзроўню нават для пасіўных удзельнікаў каштуюць каля 200 еўра. Мне ж давялося заплаціць толькі за праезд, жыллё ды харчаванне. І я атрымаў неацэнны вопыт, новыя веды. А веды, як любіла паўтараць мая прабабуля, за плячыма не насіць...".

Не так даўно Мікалай Макарэвіч разам з многімі музыкантамі ўдзельнічаў у падрыхтоўцы і правядзенні канцэрта, прысвечанага 90-годдзю з дня нараджэння незабыўнага беларускага маэстра Іосіфа Абраміса. Штодзённыя клопаты дырыжора і педагога, сёння, вядома ж, выйшлі на першы план, і Мікалай ужо радзей паглядае на свой сертыфікат удзельніка Міжнароднага майстар-класа па аркестравым дырыжыраванні, падпісаны прафесарам Уладзімірам Федасеевым. Затое ўсё часцей успамінае той неацэнны ўрок, што няўгледна дапамагае ў прафесіі.

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

***На здымку:** прафесар Уладзімір Федасееў сярод маладых дырыжораў (справа — Мікалай Макарэвіч).*

Самы кароткі шлях у найноўшае прыгожае пісьменства пралягае не праз вершаванні/ прозу/п'есы і нават не праз крытыку/ эсэістыку/зацемкі (розныя), але праз маніфесты.



Ціхія гульні пасля кананады



У другой кнізе А. Кавалеўскі відавочна больш "даткліва" ставіцца да змястоўнага боку выказвання. Магчыма, якраз дзякуючы гэтаму "міжвольнаму" (насуперак сабе, "маніфестацыйнаму") памкненню наноў згарманізаваць мастацкі вобраз паэтычныя творы насычаюцца адмысловым (тут: асмужаным "урбаністычнаю самотаю") лірызмам. Медытатыўнасць як спосаб спасціжэння — і аднаўлення — рэчаіснасці ў асобных творах "Аддаленасці і Адданасці" лучыцца з амаль "рэалістычнай" увагаю да дэталей.

Арцём Кавалеўскі, "універсальны салдат" на сённяшнім літ-палігоне (бо засведчыўся як аўтар вершаваных і празаічных, і літаратурна-крытычных тэкстаў), дакладную траекторыю руху да найхутчэйшага поспеху пралічыў раней за многіх сваіх равеснікаў, калі ў 1994 годзе пачаў выштукоўваць, а ў 1999-м урэчавіў-такі ў словах ды іх злучэннях *маніфест логафармізму*. Калі цікаўны чытач пасля штудыяў адпаведнай публікацыі ў "Першацвеце" (1999, № 7—8) усё ж не здолее самастойна разабрацца ў сутнасці гэтага "літаратурна-мастацкага метаду" (вытлумачанага А. Кавалеўскім яшчэ і ў схемах), ён можа разлічваць на кваліфікаваную дапамогу Г. Кісліцынай. У кнізе "Новая літаратурная сітуацыя: змена культурнай парадыгмы" (Мінск, "Логвінаў", 2006) даследчыца, абапіраючыся на прадстаўнічыя цытаты-вытрымкі з маніфеста і тэксты з першай кнігі сп. Кавалеўскага "Адмы**словы**я гульні", прыходзіць да высновы (скрушнай ці суцяшальнай — залежыць ад эстэтычнай арыентацыі канкрэтнага чытача), што "нягледзячы на эксперыментальна-фармалістычныя вопыты, гэты паэт сёння выглядае паслядоўным літаратурным спадчыннікам — не столькі беларуса С. Полацкага, колькі больш блізкіх у часе абэрыутаў".

Мне меркаванне Г. Кісліцынай падалося верагоднасным і сфармуляваным, прынамсі, празрыста, а вось сутнасць логафармізму як *арыгінальнага* творчага метаду — не. Зрэшты, mea culpa (мая віна, анягож!): спробы асэнсавана (хоць бы пры мінімальна рацыяналістычным падыходзе) разабрацца ў "мэтах і задачах" нашых найноўшых літаратурна-мастацкіх маніфестаў апошнім часам выліваюцца ў нежартоўныя праблемы — ад звыклага дэжаву да цьмяных пакуль перспектыў псіхастэнічнага сіндрому. Менавіта маючы на ўвазе патэнцыяльную "неаб'ектыўнасць" у ацэнках вартасцей (а, магчыма, нават раскошаў) вынайдзенага А. Кавалеўскім творчага метаду, у стасунках з яго кнігамі мушу абраць шлях не "дэдукцыі", але "індукцыі" — рухацца ад "палявых доследаў" да абагульненняў, высноў (а ўжо ад іх і да якога-небудзь "крытычнага маніфеста" — ноч за камп'ютэрам!)...

Такім чынам, першую кнігу А. Кавалеўскага "Адмысловыя гульні" склалі "вершы 1995—2003 гадоў". Я не ведаю, наколькі карпатлівым быў адбор тэкстаў для гэтага зборніка, але літаральна кожнае ўключанае ў яго вершаванне паўстае "фактам", закліканым урэчаўляць логафармічныя м*а*ры аўтара. Пад формай сп. Кавалеўскі мае на ўвазе "зрокавае ўспрыманне і непасрэднае графічнае ўвасабленне мастацкага твора". Адпаведна, у яго дэбютнай кнізе вершаванняў "графічнасць" тэксту становіцца вызначальнай характарыстыкай, дасягаючы своеасаблівага піку ў спробах стварыць узоры візуальнай паэзіі (гл., напрыклад, верш-ромб "***Я чуў голас...", які можна чытаць і знізу ўверх, і зверху ўніз). "Наватарства" А. Кавалеўскага, праўда, не выпадае ўважаць за штосьці *радыкальна арыгінальнае*: акрамя памянёных Г. Кісліцынай папярэднікаў, згадаем і пра літаратуразнаўчыя вопыты "фармальнай школы", прадстаўнікі якой, у сваю чаргу, творча пераасэнсоўвалі ідэю нямецкага мастацтвазнаўцы Г. Вёльфліна наконт "таямнічага жыцця і росту формы" — галоўнага, на яго думку, фактару літаратурнага працэсу. Праблема ў тым, што ў кнізе "Адмысловыя гульні" форма як бы "перарастае" сам вершаваны тэкст, "заглушаючы" семантыку паэтычнага выказвання як такога: "Хай хтосьці не пажартуе // З маіх шырокіх крокаў, // З маёй лятаючай // Лунаючай // Постаці. // Добра?" ("Трохвугольныя нерэальнасці").

[На жаль, у газетнай публікацыі няма магчымасці аднавіць арыгінал ва ўсёй раскошы. Затое ў чытача будзе нагода ў каторы раз *купіць беларускае*...].

Дэманстратыўная засяроджанасць аўтара "Адмысловых гульняў" на гукапісе прыводзіць да неадназначных наступстваў. У адных выпадках алітэрацыі і асанансы насамрэч дазваляюць дасягнуць пэўнага сугестыўнага эфекту — гэта адбываецца тады, калі самога літаратара *гучанне* фразы заварожвае не настолькі, каб ён зусім забыўся на яе *значэнне*: "Я забыўся на стому, // Я спаў стоячы, // Тоячы свае // Сапраўдныя // Адчуванні, // Сатканыя з тонкіх // Самотных сноў" ("Стома"; варты таксама пільнай увагі і тэкст "***Страху страха..."). Але нярэдка вершатворца становіцца ахвярай уласных экспериментаў. Прынцып "гукапіс — перадусім" у многіх тэкстах рэалізуецца залішне літаральна — і, так бы мовіць, *займае "месца" зместу* (і ў крытыцы, як высвятляецца, ёсць прастора для гукапісу, чытай: для Творчасці):

"Доля далоняў // Падала долу. // Мне не хапала // Ўжо валідолу. // Воля далёкіх валоў // Згвалтавана — // Волаты-зверы, // Волаты-плямы" ("Хваробны палёт");

"Зося — // Запалітызаваны //Зомбі" ("Палітычнаактыўнай моладзі");

"Лета // Ляцела // Ля цела // Цяля" ("Вясковае, летняе...").

Разам з тым, А. Кавалеўскі не дае герою сваіх вершаванняў надоўга забыцца на ягоную (героя) галоўную *функцыю* — спрыяць укараненню логафармізму ў айчыннай літаратурнай прасторы. Таму праявы недарэчна "тонкай" (асабліва ў кантэксце "тут-і-зараз") душэўнай арганізацыі ("Я таксама памёр, // Бо пачуў слова // "НЕСАПРАЎДНАСЦЬ" ("Апошняе слова")) у абмежжы першай кнігі сп. Кавалеўскага нагадваюць ціхія ўздыхі — і амаль заглушаюцца маніфестацыйнай кананадай, у якой чуецца водгулле яшчэ бумбамлітаўскіх *выхадаў з-за печкі*: "Гэта быў // Такі твор // Паламаных // Рам — // Попел-рэквіем: // Там-тара-рам!" ("Попел-рэквіем").

Аднак, дзякуй Богу, ніхто не эвалюцыянуе гэтак *традыцыйна*, як пераважная большасць сённяшніх нашых *авангардыстых*. Зварот "Ад аўтара", якім адкрываецца другая кніга А. Кавалеўскага "Аддаленасць і Адданасць" (Мінск, "Галіяфы", 2008; серыя "Другі фронт мастацтваў"), падсумоўваецца высновай: "Аддаленасць спараджае адданасць. І наадварот. У гэтым свеце ўсё парадаксальна..." У дачыненні да творчасці самога "бацькі логафармізму" апошняя сентэнцыя набывае прыкметы сапраўднай навізны. Насуперак распаўсюджанаму ў нас меркаванню, што першы зборнік паэта заўсёды бывае "мацнейшы", чым другі, якраз сёлетняя кніга "паэзіі і лірычнай прозы" А. Кавалеўскага падаецца больш цэльнай у мастацка-эстэтычных адносінах, чым "Адмысловыя гульні". Суадносіны паміж дэбютным і нядаўнім зборнікамі гэтага літаратара выдатна ўкладваюцца ў "формулу", якою паўстае цытата з верша "Трэба!": "Я — фотаробат, // А ты — фотаздымак".

Нягледзячы на рэцыдывы "маніфестацыйнай ліхаманкі" цягам пяці раздзелаў, што складаюць "Аддаленасць і Адданасць" ("Сім-Сім", "Аўта-партрэт з працягам", "Тут і потым", "Шкельцы", "Adulttales (казкі для дарослых)"), "фотаробат" лірычнага героя А. Кавалеўскага паступова "ўскладняецца" пачуццямі, перажываннямі, урэшце, характарам — спакваля ператвараецца з выявы (умоўна-абагуленай) у партрэт (індывідуалізаваны, надзелены асобаснасцю).

Вершы, адзінкавыя ў першай кнізе, у другой ужо не падаюцца выпадковымі: раю звярнуць увагу на "***Калі раптам дзень пачынае плакаць...", "***Абрыдлі...", "Верш на плошчу". Сюды можна было б далучыць яшчэ шэраг тэкстаў, якім да здзяйснення ў якасці твораў не хапіла аўтарскага (рэдактарскага?) моўна-стылёвага чуцця, а можа, "звычайнай" цярплівасці:

"Мае крылы, што ніяк не вырастаюць, — // Повад нарадзіць сына // І разам з ім — крылатым — акрыленым — // Склейваць мадэлі пасажырскіх самалётаў..." ("Аўта-партрэт з працягам");

"І апантанасцю суцешыць // Тваё няўсцішнае "бывай"... // Як голасна сабакі брэшуць, // Калі ідзеш за небакрай..." ("***Адчаю зазірнуць у вочы...");

"Выйсці раптам бы // І раптам заблукацца // У пустэльні гарадскіх кутоў; // Што са мною, зрэшты, // Можа стацца // На мяжы няпэўнай // Сноў і слоў?.." ("***Мне балела так...").

Праўда, у дачыненні да іншых тэкстаў мэтазгодней гаварыць не пра недахоп, але пра такі "дэфіцыт" памянёнага моўнага чуцця, які ўтварае рэальную пагрозу для самога "жыцця" мастацкага тэксту: "Не, я не жалую, што сённяшні дзень // Распачаўся так рана. // Вясна прымружыла вочы, як старая маці, // Што зачакалася на сына. І спіць... <...> Мы выціскаем з заспанае вясны // Сон ажыўшы. // Мы ведаем шмат, // Але мала гаворым пра гэта" ("Першага красавіка").

Згаданыя недарэчнасці вельмі *хочацца* ўважаць за дробязі "прыватнага характару", а папраўдзе, дык і *не хочацца* іх заўважаць, каб не псаваць агульнага ўражання ад тых якасных зрухаў, што аддзяляюць паэтычныя творы "Аддаленасці і Адданасці" ад вершаванняў "Адмысловых гульняў". У другой кнізе А. Кавалеўскі відавочна больш "даткліва" ставіцца да змястоўнага боку паэтычнага выказвання. Магчыма, якраз дзякуючы гэтаму "міжвольнаму" (насуперак сабе, "маніфестацыйнаму") памкненню *наноў* згарманізаваць мастацкі вобраз паэтычныя творы насычаюцца адмысловым (тут: асмужаным "урбаністычнаю самотаю") лірызмам. Медытатыўнасць як спосаб спасціжэння — і аднаўлення — рэчаіснасці ў асобных творах "Аддаленасці і Адданасці" лучыцца з амаль "рэалістычнай" увагаю да дэталей. Апошнія (вось бы здзівіўся, відаць, аўтар "Адмысловых гульняў"!) і забяспечваюць такую "пажаданую" для любога літрадыкала арыгінальнасць паэтычнага маўлення: "Філіжанка ўсміхалася арна- // ментальна засохла- // ю кавай. // <...> // Сціпла і цесна было // У маім непрытульным пакоі, // Там, дзе нягояцца раны старыя // І падаюць нізкія столі... // ... // Праўда!" ("Мана (*нацюрморт*)"). Зазначым (між іншым), што якраз анжамбеман (пераносы), яскрава выяўлены ў працытаваным тэксце, у другой кнізе А. Кавалеўскага становіцца, бадай, галоўным стылістычным прыёмам, прадстаўленым ці не ва ўсіх магчымых сваіх разнавіднасцях — радковай, строфнай, складовай (гл. "***Аднойчы...", "Наадвечна" і інш.). Паводле літаратуразнаўчых назіранняў, шматлікія "пераносы" працуюць на стварэнне *празаізаванай* інтанацыі, заўважна нівеліруюць вершаваны рытм — і разам з тым у спрытных "руках" ператвараюцца ў дзейсны сродак мастацкай выразнасці. Здаецца, аўтар "Аддаленасці і Адданасці" вырашыў не растрачвацца на абстрактную "форматворчасць" — і з усім спрытам ды імпэтам засяродзіцца на "майстэрстве гульні ў анжамбеман". М*а*е права.

Нельга сказаць, што А. Кавалеўскі ў адначассе адрынуў і тыя мілыя сэрцу любога эксперыментатара тропы, дзе ўскладненне метафарычнага ці сімвалічнага кода мае на мэце не "ўдакладненне" адбітку рэчаіснасці (унутранай ці вонкавай), але, наадварот, яго яшчэ большае "прыхоўванне":

"Ты запіхваеш мяне // У бэдж свайго палону, // Каб бліжэй прышпіліць // Да грудзей..." ("***Ты запіхваеш мяне...");

"Вой // Замест ледзь чутных // Словаў — // Мой // Скансруяваны нораў..." ("Золак");

"Ламаецца дзень. // Я ў пустэчы, // Нібы авадзень" ("***Слотна...").

Своеасаблівым адкрыццём у межах зборніка "Аддаленасць і Адданасць" стаўся раздзел "Adulttales (казкі для дарослых)". "Чытанка", адрасаваная "ўсім, хто лічыць сябе дарослым", уключае пяць частак (па колькасці дзён працоўнага тыдня), кожная з якіх утрымлівае адну "мужчынскую" і адну "жаночую" гісторыю. Невялічкі ўступ-тлумачэнне (змест якога не так ужо і вольна пераказаны рэцэнзентам) нібы наўмысна падштурхоўвае да асацыяцый з творамі Міларада Павіча, найбольш відавочна — з "Унутраным бокам ветру. Раманам пра Гера і Леандра" ды "Стракатым хлебам: Гісторыяй для хлопчыкаў / Нябачным люстрам: Гісторыяй для дзяўчатак". Аднак на гэтым "імправізаваным" эпіграфе з алюзіямі-асацыяцыямі варта развітацца: "казкі" А. Кавалеўскага настолькі ж далёкія паводле зместу і стылёвай манеры ад павічавых аповедаў, як і ад той агульнавядомай беларускай "лірычнай прозы", жанравай шыльдай якой ён імкнецца з нейкай прычыны прыкрыцца.

"Adulttales", на мой погляд, не ёсць лірычнай прозай, але бясспрэчна ёсць *прозай* — дакладней, "эцюдамі", накідамі, абяцаннямі яе. А. Кавалеўскі не прапануе чытачу "імпрэсій" ці "экспрэсій", жанр якіх многім пачаткоўцам чамусьці падаецца гэткім жа "лёгкім", як цыкл з дванаццаці раманаў у духу фэнтэзі. "Казкі для дарослых" нагадваюць спробы занатаваць свет адначасова "знутры" і "звонку"; гэтыя гісторыі паўстаюць не з імкнення бачыць свет, як *ён* ці *яна*, але з неабходнасці адчуць: як гэта, быць адначасова *ім* і *ёю*? Падобны *спосаб жыцця* героя(ў) абумоўлівае пэўную фрагментарнасць аўтарскага пісьма — і абгрунтоўвае невыпадковасць суседства "фрагментаў" (асабліва цікавыя тут другая ("Амаль усё", "Кажаніха") і трэцяя ("Імя", "Аптэка") "казкі". Сам фармат "кароткай прозы" вымагае лаканічнасці, але — у адрозненне ад многіх вершаванняў А. Кавалеўскага — ахвярай гэтага змушанага "мінімалізму" не становяцца змястоўнасць, эмацыйнасць, урэшце, "сапраўднасць" стылю. Цікава, што дзесятак старонак, на якіх змясцілася "лірычная проза" А. Кавалеўскага, больш "інфарматыўныя" для вызначэння творчай манеры, індывідуальнага стылю літаратара, чым амаль дзве сотні версіфікатарскіх выхадаў на "душы аўтастраду" (вобраз належыць аўтару "Аддаленасці і Адданасці"; мы не квапімся на чужыя каштоўнасці!)...

Увогуле ж, кірунак і тэмп руху А. Кавалеўскага ад "Адмысловых гульняў" у "Аддаленасць і Адданасць" вымушае ў каторы раз дзякаваць Богу і асаблівасцям беларускага літаратурнага працэсу за тое, што і самыя зацятыя — у сэнсе "рэвалюцыйнасці" настрояў — творцы здольныя эвалюцыянаваць... гэтак... *традыцыйна*. (А ў нас зямля такая.)

Ірына ШАЎЛЯКОВА

Валянцін ЛУКША

Юбілей Пегаса

Пісьменніцкі Саюз у згодзе з часам
Дзень юбілею вызначыў Пегаса.
Ратай-шчырун на паэтычнай ніве
Наструніў урачыста хвост і грыву.
Агрузлы паэміст яму прывёз
З духмянасцю мурожнай сена воз.
Схуднелы лірык, быццам бы лучына,
Прынёс каню бярэма канюшыны.
Складальнік тэкстаў безаблічных песень
Стракатых кветак назбіраў на ўзлессі.
Паэткі, што зляцеліся ў танок,
Сплялі каню вясёлкавы вянок.
Прымчаў, у рэшце рэшт, паэт дзіцячы
І юбіляра соскаю адзначыў.
Сатырык —
па грахах людскіх вандроўнік —
Прынёс Пегасу высахлы дзядоўнік.

Каму ж фартуна усміхнецца шчасна
З-пад капытоў
Удзячнага Пегаса?..

Паэт і муза

Паэт-рамантык трапіў зноў у лузу
На кволай ніве творчага даверу, —
Прыдбаў сабе у дальняй вёсцы Музу
Дагэтуль невядомага памеру.

Цяпер ён вершаў прывідных не піша,
Свой лёс, як кот сляпы, узнёсла хваліць:
— Займаем цяжкавагавую нішу
На хісткім паэтычным п'едэстале.

Пажаданне мэтра

Казаў сівому Мэтру пачатковец:
— Каб Бог мне талент, як Талстому даў,
Я б разгінаў сюжэты, як падковы,
Пегаса б, калі трэба, падкаваў.

І Мэтр сказаць адкрыта хлопцу мусіў,
Каб грэх маны ніколі не душыў:
— Вунь, на гары, бразгоча зранку кузня,
Там авалодвай талентам... ляўшы.

Мітуслівая душа

Калі мужчыну часам заганяе
У цёмны кут пасланы Богам лёс,
Жанчыну ён паспешліва шукае,
Як паратунак,
Ці як дар нябёс.

Калі ж спакой сямейны атуляе,
І жонку успрымаеш, як святую,
Мужчына клапатліва падбірае
Для паўнаты душы сабе... другую.

Шаржы Алега КАРПОВІЧА

Генадзь АЎЛАСЕНКА

Кыш, камары!

Ты — камень, Богу дарагі.
Кідок! — і па вадзе кругі.
А што за сімвалы ці знакі,
Не ўведае камар ніякі.

Людка СІЛЬНОВА



Вы думаеце, камары
Дарма звінелі на двары?
Як бы не так! Яны пры гэтым
Скрадалі творчыя сакрэты!
Губляць сакрэты не хачу.
Так верш чарговы закручу,
Што сімвалы яго не ўведаць
Ні камару, ні... чытачу!

Усюды паэзія

Ку-ку, ку-ку, ку-
ку, ку-ку, ку-ку, ку-ку,
ку-ку, ку-ку...

Недакувала зязюля
хоку.

Аксана СПРЫНЧАН

Ку-ку, ку-ку, ку...
Недакувала зязюля
хоку.

Гаў-гаў! Гаў-гаў! Гаў-гаў! Гаў!
Барбос з будкі яе падтрымаў.

Рох...

Парсюк з хлеву
ім дапамог.

...ку-ка-рэ-ку!

Певень закончыў
хоку.

«Класічная» гісторыя

Калі сэрца тугой шчымела,
бо яму цяпла не хапала, —
да мяне заходзіў нясмела
летуценнік Янка Купала.
Калі я, прыгнечаны нечым,
забываўся на ўласны голас,
мне расправіць прыходзіў плечы
па-бацькоўску, Якуб Колас...

Мікола АДАМ

Неяк раз Купала і Колас
да мяне пастукалі ў дзверы.
Я забыўся на ўласны голас,
я вачам сваім не паверыў!
А яны заходзяць нясмела,
і, як быццам, прыгнечаны нечым...
Ну, і я тады, зразумела,
па-сяброўску расправіў плечы.
Іх вітаю: "Будзем знаёмы!"
Ды ў адказ Купала і Колас
кажуць мне: "Нам неяк няёмка,
калі побач Адам Мікола".
— Кіньце, хлопцы, — кажу, —
пра гэта, будзьце тут,
у мяне, як дома!
Вы ж — вядомыя ў свеце паэты.
сам я покуль —
з малавядомых...
Кажа Колас: "Ты сціплы дужа!"
— Праўда, праўда! —
мовіць Купала. —
Лепш прымай эстафету, дружа!
Нам цябе якраз не хапала!
Я ад шчасця аж пахіснуўся.
Гэта ж трэба —
я класікам роўны!

Але тут, як на злосць...
прачнуўся...
А шкада! Сон такі шыкоўны!

Амброзь КАРШУНЬСКІ

Што сніцца творцам

(Працяг)

* * *

Леанід Дранько-Майсюк выдаў кнігу лірычных прысвячэнняў, выкарыстаўшы пры гэтым увесь алфавіт ад А да Я. Як памятаем, усё пачалося з цыкла "Вершы для А". Пакрыўджанымі засталіся літары Ь, Ў і Й і ўсе тыя, хто хаваецца за імі.

* * *

У зноў адчыненым Доме літаратара адбылося ўганараванне Раісы Баравіковай з нагоды прысваення ёй звання Народнай паэткі Беларусі. Вялізны букет правінцыйных давыдарадоцкіх кветак уручыў паэтцы Нобелеўскі лаўрэат Георгій Марчук.

* * *

Пасля шматлікіх лістоў чытачоў Генрых Далідовіч завяршыў працу над працягам кнігі "Жар кахання", назваўшы яе паводле жыццёвага вопыту крыху інакш: "Цяжар кахання".

* * *

Віктар Кунцэвіч пасля нядаўняга начнога міліцэйскага штрафавання кожнае сваё новае вершаванне пазначае флікерам. (Хай пазнаюць!).

* * *

Герой Барыса Бележэнкі, якога ён уславіў у кнізе "Успаміны пра майго асла" з'явіўся ў сне жывым і абураным і тут жа прад'явіў аўтару свой рахунак.

* * *

Мікола Вяршынін значна дапоўніў сваю кнігу "Найважнейшыя аб'екты". Да ліку найважнейшых з "аб'ектаў" аўтар адносіць таксама даўнія інтымныя ліставанні, ваенкамаўскія ды міліцэйскія позвы, а таксама ранішнія і вечаровыя маналогі ўласнай жонкі.

Павел САКОВІЧ

«Крытычная» эпіграма

У крытыкаў настаў матрыярхат.
Жанчыны смела так сябе паводзяць...
У літразборках не ўжываюць мат,
Аднак і цырымоній не разводзяць.

Іх набярэцца цэлы гурт, ***капа.***
Хоць маладняк,
а пальца ў рот не суньце!
І дзе іх на бяду хто адкапаў
Ці адшукаў, напэўна, ***у капусце.***

Далі, відаць, мужчыны слабіну,
Запал крытычны зноўку падмачылі,
Таму з халтурай жорсткую вайну
Слабому полу весці даручылі.

Васіль ДЗЕРАВЯШКА

Свінскі жарт

Як вы кумекаеце, шаноўныя чытачы, хто сёння самы адпеты ў свеце гумарыст? Анатоль Зэкаў? Дзік Стэнлі? Чарлі Х'юз? Мікола Вяршынін? Балазе, яны хлопцы зграбныя. Яшчэ як здатныя на смехатворныя выбрыкі. І не толькі на іх. Але пры ўсёй маёй талерантнасці да названых вышэй хітраголікаў мушу вам катэгарычна заштыкеціць, бо на сёння самым вартасным гумарыстам свету з'яўляецца мой сябар Кузя. І зусім не таму, што ён крэмзае гумарэскі. Шчыра скажу — ён наогул нічога не крэмзае, нават вершаў. А пісаць гумарэскі, фельетоны ды іншую драбнату — гэта мая прэрагатыва.

Аказваецца, зусім неабавязкова быць пісакам, каб праславіцца ў літаратурным жанры. Прыклад Кузёмкі — гэта вэнджаны кумпяк з хрэнам супраць малака з мёдам. Вось і ўчора, падчас чарговага дыспуту наконт развіцця і пашырэння айчыннага гумару, мэр нашай правінцыйнай сталіцы (не буду святіць прозвішча знакамітага сабутэльніка), кульнуўшы чарговы келіх каньяку, катэгарычна заявіў майму сябру, а значыць, і мне: — Не сып парахню ў вочы, Кузя. Мяне ты не падкузьміш!

— На літр армянскага? — спакойна гэтак адрэагаваў Кузьма.

— Дзяры бульбу на драчонку, — працягваючы на заклад лепшаму гумарысту свету руку, звярнуўся да мяне мэр.

А мне што! Пры любым зыходзе каньяк мяне не міне, таму спрытна "зацвярджаю" спрэчку.

Было ў мэра пажыццёвае хобі. Свінагадоўляй захапляўся. Якіх толькі экземпляраў ды пародаў не разводзіў! Тут табе і англійскі, і інданезійскі, і нават з вострава Суматра парсюк вадзіўся. Мэр на іх хіба што толькі не маліўся. На гэтым лепшы прайдзісвет і сыграў.

...На досвітку знакамітага мясцовага паляўнічага Фільку разбудзіў тэлефонны званок.

— Мэр турбуе, — выбуркнуўся хрыплаватым горлам Кузя. — Прыходзь на паляванне.

— Гэта ты, мэр? — у голасе сябрука сонны Філька адчуў нейкія незнаёмыя ноткі. — Чаму не сваім голасам хрыпіш?

— Ды мой гэта голас, мой, — пераканаўча запэўніў гумарыст-прайдзісвет. — Пасля ўчарашняга яшчэ не акрэпнуў.

— Пра якое паляванне ты вярзеш? Не сезон жа...

— Надакучыла мне маё свінства, Філя. Прыйдзі, зрабі свежаніну.

— Сёння?

— Неадкладна. Толькі будзь сябрам — у дом спярша не заходзь, каб жонку не хваляваць, а танцуй адразу ў свінушнік. Справу зробіш і — куляй да мяне. Я тут до-обры магарыч кумекаю.

— Сумна ў лесе без ружжа, — паклаў трубку Філька і пачаў збірацца на "паляванне".

...Мэра растурхала жонка.

— Нейкія гукі ў двары. Быццам бы хлапушкі, — прашаптала кабета.

Мэр выйшаў на кухню, уключыў святло. І тут у шыбу пастукалі.

— Каму свярбіць туманны золак? — адхінуў занавеску мэр.

— Паляванне закончана, — лагодная ўсмешка ззяла на няголеным Фількіным твары.

Мэр любіў Фільку. За яго бескарыслівы сяброўскі характар. А яшчэ — за паляўнічую ўдачу. Філька заўсёды быў са здабычай, якой шчодра дзяліўся з сябрамі. І ў выпіўцы таксама ведаў меру, літр гарэлкі і — ні грама лішняга.

— Тады заходзь, — пайшоў адчыняць дзверы мэр.

Філька моўчкі расклаў і зачахліў сваю дубальтоўку, прысеў за стол.

— Як паляванне? — пацікавіўся гаспадар.

— Не піскнулі, — быў лаканічным госць.

— Адно слова — суперпрафесіянал! — выстаўляючы на стол пляшку з гарэлкай, пахваліў сябра мэр. — І колькі ж хвастоў накруціў?

— Тры. Як па-пісанаму.

— Падзяліцца хочаш здабычай?

— Божа баронь — чужога не трэба...

— Мне б і аднаго хапіла. Большага. Па адзінай?

— Не пашкодзіць. Шчодры ты чалавек, мэр.

— Ты на што намякаеш, Філя? Яшчэ па адзінай?

— Лішняга не вып'ем. Але ж свінні — твае...

— Гэта ліха на маю галаву, — зазірнула на кухню мэрава жонка. — Як пазбавіцца ад ягонага хобі, і сама не ведаю.

— Хана хобі.

— Што ты, Філімон, сказаў? Ты бачыў маіх пестуноў? — насцярожыўся гаспадар.

— Я ж не на гук страляў.

— Куды страляў?

— Як звычайна. У лоб.

Не дапіўшы келіх, мэр кінуўся да дзвярэй. Але ў гэты момант зазваніў тэлефон, і ён узяў трубку на гучнай сувязі.

— Слухаю.

— Здароў, мэр. Вітанне ад Кузьмы атрымаў?

— Сабака ты, Кузя, — дайшоў, нарэшце, да мэра свінскі жарт лепшага гумарыста свету. — Але ж прыходзь на каньяк пад свежаніну. З Васілём, вядома.

Вось, уласна кажучы, і ўся гісторыя, праўдзівасць якой уласнаручна і пацвярджаю. Асабліва прыемна было парадавацца за маіх сяброў, калі з уласных запасаў жонка мэра дадаткова выставіла на стол добрай вытрымкі трэці каньяк са словамі:

— Дзякуй, што пазбавілі мяне ад свінскага хобі мужа.

Для лепшага гумарыста свету, або проста прайдзісвета, падзяка з вуснаў жанчыны, безумоўна, — заслужаны ганарар. Атрымаўшы стымул, ён прыдумаў новы розыгрыш і зноў заклаўся на прыз. Пры любым зыходзе спрэчкі я застаюся ў выйгрышы...

Дух камуны

У знак удзячнасці тым, хто павіншаваў мяне з юбілеем, выказаў шчырыя, праніклівыя словы і пажаданні, я хацела б падзяліцца ўласнымі ўспамінамі — прыгадаць людзей, з якімі даводзілася сустракацца на жыццёвай дарозе: і тых, каго, на жаль, ужо няма сярод нас, і тых, хто плённа працуе на карысць нашай любай Беларусі. Не я цікавая, а час цікавы, у якім жыла, таму і рашаюся пісаць пра сябе.

Бацькі

Найперш удзячная я маім бацькам — Івану Пятровічу і Марыі Філатаўне. Што можна сказаць пра іх у некалькіх словах? Шамякін быў шчыры патрыёт, у лепшым сэнсе слова ідэйны чалавек, не з тых пярэваратняў, якія на трыбунах гаварылі адно, а думалі зусім іншае, не з тых, хто кан'юнктурна мяняў свае погляды пасля разбурэння СССР. Акрамя таго, ён быў незласлівы, мяккі па характары, нават мяккацелы, і я пераняла ад яго апошнюю рысу. Пішучы пра любімую жонку, Шамякін заўсёды адзначаў яе працалюбства, здаровы сэнс, дабрыню. Я лічу, што гэта якраз той выпадак, калі дабрыня для некаторых людзей, на якіх яна была накіравана з боку маёй маці, пайшла не на карысць. Больш я ў ёй цаню сапраўды народны погляд на рэчы, цнатлівасць, некаторы нават аскетызм — сярод яе продкаў былі стараверы. У маці не было прагі да раскошы, да камфорту, да набыцця рэчаў, да нейкіх знакаў прэстыжу, абыякавай яна была і да сваёй знешнасці, уласных індывідуальных інтарэсаў. Тыповая беларуская жонка і маці. Сведчаннем таго, што не было ў бацькоў прагі да матэрыяльнага, з'яўляецца наша больш чым сціплае лецішча ў Ждановічах. Або кватэра: няхай успомняць яе тыя, хто ў ёй быў пры жыцці бацькоў, а былі многія. Асноўная каштоўнасць — кнігі.

Ад маленства, 50-х гадоў, засталося ў мяне адчуванне суцэльнага свята. Пастаянна ў нас былі госці — усе маладыя, вясёлыя, дасціпныя. І дынамічныя, актыўныя. Мала хто тады мог набыць машыны, а ў некаторых пісьменнікаў яны ўжо былі. Памятаю, як Шамякіны, Макаёнкі і Васілеўскія ездзілі на прыроду: у грыбы або папякчы бульбу ці пасмажыць сала на вогнішчы, а яшчэ любілі глядзець ледаход — на Бярэзіне, Нёмане. Па пабудаванай ужо Маскоўскай шашы Макаёнак і Шамякін, пасадзіўшы ў машыны жонак і дзяцей, наладжвалі на максімальнай хуткасці гонкі, азартна абганяючы адзін аднаго. Цяжка ўявіць такое ліхацтва, успомніўшы тужлівага Шамякіна ў апошнія гады яго жыцця. Але было...

Сябры-беларусы

Сярод шчырых сяброў Шамякіна ў тыя гады ўспамінаю надзвычай сімпатычнага чалавека — Уладзіміра Дадзіёмава, яго жонку і маленькую дачушку — вельмі мілую, гарэзлівую, малодшую за мяне, відаць, гады на тры. Яна мяне, безумоўна, не памятае. А вось я ў апошнія гады з цікаўнасцю сачу за дзейнасцю Вольгі Дадзіёмавай — гісторыка музыкі, мастацтвазнаўцы. Менавіта яна і яе вучні адкрылі скарбы беларускай музыкі, пачынаючы з XVI стагоддзя: прывезлі з архіваў Вільнюса, Кракава, Варшавы, Пецярбурга копіі партытур беларускіх кампазітараў, пра якіх раней ніхто і не чуў, — фактычна адкрылі цэлы велізарны пераяд і плеяду музычных талентаў у гісторыі беларускай культуры. У сувязі з гэтым часта думаю: вось чалавек, які робіць каласальную працу на карысць незалежнай Беларусі, на яе будучае. А хто яе ведае? Ведаюць папсовых спявачак. Хіба можна параўнаць іх, няхай і складаную, працу матылёў-аднадзёнак з каласальнымі намаганнямі такіх даследчыкаў, як Вольга Дадзіёмава?

Блізкія сябры бацькі патрабуюць асаблівай размовы — не такой кароткай. Пакуль скажу ў некалькіх словах пра самага блізкага — Андрэя Макаёнка. Яго называлі маім хросным бацькам. Сапраўды, з усіх дзяцей Шамякіна ён найбольш любіў мяне: у дзяцінстве часта гуляў, пазней многа гутарыў, шмат чаго распавядаў. Я б яго назвала духоўным бацькам. У Шамякіна была адна ідэя-фікс, даволі наіўная, якая і ў Макаёнка, і ў маёй маці, і ў мяне выклікала патаемны смех: бацька аберагаў дзяцей ад негатыўных ідэйных уплываў, пазбягаў пры іх размоў пра недахопы сацыялізму, памылкі ўлады і сам нічога дрэннага дома не згадваў; калі ж звярталі яго ўвагу на мінусы рэчаіснасці — рабіў выгляд, што не верыць. А Андрэй Ягоравіч быў, як сёння гаворыць моладзь, "прыкаліст": чым больш Шамякін баяўся негатыву, тым больш Макаёнак — ад супраціўнага — імкнуўся выставіць навідавоку ўсё заганнае ў жыцці, і ў нашым доме не баяўся гаварыць надзвычай крамольныя рэчы. Мае сёстры і брат не цікавіліся палітыкай, а вось я заўсёды навастрала вушы, калі Шамякін і Макаёнак пачыналі размовы пра Сталіна, Хрушчова, Брэжнева. Макаёнак мне гаварыў: "Ты цяпер як "каструля", у якую закладаюць, каб прыгатаваць смачны "боршч", розныя рэчывы — веды, але неабходны агеньчык, каб "боршч" пачаў варыцца". Ён сам і быў такім "агеньчыкам".

М. Яфімава, В. Казлова, А. Шыловіч, І. Ключановіч, Л. Ламека, Л. Сінькова, Т. Шамякіна, Л. Тарасюк, Т. Бельская, В. Лашкевіч, Л. Карпава, 1987 год.

Сябры бацькі з іншых рэспублік

Яшчэ пра маленства. У 50-я — 60-я гады пісьменнікі розных рэспублік Савецкага Саюза сустракаліся надзвычай часта. Я ўжо неаднойчы пісала, што ў дом майго дзеда ў вёсцы Церусе Гомельскага раёна, дзе мы адпачывалі летам, прыязджалі шмат якія пісьменнікі з Расіі і Украіны. Бацька сябраваў з многімі ўкраінскімі літаратарамі, тады вядомымі і папулярнымі, але я палюбіла Сцяпана (не Барыса, а Сцяпана!) Алейніка — сатырыка і гумарыста. Абсалютна тыповы Тарас Бульба. Гэта паводле яго сцэнарыя Леанід Гайдай зняў сваю першую камедыю "Сабака Барбос і незвычайны крос". Мы гасцявалі ў Алейнікаў у Кіеве, і яны прыязджалі да нас. Якія ж абаяльныя людзі! З таго часу вельмі люблю ўкраінцаў і Украіну, як бы там сёння ўлады не вар'яцелі. Тым больш, што сярод маіх продкаў па маці былі ўкраінцы.

З Расіі да нас часта прыязджаў перакладчык раманаў Шамякіна (пакуль я сама не пачала іх перакладаць) — Арсеній Астроўскі, стары пецярбургскі інтэлігент. І масквічы вельмі любілі наведваць Мінск, бо беларусы надзвычай гасцінныя. Тут часта праходзілі розныя "круглыя сталы", пленумы праўлення Саюза пісьменнікаў СССР. Пасля ўсіх сумных пасяджэнняў да нас звычайна прыходзілі вячэраць. Аднойчы нават сярод іншых — Канстанцін Сіманаў. Уражанне незабыўнае. Але мне ўсё ж найбольш спадабаўся Аляксандр Чакоўскі — тагачасны галоўны рэдактар "Литературной газеты". У 70-я гады "Літаратурка" — любімае выданне савецкай інтэлігенцыі. Сапраўды, яна ўздымала вельмі вострыя пытанні, і ёй дазвалялі тое, што не дазвалялі іншым — "выпускала пару".

Маю маці вельмі паважалі ўсе сябры бацькі. У тым ліку, масквіч Віталій Вольскі, франтавы сябра бацькі, Герой Савецкага Саюза, дырэктар Інстытута Лацінскай Амерыкі. Шамякін згадваў пра яго ў "Дзённіках" і ўсё марыў напісаць больш падрабязна. Любімыя героі раманаў Шамякіна мелі прататыпамі — у змяшанні — Макаёнка і Вольскага. Бацька з усіх дзяцей найчасцей вазіў у Маскву менавіта мяне. Мы спыняліся ў Вольскіх — беларуска-польскай сям'і, што прыжылася на рускай глебе. Ва ўсім яны былі адрозныя ад нас, але ж мы шчыра сябравалі!

Падарожжы і дом-камуна

Памятаю, ужо не бацька, а я, будучы маладым дацэнтам, павезла ў Маскву маю стрыечную любімую сястру Наташу — цяпер вядомага архітэктара, кіраўніка вялікай майстэрні ў "Мінскпраекце". Была экскурсія ад Саюза пісьменнікаў Беларусі — з заездам у Меліхава, Ясную Паляну. Мы з Наташай адчувалі сябе ніякавата сярод пісьменнікаў і іх жанок — далёка не такіх сціплых, як мая маці. Адчуўшы гэта, надзвычай далікатна апекаваў нас Леанід Левановіч. З таго часу ў мяне да яго самая глыбокая сімпатыя і пачуццё ўдзячнасці.

Шчасце, што ўдалося паездзіць па Савецкім Саюзе. Некалькі разоў была на курортах — у прыватнасці, у Кактэбелі. Запомніліся шмат якія пісьменнікі, але асабліва я ўдзячная лёсу, што сустрэлася з Васілём Бяловым — класікам рускай літаратуры XX стагоддзя. Ён трымаўся ў Доме творчасці пісьменнікаў выключна сціпла і адчуваў сябе яўна ніякавата сярод шумных, нахабных, раскаваных масквічоў, кожны з якіх падаваў сябе не менш як нобелеўскім лаўрэатам. Яны ім пагарджалі, рабілі выгляд, што не заўважаюць валагодца, і я перажывала, бачачы, які ён адзінокі, які чужы сярод фанабэрлівай публікі.

У апошні час усё часцей і з усё большым смуткам успамінаю суседзяў у нашым "пісьменніцкім доме" па вуліцы Карла Маркса, 36, жыццё ў якім сёння ўспрымаецца як правобраз той чалавечай камуны, пра якую марылі лепшыя людзі свету — утапісты. А вось жа не утопіяй былі сяброўскія адносіны сярод пісьменнікаў у 50—60-я гады. З мілых суседзяў з асаблівай прыязнасцю ўспамінаю сем'і Янкі Брыля, Яна Скрыгана, Івана Мележа, Пятра Глебкі — гэта толькі ў нашым пад'ездзе.

Аднакурснікі, настаўнікі, вучні

Старастам нашага курса дэканат прызначыў Анатоля Бутэвіча — у будучым лепшага на маёй памяці міністра культуры, а сёння і вядомага пісьменніка. Сярод студэнтаў аказаліся і іншыя маладыя творцы: Лена Руцкая, Яўген Хвалей, Віктар Ярац, Генадзь Пашкоў (у далейшым перавёўся на журфак), але асабліва вылучаліся Алесь Разанаў і Жэня Янішчыц. Апошнія якраз вучыліся са мной у адной групе, як і Лена Руцкая. Нашы прафесары-карыфеі — найперш Ніл Сымонавіч Гілевіч і Алег Антонавіч Лойка — заўважылі пачынаючых паэтаў, яшчэ калі тыя вучыліся ў школе, яўна апекавалі іх і на факультэце: неаднаразова згадвалі ў лекцыях, пастаянна бралі іх вершы для друку.

Шчыра кажучы, з першых дзён студэнцтва нашы аднакурснікі спачатку зацікавіліся дзецьмі пісьменнікаў, што паступілі на філфак. А было нас шасцёра — акрамя мяне, яшчэ пяць чалавек: Люда Карпава, Ларыса Калачынская, Таня Панчанка, Таня Пшыркова, Алесь Чарнушэвіч. Усе, дарэчы, сціплыя людзі і ўсе лёгка, проста, натуральна ўліліся ў самы сялянскі з усіх курсаў універсітэта.

Пасля заканчэння універсітэта і аспірантуры я вось ужо трыццаць чатыры гады працую ў БДУ. Дзіўныя бываюць супадзенні ў жыцці. Мой любімы настаўнік, кіраўнік дыплома і кандыдацкай дысертацыі — Іван Навуменка. Ён вучыў мяне, потым я вучыла яго сына Паўла, потым Павел — маю дачку Славяну. Некалі лепш за ўсіх крытыкаў пісаў пра Івана Шамякіна акадэмік Віктар Каваленка, потым я вучыла яго дачку Таццяну, цяпер мы з ёй — калегі, як і з Паўлам. Сябраваў з Шамякіным Мікола Мятліцкі, хоць і намнога маладзейшы за бацьку, потым яго дачка Ганна стала маёй вучаніцай — яна ўжо кандыдат навук.

На першы погляд здаецца, што залішне перасякаюцца лёсы пісьменніцкіх дзяцей, — уяўляю абывацельскую ўсмешку. А на самай справе, гэта натуральны працяг сямейных традыцый, жыццёва неабходны ў любой сферы дзейнасці, — толькі так і можна дасягнуць прафесійных поспехаў. Проста Беларусь — маленькая, і мы ўсе ў сваёй карпарацыі, пісьменніцкай і навуковай, блізкія. Наадварот, нам варта было б павышаць, так бы мовіць, узровень карпаратыўнасці. Працэнтаў дзесяць маіх вучняў паблізу мяне, разам з дочкамі, — гэта малавата.

Некаторыя вучні асабліва запалі ў сэрца. Алесь Пісьмянкоў... Да гэтага часу ад заўчаснай яго смерці страшна баліць сэрца. Які ж абаяльны быў чалавек, чысты, як слязінка! У яго студэнцкія гады аднойчы я яго выручыла. А потым з радасцю сачыла за яго творчымі поспехамі. І ён любіў мяне — выяўляў гэта заўсёды шчыра, прама, нават у 90-я гады, калі Шамякін і яго дачка сярод некаторых пісьменнікаў былі ў пэўным сэнсе персонамі нон грата за сваю савецкасць.

Мае намеснікі па кафедры — мае вучні, ужо выдатныя навукоўцы, грамадскія дзеячы, дактары навук, пісьменнікі — Алесь Бельскі і Ірына Казакова. Кандыдаты навук, якія вучыліся ў маім семінары, — Ігар Запрудскі, Ірына Шаўлякова, Мікола Трус, Алесь Цітавец ды шмат і іншых, хто працуе сёння ў розных ВНУ рэспублікі і за мяжой, нават у Нарвегіі. А колькі ж паэтаў, празаікаў, драматургаў вучыла! Уладзімір Марук, Алесь Бадак, Уладзімір Мазго, Канстанцін Жук, Канстанцін Цыбульскі, Ала Канапелька, Хрысціна Лялько, Алесь Пашкевіч, Янка Лайкоў, Аксана Спрынчан, Валеры Максімовіч, Міраслаў Шайбак, Сяргей Кавалёў, Мікола Хаўстовіч... Я ўдзячная сваім настаўнікам, але не менш удзячная і вучням. Вучнёўства — гэта фармальна: фактычна ж я сама пастаянна, штодзённа вучуся ў іх, асабліва ў людзей творчых.

З пісьменніцкага жыцця

Пачынала як крытык. Першая мая кніга — літаратурна-крытычныя артыкулы "На лініі перасячэння", што выйшла ў 1982 годзе. Але тады ж захапілася навукай і сёння крытыкай займацца прынцыпова не жадаю. Ды і навошта? Вырасла новае пакаленне пісьменнікаў і крытыкаў. У апошні час напісала некалькі цыклаў публіцыстычных мініяцюр "Парадоксы нашага жыцця", якія выклікалі вялікую цікавасць у чытачоў.

Былі моманты ў маёй біяграфіі менавіта парадаксальныя, бо такі наш час, драматычна-гумарыстычныя, якія ўспамінаю сёння з усмешкай. Напрыклад, у 1986 годзе я сярод іншых пісьменнікаў падпісала ліст у ЦК КПСС аб неабходнасці пашырыць ужыванне беларускай мовы. Выклікалі нас, падпісантаў, потым у "Вялікі Дом" і гаварылі з намі ажно пасланцы з ЦК КПСС — прыехалі спецыяльна з Масквы. Некаторыя з нашых калег перад адказнай сустрэчай гэтак жа трымцелі: як глыбока ўкараніўся страх перад уладамі! А мы з Раісай Баравіковай смяяліся: у нас былі малыя дзеці, і мы не баяліся спагнанняў. У той жа час мы спадзяваліся пачуць нешта надзвычай разумнае ад высокіх чыноўнікаў. Абсалютна нічога не пачулі! Але тады мяне ўразіў Георгій Марчук: вельмі смела і разумна гаварыў, між іншым, пра некаторыя праблемы, што і сёння не вырашаны ў культурнай сферы. А колькі часу прайшло... Каго вінаваціць — чыноўнікаў ці нас, літаратараў, у якіх знік, некуды адляцеў дух камуны, а без яго — ці спадзявацца на адраджэнне беларускасці?

Таццяна ШАМЯКІНА

У мінулым годзе ўпершыню на Любаншчыне прайшло свята народнага гумару "У Баянічы на гулянічы". Чаму менавіта вёска Баянічы стала месцам яго правядзення, у раёне вам адкажа і стары, і малы.

Баяніцкія штукары

Людзі на балоце

Калісьці Баянічы акружалі балоты. У суседнія хутары і вёскі можна было дабрацца толькі прызімкам. А летам, па неадкладнай патрэбе, каб солі набыць ці свякоў адведаць, прабіраліся баянкі па амшэлых купінах. Нярэдка і па пояс у дрыгву правальваліся. Так і жылі на невялікім астраўку сушы, большасць часу адрэзаныя ад астатняга свету. Кожны смешны выпадак абавязкова станавіўся агульным набыткам, абрастаў чуткамі і домысламі. І цяпер кожны баянак вам раскажа: адкуль пайшла назва вёскі.

Шукаў чалавек месца для будаўніцтва хутара, а насустрач яму — жанчына. Брыдзе па балоце, загалілася да пупа, а раней жа ніжняй бялізны не насілі... Спалохаліся адно аднаго ды разбегліся ў розныя бакі. Дзе спыніўся мужчына — там і ўзніклі Баянічы (ад слова "збаяўся"), а дзе сцішыла ход маладзіца — паўстала Загалле.

Марыя Лашч жыве ў Баянічах з 1964 года. Працавала настаўніцай, затым — загадчыцай бібліятэкі. Калі прыехала на працу ў Баянічы, здалося, у другі край трапіла: па гразкіх вуліцах свінні бегаюць, іншая гамонка — часам цяжка зразумець. Аднойчы дачку наведаў бацька. І вельмі ўразіўся тутэйшай гамонцы. Маўляў, каб не пачуў сам, то і не паверыў бы, што так размаўляць можна.

— Ніколі не забуду, як на іспыце ў інстытуце выкладчык запытаў: вы сапраўды з тых Баянічаў, дзе вала на дуб цягнулі? — зачырванелася Марыя Іванаўна. — Адкуль вы ведаеце? Дык гэта ж выдумка! — узгадвае жанчына. — А ён пасміхаецца: мы тут, у Мінску, наслухаліся і пра пеўня вашага баяніцкага, і пра тое, як вы соль сеялі.

Як баянкі вала цягнулі

Вырашылі аднойчы баяніцкія людзі адправіць свайго пасланца ў Маскву. Узялі яны кош, узнеслі яго на дах хаты, прывязалі па вуглах чатырох пеўняў... Што з гэтага атрымалася, думаю, тлумачыць не трэба.

— Навошта ж жывёліну на дуб цягнулі? — пытаюся ў месцічаў.

— Проста, трэба было аднаму баяніцкаму дзядзьку ярмо для вала зрабіць. Вось і нагледзеў ён на адным дубе добрую кульбяку. Клікнуў на падмогу вяскоўцаў, і яны пацягнулі жывёліну на дрэва, тую кульбяку прымяраць. "Ну як, ці падыходзіць?" — пытаюць у таго, хто наверсе. — "Так, падыходзіць, і вол задаволены, смяецца..."

— А з якой нагоды тую соль сеялі? — не магу ўзяць да галавы.

— А ўсё вельмі проста, — тлумачаць. — У сяле закончылася соль. Дык вось баянкі і вырашылі яе пасеяць. Пасеялі, але соль не ўзышла. Ну, яны і падумалі, што соль — гэта шматгадовая расліна. Праўда, было тое ці не — ніхто не ведае, але гэтыя жарты, ці штукі (у Баянічах кажуць не шуткаваць, а штукаваць) так і засталіся ў народзе.

Баянкі і сёння з сябе штукуюць. Маўляў, пасеялі калісьці соль у Баянічах, а ўзышла пад Салігорскам (як вядома, Любанскі раён мяжуе з Салігорскім). А яшчэ, як мне падалося, баянкі крыху помслівыя і надта прывязаныя да свайго жытла і малой радзімы.

Жылі ў вёсцы дзве суседкі, не мірыліся між сабой. І вось адна падпаліла другой хату. Ледзьве выскачыла тая з полымя на вуліцу. Зламысніцу пасадзілі ў турму. А кабета, што пагарэла, доўгі час адмаўлялася сыходзіць са свайго жытла. Так і жыла сярод вуголля.

— То пра тую Хентаву сучку, відаць, таксама праўду баюць, — уступае ў размову Ганна Перагуд. — Гуляў малы Хента з сучкай і падпаліў ёй хвост. Сучка пабегла ратавацца ў гумно. Гумно загарэлася. На вуліцы стаяла спякота, і пакуль людзі прыбеглі з поля, то згарэла паўвёскі.

Справа — табак

Ганна Мікалаеўна працуе загадчыцай мясцовага клуба. Будынінa сельскай установы культуры дыхтоўная, з прасторнай сцэнай. Але вельмі ж холадна тут — няма ацяплення. Загадчыца моцна кашляе — застудзілася на працы. Але жанчына не губляе надзеі, што ўсё-такі ацяпленне калісьці наладзяць. Гады тры таму ў СПК "Баяніцкі" з'явіўся новы гаспадар — ТАА "Табак-Інвест".

— Баянічы падымаюцца, зарплаты ў людзей добрыя. І піць няма калі, работы трэба трымацца, — парадавалася за землякоў Ганна Перагуд.

З гэтай нагоды жанчына каламбурыць, маўляў, дай Бог здароўя "Табак-Інвесту". Пакуль гэты табак будзе, то і Баянічы будуць. А як гэтаму табаку прыйдзе табак, то, мажліва, і Баянічаў не застанецца.

У свой час Ганна Перагуд абышла ўсіх старажылаў, сабрала байкі, легенды ды "штукі":

— Дзед Давыдоўскі мне расказваў. У яго хаце было надта цёмна. Папрасіў, каб вокны пабольшылі. Дык майстры так выразалі, што ўсю сцяну агалілі. А яшчэ стары баяў пра тое, як гарэлку гналі. Працэс, так бы мовіць, быў у самым разгары, а тут раптам нешта як загрукае (мабыць, нехта ў дзверы бразгатаў). А гаспадар і заспакойвае гасцей: не бойцеся, гэта брага грукаціць.

А гэтыя "штукі" ўжо больш познія. У вёску прыслалі першы трактар. Пачуўшы гул, самыя спрытныя баянкі залезлі на гумно і ўбачылі, што па дарозе рухаецца "чорт". Пахапалі яны вілы, сякеры і рушылі насустрач нячысціку лупатаму. Хацелі выкалаць яму вочы, каб не бачыў, куды рухацца.

Словам, цікавыя ў Баянічах людзі, што ні слова — то каламбур, жарт, прыдумка.

Жывая легенда

Старэйшая жыхарка Баянічаў — Кацярына Беразоўская. Кацярына Аўдзееўна — жывая легенда, мае баявыя і працоўныя ўзнагароды.

— Была я смелай дзяўчынай, камсамолкай, — пачынае яна свой аповед. — Калі прыйшлі немцы, то хлопцы і дзяўчаты спужаліся і спалілі камсамольскія білеты. А я свой прыхавала. Ды паліцаі знайшлі, і вымушана была я пайсці ў партызанскі атрад. Да гэтага была ў ім сувязной.

Аўдзееўну і сёння ў вёсцы паважаюць і пабойваюцца — праўду ў вочы любому выкажа. Даяркам шмат крыві папсавала. Бывала, нясуць яны скрадзенае з фермы малако, а Кацярына Аўдзееўна з адкрытага акна і праспявае ім куплет. Даходзіла да таго, што і дулі ў адказ паказвалі.

Кацярына Аўдзееўна — чалавек не помслівы, але адну абразу не можа забыць. Паабяцаў старшыня калгаса выдзеліць ёй соткі, а аддаў іншаму чалавеку...

— Мабыць, вы ўжо чулі і пра вала, і пра пеўня, — кажа К.Беразоўская. — Не ведаю, ці праўда тое было. Раскажу тое, чаму сама была сведкай. Загадаў аднойчы калгасны брыгадзір баяніцкаму чалавеку адвезці кінамеханіка ў суседнюю вёску. Едуць яны па дарозе, а той усё просіць, каб яму паказалі дуб, на які вала цяглі. "Пачакай крыху", — супакойвае дзядька.

Прывозіць ён хлопца пад самы тоўсты ды моцны дуб, зганяе з воза і скідвае ўсю апаратуру. Нічога не заставалася занадта цікаўнаму дзецюку, як пехатой дабірацца ў іншую вёску па каня. Тым часам вазніца вярнуўся назад. Брыгадзір і цікавіцца: "Нешта хутка ты справіўся, ці адвёз жа кінамеханіка куды трэба?".

"Так, адвёз, куды ён загадаў, цяпер таму валу, якога на дуб цяглі, кіно паказвае".

— Нашы баянкі не вельмі любяць, калі над імі штукуюць, — працягвае бабуля Кацярына. — Едуць з суседняй вёскі людзі за саломай, а мы калгасную бульбу з жанчынамі на полі перабіраем. Адзін і запытаўся: а дзе, жанчынкі, тая паляна, што соль сеялі? А Настуля Шумчэня ўскочыла на пень, падняла падол, сагнулася, ды і кажа: глядзіце, вось тая палянка.

Амаль у кожнай вёсцы на Любаншчыне знойдзецца нешта сваё, асаблівае. Але неяк так атрымалася, што жарты замацаваліся за Баянічамі. Ідзе дзядзька з магазіна, нясе торбу солі за плячыма. Яго і пытаюць: дзе ўзяў? А ён і адказвае: "У Баянічах". "Дык што, ужо нажалі?"

Палёгка для ўнукаў

Любанскія хлопцы, пабываўшы ў Германіі, пазнаёміліся з тамтэйшай сям'ёй, якая напрасілася ў госці — захацелася экзотыкі. Дык адзін з любанцаў запрасіў іх да сваёй старэнькай цёткі ў Баянічы. Маленькая, яшчэ даваенная хатка, драўляны ложак, лава, нефарбаваная падлога — як у этнаграфічны музей трапілі. Але найбольш здзівіў помнік з фотаздымкам і высечанай датай нараджэння, прыкрыты ў сенцах нейкім лахманом. Не маглі ўцяміць немцы, што гэта такое. Давялося тлумачыць, што бабулька заказала яго для сябе, каб потым унукам палёгка была. На другі год любанцы зноў гасцявалі ў Нямеччыне. І дужа здзівіліся, калі бацькі іх сяброў паказалі помнік, падрыхтаваны да сваёй смерці. Словам, на экзотыку захварэлі.

Віктар КАВАЛЁЎ

Фота аўтара

Раман Шаціла ў светлым горадзе

Малады горад Светлагорск зусім нядаўна адзначаў 45-годдзе свайго нараджэння. І вось у восеньскі дзень бабінага лета, а менавіта чацвёртага кастрычніка, светлы горад святкаваў сваю чарговую гадавіну.

Светлагорск вырас са сваімі высокімі гмахамі на старажытным паселішчы. Пра гэта сведчаць нядаўнія раскопкі археолагаў і рэшткі старажытных рэчаў, знойдзеныя імі. Сведчыць пра мінуўшчыну і асоба Рамана Шаціла — першага пасяленца гэтых мясцін. Яго прывабіла маляўнічая мясцовасць, багацце спрадвечных бароў і дуброў. Шмат тут было птушак розных, звяроў і рыбы. Упадабаныя мясціны сталі яго роднымі. Прыйшлі свабодалюбівыя, з вольным норавам людзі, пачалі займацца земляробствам. Вырасла паселішча. Атрымаўшы прывілеі ад вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта другога Аўгуста, Раман Шаціла стаў уладаром гэтых мясцін, з ласкавай назвай Шацілкі.

Пашчасціла і мне як рэжысёру-пастаноўшчыку і выканаўцу ролі Рамана Шаціла далучыцца да святкавання 45-годдзя Светлагорска. І сёлета мяне зноўку паклікаў Светлагорск, каб увасобіць старажытны вобраз Рамана Шаціла. Паклікаў светлы горад на сваё святкаванне і многіх шаноўных далёкіх і блізкіх гасцей, артыстаў з Мінска, Гомеля. Безумоўна, далучыліся да свята горада і творчыя калектывы Светлагорска і Светлагоршчыны.

І той помнік Раману Шаціла, які стаіць на плошчы, створаны скульптарам Эдуардам Астаф'евым, і нібы пабольшала святла ў светлым маладым горадзе.

Мікола МАКАРЦОЎ

Калектыў супрацоўнікаў РВУ "Літаратура і Мастацтва", сябры Саюза пісьменнікаў Беларусі, знаёмыя, таварышы і калегі глыбока смуткуюць з прычыны смерці вядомага пісьменніка і вучонага-літаратуразнаўцы, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Алега ЛОЙКІ і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Калектыў РУП "Выдавецтва энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", выказвае шчырае спачуванне загадчыцы рэдакцыі мастацка-тэхнічнай падрыхтоўкі выданняў Іне Міхайлаўне Кузьмянковай з прычыны смерці МАЦІ.

Калектыў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва выказвае шчырыя спачуванні сям'і вядучага навуковага супрацоўніка архіва-музея Яніне Міхайлаўне Кісялёвай у сувязі са смерцю яе МУЖА — Генадзя Васільевіча Кісялёва.

Калектыў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва выказвае шчырыя спачуванні вядучаму навуковаму супрацоўніку архіва-музея Наталлі Георгіеўне Сакалоўскай з прычыны заўчаснай смерці СЫНА — Дзмітрыя Ігаравіча Сакалоўскага.

З нагоды свята

Не так даўно адгаманіла ў старажытным Барысаве свята беларускага пісьменства. Нечакана з гэтай нагоды *ўспыхнула* любоўю да роднай мовы ААТ "Барысаўдрэў". На фабрыцы выпусцілі партыю запалак з каляровай этыкеткай, прысвечанай вышэйзгаданай падзеі. Прыемна і, спадзяёмся, гэта станецца не адзінкавай праявай беларушчыны, а паўсядзённай справай вядомага беларускага прадпрыемства.

Л. Г.

Установа адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі»

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад (да 5-ці гадоў) прафесарска-выкладчыцкага складу (для тых, хто мае мінскую прапіску) з далейшым заключэннем кантракту ў выпадку выбрання на тэрмін, вызначаны Наймальнікам:

— кафедра баяна і акардэона :

прафесар — 1 ст.;

— кафедра спеваў:

дацэнт — 0,5 ст.;

У межах сумеснага праекта нашага выдання з Беларускім радыё мы працягваем публікаваць найлепшыя фрагменты з музычнай інфармацыйна-пазнавальнай перадачы «Культурная прастора». Госцем чарговай перадачы Яны Хадоскі стаў рэжысёр тэатра і кіно Дзмітрый АСТРАХАН.

Яго «можа вытрымаць Брадвей»

— Дзмітрый Ханонавіч, вы адзін з расійскіх рэжысёраў, якія большасць сваіх фільмаў здымаюць у Беларусі. Гэта невыпадкова, бо вы шмат разоў прызнаваліся ў любові да нашай краіны, тут вас заўсёды чакаюць, гасцінна сустракаюць, ды, напэўна, і кінастудыя «Беларусьфільм» адпавядае таму, каб здымаць якасныя фільмы?

— Ведаеце, мне нават няма чаго дадаць. І ставяцца добра, і студыя добрая, і шмат таленавітых людзей, з якімі цікава працаваць — таму і здымаю тут. Кінастудыя становіцца ўсё больш абсталяванай, прафесійнай, якая думае пра сучаснае кіно і пра тое, каб кіно было цікавым для гледача. Мне здаецца, што ўвесь працэс, які адбываецца на кінастудыі, цалкам заканамерны і правільны ў тым плане, што ён арыентаваны на стварэнне максімальна зручных умоў для творчасці, для таго, каб рэжысёр мог выказацца, а яго фільмы былі цікавымі. Кінастудыя забяспечвае галоўную задачу — магчымасць здымаць кіно, таму да вас і прыязджае так шмат людзей з Масквы і Пецярбурга.

— Не падлічвалі, колькі вашых фільмаў было знята на кінастудыі «Беларусьфільм»?

— Іх вельмі лёгка падлічыць. Так атрымалася, што з 21 карціны — 16 здымаў у супрацоўніцтве з «Беларусьфільмам» і беларускай групай. Вядома, мы здымалі яшчэ і ў іншых гарадах, але асноўная праца праходзіла заўсёды ў Мінску.

— Дзмітрый Ханонавіч, распавядзіце трохі пра вашу новую карціну. Напэўна, гэта будзе меладрама, ваш улюбёны жанр?

— Апошняя карціна называецца «На свеце жывуць добрыя і харошыя людзі» — фільм, які я вельмі доўга здымаў. Гэта гераічная камедыя з элементамі фантастыкі — такі вось дзіўны жанр. Рыхтуюся здымаць новую карціну па сцэнарыі Алега Данілава, але таксама не меладраму. У большай ступені камедыю журботную, лірычную, пра сённяшняе наша жыццё.

— Што б вы не здымалі, у любым фільме прысутнічае гумар ці смех скрозь слёзы. Вы самі, мабыць, у жыцці чалавек вясёлы?

— Я люблю, калі людзі жартуюць. Смех — гэта паразуменне. Чалавек глядзіць і цешыцца тым, што ён належным чынам зразумеў і ўспрыняў мінулае. Я лічу, што ва ўсіх значных творах смех спалучаецца з іншымі эмоцыямі. Калі яны знаходзяцца побач, глядач улюбляецца ў гэтых персанажаў і больш ім суперажывае. Смех — гэта наймагутная зброя, а самае складанае на самай справе — рассмяшыць.

— Вы пачыналі сваю кар'еру як тэатральны рэжысёр і толькі ў 1990 годзе паставілі свой першы фільм. Кажуць, што пуцёўку ў жыццё вам даў Аляксей Герман, ён наведваў вашы спектаклі і адгукаўся, як пра чалавека, якога «можа вытрымаць Брадвей».

— І сапраўды, ён паверыў у мяне і даў мне шанц рэалізавацца, прывёў мяне на «Ленфільм». Наогул, вялікае шчасце, што ў маім жыцці з'явілася кіно. Гэта цэлы свет! Хоць тэатр я люблю і вельмі люблю там рэпеціраваць, гэта крышку іншая, адмысловая асалода.

— Кастынг — хвалюючы момант для любога артыста, і ў вашых фільмах спрабуюць сябе не толькі расійскія, але і беларускія акцёры. Тым не менш у вас, напэўна, ёсць любімыя артысты, якія разумеюць усё з паўслова?

— Вядома, ёсць артысты, якіх вельмі люблю, але таксама ёсць добрыя, сярэднія і дрэнныя. З добрымі ты заўсёды дамаўляешся з паўслова, усё роўна, знаёмы табе чалавек ці не. Дрэнны кантакт з сярэднім акцёрам: пачынаюцца амбіцыі, крыўды, нейкае незадаволенае самалюбства. Хоць гэта таксама глупства, бо кожны раз шукаеш акцёра на вызначаную ролю.

— На здымачнай пляцоўцы вы дэспат або дыпламат?

— Рэжысёр, які здымае кіно, павінен быць цвёрдым і дыпламатычным кіраўніком адначасова. Я, напэўна, з'яўляюся самім сабой, таму часам магу зрывацца або быць эмацыйным, але гэта ніколі не носіць дэспатычнага характару. Ніколі не ставіўся да сваёй групы з пачуццём фанабэрыстасці альбо пагарды. Таксама не было ніколі абранай касты недатыкальных. У мяне досыць дэмакратычнае становішча на пляцоўцы ў плане творчасці. Калі я нешта раблю, то любы можа падысці падказаць і ніколі не натыкнецца на рэзкі адказ. Бо рэжысёр можа не ўсё ўбачыць, нешта прапусціць, вока замыльваецца, і любыя парады каштоўныя.

— А кур'ёзы здараліся на здымачнай пляцоўцы?

— Артысты часам не давучваюць тэкст, потым пішуць яго на паперцы і хаваюць ад рэжысёра. Аднойчы так праўдападобна здымалі бойку, што мінакі пачыналі ўлазіць у яе па-сапраўднаму. Або, напрыклад, ідуць здымкі, і раптам у кадры невядома адкуль з'яўляецца бабулька з клункамі.

— Кажуць, што першы крытык — гэта сям'я. Як рэагуюць уласныя дзеці, калі глядзяць вашы фільмы, і ці жадаюць яны пайсці шляхам бацькі?

— Захочуць быць у гэтай прафесіі — будуць дапамагаць, не захочуць — і дзякуй Богу. Але думаю, што нейкія здольнасці ўсё ж такі прагледжваюцца. Здаецца, мая творчасць ім падабаецца, пакуль абсвістана імі нічога не было. Хоць мая жонка вельмі крытычная і робіць мне заўвагі — яна актрыса, чалавек ад мастацтва. Памятаю, калі маці глядзела мае работы, для мяне гэта было вельмі важна.

— Дзякуй вам за інтэрв'ю. Жадаем поспеху, натхнення, і каб усе вашы наступныя фільмы рабіліся народнымі хітамі.

— Я паспрабую апраўдаць давер тых, каму падабаецца, што я раблю. Спадзяюся парадаваць гледача нечаканымі працамі, якія нікога не пакінуць раўнадушнымі.

З пошты «ЛіМа»

Пад заслону — Скарпіёны

Фінішаваў задыякальна-паэтычны праект "12 сузор'яў", які ладзіў Паэтычны тэатр "Арт.С" у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча. У вечарынах, якіх было дванаццаць, прынялі ўдзел больш як сто чалавек: паэты, празаікі, драматургі, публіцысты, журналісты, крытыкі, гісторыкі, барды, мастакі, акцёры, музыкі, танцоры, астролагі, музычныя калектывы.

На закрыцці праекта было як ніколі шматлюдна. Вечарына пачалася ў 18.12 і налічвала 12 параграфаў, пад якімі выступілі самыя лепшыя прадстаўнікі творчага сузор'я Скарпіёнаў. Усе прыйшлі паглядзець і паслухаць тых, хто нарадзіўся ў перыяд з 24 кастрычніка па 22 лістапада. Выступоўцы распавядалі пра сябе і сваё стаўленне да знаку.

Пачалося і скончылася кола выступаў фольк-гуртом "Пераплут". Артысты гралі на інструментах эпохі Сярэднявечча, сумесна з гуртом "Гістрыён" танчылі ў строях таго часу, ствараючы цудоўны настрой гледачам, якія з такім жа запалам далучыліся да танцаў. Паміж музычнымі часткамі выступілі пісьменнікі Анатоль Вярцінскі, Маргарыта Аляшкевіч, Аксана Данільчык, Таццяна Пратасевіч, Маргарыта Прохар, астролаг Людміла Кандратава. Мастак Уладзімір Рынкевіч прадэманстраваў свае новыя карціны. Астролаг Алена Рысавец, якая падчас праекта стварыла не адну касмаграму вядомых беларускіх пісьменнікаў, на гэты раз распавяла цікавосткі з гараскопа Якуба Коласа.

Супрацоўніца музея Ірына Мышкавец, якая прысутнічала на ўсіх вечарынах праекта, выказала надзею, што гэта не апошні праект тэатра ў сценах Максімавага дома.

Зміцер АРЦЮХ

Чараўнік з краіны маленства

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры праходзіць выстава "Чараўнік з краіны маленства", прысвечаная 125-годдзю з дня нараджэння Янкі Маўра.

На выставе прадстаўлены работы Івана Міхайлавіча, ёсць рукапісныя аўтабіяграфія і паэма "Цётка Эмілія". Шмат фотаздымкаў пісьменніка з жонкай, дзецьмі і ўнукамі, а таксама з чытачамі.

Вельмі цікавы экспанат выставы — скураны партфель, які Янка Маўр падараваў сам сабе ў 1946 г. з гэткім надпісам: "Паважанаму Я. Маўру на памяць аб яго 20-гадовай бескарыснай літаратурнай дзейнасці. І. М. Фёдараў". (Сапраўднае імя пісьменніка — Іван Міхайлавіч Фёдараў).

Таксама прадстаўлена асобная папка пад назвай "Творы шкодныя (забракаваныя)" і самі гэтыя творы: "Антота (літаратурны партрэт)", "Шчасліўцы" ды іншыя, якія не былі прыняты да друку.

Янка Маўр быў эсперанцістам. Ён перапісваўся з эсперанцістамі з розных краін свету: Аўстраліі, Данії, Аргенціны, Нідэрландаў... Яны пісалі яму пра сваё жыццё і тым самым падказвалі сюжэты для новых твораў. Такіх, напрыклад, як "За трыдзевяць зямель", ці "Амок". Акрамя гэтага, на выставе можна ўбачыць чучалы звяроў, пра якіх распавядаецца ў кнізе Янкі Маўра "Палескія Рабінзоны". Бадай, самым арыгінальным экспанатам з'яўляецца "Фантамабіль прафесара Цылякоўскага". Фантастычную аповесць з такой назвай Янка Маўр напісаў для сваіх унукаў. У ёй распавядаецца пра фантамабіль, прызначаны для палётаў у космас. Аповесць была напісана яшчэ да сапраўдных палётаў, таму выгляд гэтай машыны незвычайны. Прадставілі яе на выставе такой, як яна апісана ў кнізе — фантамабіль чырвонага колеру, увесь усыпаны зоркамі.

Гледзячы на гэты фантамабіль, хочацца сесці ў яго, каб апынуцца ў краіне маленства.

Ілона КУПРЭЙЧЫК

Зарунела ніва...

Ужо не першы раз трапляецца ў рукі альманах "Лунінецкая муза", які выдаецца ў палескім гарадку аднайменным творчым клубам. А вось цяпер з'явіўся дадатак да альманаха "Зарунела літаратурная ніва..." Літаратурныя старонкі гісторыі Лунінеччыны" Веры Зарэцкай.

Вера Якаўлеўна (Ляшук) — прафесар кафедры методыкі выкладання беларускай літаратуры і краязнаўства Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна — у невялікіх краязнаўчых артыкулах падала творчасць пісьменнікаў, чый лёс звязаны з Лунінеччынай. Адны тут нарадзіліся ды з'ехалі, іншыя — нарадзіліся і тут засталіся, а хто толькі нейкі час жыў. Сярод іх Якуб Колас, Уладзіслаў Нядзведскі, Сцяпан Нефідовіч, Іван Калянковіч, Мікола Елянеўскі, Мікола Калінковіч, Васіль Туміловіч, Мікола Ільючык, Вадзім Жылко, Андрэй Макаёнак, Яраслаў Пархута, Аксана Спрынчан. Безумоўна, гэта не ўсе пісьменнікі Лунінеччыны. Сёння магу і сам яшчэ назваць з дзесятак прозвішчаў, чые творы чытаў альбо пра каго мне расказвалі. Гэта і Таццяна Чумак, і Вольга Грыдзюшка, і Віктар Філатаў, і Рыгор Жук... Усіх ці пералічыш? Таму будзем чакаць кнігі, у якой Вера Якаўлеўна напіша пра ўсю літаратуру Лунінеччыны.

Павел РАДЫНА

ЛіМ

Выходзіць з 1932 года
У 1982 годзе газета ўзнагароджана ордэнам Дружбы народаў

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь

ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"

РВУ "Літаратура і Мастацтва"

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная калегія:
Анатоль Акушэвіч
Лілія Ананіч
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Святлана Берасцень
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Уладзімір Дуктаў
Анатоль Жук
Вольга Казлова
Анатоль Казлоў
Алесь Карлюкевіч
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Мікола Станкевіч
Юрый Цвяткоў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
220034, Мінск,
вул. Захарава, 19

Тэлефоны:
галоўны рэдактар,
намеснік — 284-66-73

Аддзелы:
публіцыстыкі — 284-66-71
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-95-62
крытыкі і бібліяграфіі — 284-44-04
прозы і паэзіі — 284-44-04
мастацтва — 284-82-04
бухгалтэрыя — 284-66-72
Тэл./факс — 284-66-73

E-mail: lim_new@mail.ru

Адрас у Інтэрнэце:
www.lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Аўтары дапісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі, асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.
Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва".

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва".

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку"
г. Мінск,
пр. Незалежнасці, 79.

Індэкс 63856
Наклад 3584
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 26.11.2008 у 11.00

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715
Заказ — 6494

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

ISSN 0024-4686